WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

31 ЛІПЕНЯ 2010 г.
СУБОТА
№ 148
(26756)

Кошт 650 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.



ДЗЯРЖАЎНЫХ УЗНАГАРОДАЎ БЕЛАРУСІ ЎДАСТОЕНЫ 52 ЧАЛАВЕКІ

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка адзначыў дзяржаўнымі ўзнагародамі 52 чалавекі за высокае прафесійнае майстэрства, узорнае выкананне службовых абавязкаў, плённую работу ў органах дзяржаўнага кіравання, заслугі ў развіцці аховы здароўя, прамысловасці, культуры і спорту. Адпаведны Указ № 394 кіраўнік дзяржавы падпісаў 29 ліпеня.

Ордэна Айчыны II ступені ўдастоены спартсмены-інструктары нацыянальнай каманды Рэспублікі Беларусь па веславанні на байдарках і каноэ Вадзім Махнёў і Раман Петрушэнка, а таксама галоўны трэнер каманды Уладзімір Шантаровіч.

Ордэнам «За службу Радзіме» III ступені ўзнагароджаны камандзір асобнага авіяцыйнага атрада пагранічнай службы, палкоўнік Валерый Гарачка і начальнік авіяцыі — начальнік аддзела галоўнага аператыўнага ўпраўлення Дзяржаўнага пагранічнага камітэта палкоўнік Пётр Жураўскі.

Кіраўнік дзяржавы ўзнагародзіў ордэнам Пашаны першага намесніка старшыні Гомельскага аблвыканкама Аляксандра Баранава, начальніка вучэбна-спартыўнай установы «Цэнтральны аэраклуб імя двойчы Героя Савецкага Саюза С.І. Грыцаўца» рэспубліканскага дзяржаўна-грамадскага аб'яднання «Добраахвотнае таварыства садзейнічання арміі, авіяцыі і флоту Рэспублікі Беларусь» Мікалая Мачанскага і намесніка старшыні грамадскага аб'яднання «Федэрацыя фізічнай культуры і спорту «БелТІЗ» Міхаіла Храмцова.

Медалём «За адзнаку ў воінскай службе» ўзнагароджаны 5 работнікаў Дзяржаўнага пагранічнага камітэта. Сярод іх памочнік старшыні Дзяржпагранкамітэта палкоўнік Юрый Ласенка і начальнік прэс-цэнтра Дзяржпагранкамітэта палкоўнік Аляксандр Цішчанка.

Дзяржаўных узнагародаў удастоены супрацоўнікі органаў унутраных спраў. Медалём «За адзнаку ў ахове грамадскага парадку» ўзнагароджаны першы намеснік начальніка ўпраўлення ўнутраных спраў Гродзенскага аблвыканкама — начальнік крымінальнай міліцыі палкоўнік міліцыі Іван Шмакаў, старшы оперупаўнаважаны па асабліва важных справах другога аддзела ўпраўлення па раскрыцці цяжкіх эканамічных злачынстваў галоўнага ўпраўлення ўнутраных спраў Мінскага гарвыканкама капітан міліцыі Андрэй Якімовіч.

Сярод узнагароджаных медалём «За адзнаку ў ахове дзяржаўнай граніцы» — старшы афіцэр аддзялення службы 15-й пагранічнай групы пагранічнай службы капітан Аляксандр Кротаў, старшы афіцэр аддзела вайсковай часці 1250 пагранічнай службы падпалкоўнік Юрый Фядзько.

Медалём «За працоўныя заслугі» адзначаны галоўны ўрач Рэспубліканскага цэнтра медыцынскай рэабілітацыі і бальнеалячэння Сяргей Карыцька, участковы ўрач-педыятр Кіраўскай цэнтральнай раённай бальніцы Таццяна Кавалеўская, старшыня Верхнядзвінскага райвыканкама Ігар Марковіч.

Сярод узнагароджаных медалём Францыска Скарыны — галоўны хормайстар Акадэмічнага ансамбля песні і танца Узброеных Сілаў Рэспублікі Беларусь Галіна Мацяс і рэдактар аддзела сацыяльнай палітыкі і навін РУП «Рэдакцыя газеты «Медицинский вестник» Лілія Ламсадзэ.

Ганаровае званне «Заслужаны ўрач Рэспублікі Беларусь» прысвоена загадчыку дзіцячага траўматолага-артапедычнага аддзялення Магілёўскай гарадской бальніцы хуткай медыцынскай дапамогі Міхаілу Міховічу.

Намеснік генеральнага дырэктара ЗАТ «Сівельга» Наталля Папова ўдастоена ганаровага звання заслужанага работніка прамысловасці Беларусі.

Памочніку генеральнага дырэктара (па геалагічных пытаннях у замежных праектах) РУП «ВА «Беларуснафта» Валерыю Бескапыльнаму прысвоена ганаровае званне «Заслужаны геолаг Рэспублікі Беларусь».

Ганаровага звання заслужанага трэнера Беларусі ўдастоены трэнер-выкладчык Гомельскай цэнтральнай спецыялізаванай дзіцяча-юнацкай школы алімпійскага рэзерву прафсаюзаў «Сож» па плаванні Сяргей Кузікаў і трэнер-выкладчык па лёгкай атлетыцы Гомельскай дзіцяча-юнацкай спартыўнай школы прафсаюзаў «Лідар» Уладзімір Кацура.

Кіраўнік дзяржавы прысвоіў ганаровае званне «Заслужаны майстар спорту Рэспублікі Беларусь» групе спартсменаў. Гэтага звання ўдастоены спартсмен-інструктар нацыянальнай каманды Рэспублікі Беларусь па тэнісе Вікторыя Азаранка і спартсмен-інструктар нацыянальнай каманды па інваспорце Маргарыта Гралько.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Беларусь можа дасягнуць прагрэсу за кошт высокіх тэхналогій

Такую думку ў эфіры беларускага тэлебачання 29 ліпеня выказаў прэзідэнт Ізраіля Шымон Перэс у перадачы «Актуальнае інтэрв'ю».

«Нашы сучасныя веды яшчэ недасканаля. Вы прыкладаеце шмат намаганняў для таго, каб удасканальваць свае веды. Мы заўсёды падтрымліваем гэта імкненне і гаворым, што высокія тэхналогіі — гэта ключ да будучага. Вы гэтага абавязкова дасягнеце», — упэўнены Шымон Перэс.

Беларусы — таленавітыя людзі, і яны знойдуць сваё месца ў будучым свеце — свеце навукі і біятэхналогій, у свеце, свабодным ад умоўнасцяў і граніц, лічыць прэзідэнт Ізраіля. «Я добра ведаю ваш народ. Гэта выдатныя людзі. Я думаю, што Беларусь уступае ў новую эпоху, новы віток тэхналагічнага прагрэсу», — адзначыў Шымон Перэс. На яго думку, гэта зойме няшмат часу.

Палітычная кар'ера Шымона Перэса пачалася адразу ж пасля заканчэння Другой сусветнай вайны. Ён стаў самым маладым кіраўніком абароннага ведамства Ізраіля. Двойчы быў кіраўніком урада і на працягу дзясяткаў гадоў застаецца лідарам буйнейшай партыі Ізраіля. Будучы міністрам замежных спраў, ён змог спыніць узброенае процістаянне палесцінцаў і ізраільцян, пасадзіўшы іх за стол перагавораў. Шымон Перэс — лаўрэат Нобелеўскай прэміі.

БЕЛТА.

ПЕРШЫ РАЗ Ў ПЕРШЫ КЛАС: ШТО ПАЧЫМ?

Вашы дзеці гэтай восенню пойдуць у першы клас? Віншую. Столькі прыемных турбот! Столькі эмоцый. А ці ўсе яны прыемныя? Я правяла кантрольную закупку, і аказалася, што, каб сабраць толькі адно дзіця ў школу, трэба патраціць сама меней паўмільёна. Такім чынам:

Школьны кірмаш у Магілёве.

Фота БЕЛТА.

ПЕРШЫ АРТЫКУЛ РАСХОДАЎ: ПІСЬМОВА-ПАПЯРОВЫ

Спачатку выпраўляюся за канцтаварамі. У мяне на руках спіс, дзе прапісана тое, што неабходна набыць першакласніку (алоўкі простыя і каляровыя, вокладкі для кніг і сшыткаў, блокі для малявання, каляровую паперу, наборы кардона, пенал, лінейку, нажніцы, пэндзлікі, гумкі і г. д.).

Літаркі, лічбы, геаметрычныя фігуры дзеці вывучаюць яшчэ ў садках. У школе, дзе мне выдалі гэты спіс, усе хлопчыкі і дзяўчынкі, якія прыйдуць сёлета ў першы клас, прайшлі гутарку з псіхолагам. І не было ніводнага дзіцяці, якое не тое што не ведала лічбаў, а нават не ўмела праводзіць простыя лічыльныя аперацыі. Усе ўмеюць чытаць склады, а добрая доля наогул нядрэнна чытае. Таму мне незразумела, навошта ў спісе пазначаны касы літар, складоў і лічбаў, матэматычны набор і лічыльныя палачкі. Але трэба, дык трэба. На канцтавары ідзе 90 тысяч. І гэта толькі першая закупка, у спісе нават не пазначаныя сшыткі. Вопытныя мамы, якія ўжо маюць дзяцей-школьнікаў, заўважаюць, што пасля давядзецца яшчэ выкласці суму не меншую: на дадатковыя канцтавары і працоўныя сшыткі (па якіх са згоды бацькоў настаўніца будзе весці з малымі заняткі).

Прынамсі, каб пазбегнуць лішніх пакупак, не пашкодзіць загадзя ўдакладніць з настаўніцай, якім павінен быць пластылін (звычайны ці васковы), клей. Напрыклад, у дзіцячых садках дзецям не дазваляецца працаваць з клеем ПВА, а толькі з клеем-алоўкам (апошні, дарэчы лепш набываць больш дарагі, бо аплікацыя, зробленая пры дапамозе таннага клею-алоўка, не будзе трымацца на паперы). Удакладніце, на колькі колераў закупляць фарбы, гуаш, алоўкі. Часам вопытны педагог можа параіць, якой маркі тавар лепшы. Напрыклад, бываюць фламастары, якія даўжэй служаць і добра адмываюцца з рук і з вопраткі. Бывае і гуаш, плямы ад якой адмыць з адзення немагчыма.

СТАР. 4

АКЦЫЯНАВАННЕ І ПРЫВАТЫЗАЦЫЯ БЧ ПАКУЛЬ НЕМЭТАЗГОДНЫЯ

Акцыянаванне і прыватызацыя Беларускай чыгункі пакуль немэтазгодныя. Такую думку выказаў журналістам начальнік БЧ Анатоль Сівак.

«З майго пункту гледжання як начальніка дарогі, мы не давалі падставы, каб дзяржава перадала дарогу прыватніку для больш эфектыўнага кіравання, — сказаў Анатоль Сівак. — Калі дзяржава ўбачыць, што мы кіруем дарогай неэфектыўна, тады, напэўна, і прыйдзе прыватнік. Пакуль мы з работай спраўляемся».

Пры гэтым Анатоль Сівак адзначыў, што БЧ — адна з нямногіх чыгунак, якая не атрымлівае грошай з бюджэту на інфраструктурныя праекты. «Сёння ў Расіі чыгунка — акцыянернае таварыства, але расійскі бюджэт выдзяляе мільярды долараў на інфраструктурныя праекты», — праінфармаваў ён. У расійскіх рэгіёнах ёсць прыватнікі, якія ажыццяўляюць пасажырскія перавозкі, але бюджэт усё роўна іх датуе. БЧ ж «не атрымлівае ні капейкі», дадаў Анатоль Сівак.

Кіраўнік чыгуначнай магістралі таксама нагадаў, што БЧ сёння канкурэнтаздольная па ўзроўні тарыфаў. «Мы яго зніжаем, калі трэба, каб прыцягнуць грузапаток, у нас ёсць для гэтага рэзервовы запас», — сказаў ён. БЧ працуе з дадатнай рэнтабельнасцю. «Мы свядома ў гэтым годзе нават крыху свае планы па ўзроўні рэнтабельнасці зменшылі, каб больш рэсурсаў выкарыстаць на падтрыманне, рамонт нашых тэхнічных сродкаў, — прадоўжыў Анатоль Сівак. — Мы план па ўзроўні рэнтабельнасці перавыконваем, ён роўны 20 працэнтаў».

У той жа час ён адзначыў, што ў структуры БЧ ёсць прадпрыемствы неасноўнай дзейнасці — у галіне гандлю, прамысловасці, будаўніцтва. Яны ўнесены ў планы па акцыянаванні. «Яны маглі б быць акцыянаваны і раней, але існавалі заканадаўчыя бар'еры, якія гэтаму перашкаджалі, — растлумачыў кіраўнік БЧ. — Цяпер яны зняты, ёсць планы, і яны будуць рэалізаваны».

БЕЛТА.

Пётр ПРАКАПОВІЧ:

«ТРЭБА НЕ ЗАБЫВАЦЬ, ШТО Ў НАС САЦЫЯЛЬНА-АРЫЕНТАВАНАЯ РЫНКАВАЯ ЭКАНОМІКА ЕЎРАПЕЙСКАГА ТЫПУ, ДЗЕ ГАЛОЎНАЯ МЭТА — ПАЛЯПШЭННЕ ЖЫЦЦЁВАГА ЎЗРОЎНЮ»

Вынікамі працы банкаўскай сістэмы краіны за першае паўгоддзе і задачамі на другую палову 2010 года з журналістамі падзяліўся Пётр ПРАКАПОВІЧ, старшыня Праўлення Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь. Ён выказаў упэўненасць, што асноўныя паказчыкі напрамкаў грашова-крэдытнай палітыкі за год будуць выкананыя ў поўным аб'ёме.

Курс будзе стабільным, а крэдыты патаннеюць

Як адзначыў Пётр Пракаповіч, курсавая палітыка ў першым паўгоддзі праходзіла ў адпаведнасці з асноўнымі напрамкамі грашова-крэдытнай палітыкі, дзе быў вызначаны дапушчальны калідор у +/- 10 % курса беларускага рубля ў адносінах да кошыка валют:

— Сітуацыя была дастаткова стабільнай, курс нацыянальнай валюты быў блізкі да цэнтральнага калідора, максімальныя адхіленні складалі ад 1 % да 3 %. На 1 ліпеня 2010 года курс беларускага рубля ў адносінах да кошыка замежных валют складае 1025,16 рубля, узмацніўшыся з пачатку года на 1,1 %, — сказаў Пётр Пятровіч.

Пры гэтым старшыня Праўлення Нацбанка выказаў меркаванне, што да канца года максімальныя хістанні будуць 2-3 %:

— Мы калідор не мянялі, ён застаецца +/- 10 %, мы будзем у ім працаваць да канца года. Рэзкіх хістанняў усярэдзіне калідора не будзе, курс нацыянальнай валюты будзе максімальна набліжаны да цэнтральнага парытэту, я мяркую, што хістанні будуць не больш за 2-3 % у асобныя перыяды часу.

Пётр Пракаповіч расказаў і пра працэнтную палітыку Нацбанка ў першым паўгоддзі: прынамсі, за гэты час тройчы была зніжана стаўка рэфінансавання — з 13,5 % у студзені яна цяпер знізілася да 11,5 %. У выніку гэтага адбылося агульнае зніжэнне працэнтных ставак на грашовым рынку краіны: працэнтныя стаўкі па новых дэпазітах знізіліся ў параўнанні са студзенем на 5,8 %, па новых крэдытах — на 4,6 %.

СТАР. 2

Муж-забойца

У пад'ездзе дома, што па вуліцы Несцерава ў Мінску, увечары знайшлі труп 32-гадовай жанчыны са шматлікімі тупымі ранамі галавы. Падчас следства ўстаноўлена, што забойства — справа рук мужа пацярпелай.

— Па дарозе дадому паміж мужам і жонкай адбылася сварка, — паведамілі падрабязнасці ў прэс-службе Генеральнай пракуратуры. — Жанчына абвінавачвала мужа ў нявернасці. У разгары сваркі мужчына некалькі разоў ударыў раўнівую жонку аб металічныя ўваходныя дзверы пад'езда. Ад атрыманых траўмаў яна памерла на месцы. Мужчына ж вырашыў стварыць сабе алібі. Схадзіў у краму, і толькі вярнуўшыся на месца здарэння, выклікаў супрацоўнікаў міліцыі. Прыязджайце, маўляў, невядомыя забілі жонку і скралі ў яе мабільны тэлефон.

Суд прыгаварыў забойцу да пазбаўлення волі на 14 гадоў.

Надзея ДРЫЛА.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

ЭСТОНІЯ І ЛІТВА ХОЧУЦЬ АДАБРАЦЬ У «ГАЗПРАМА» ГАЗАПРАВОДЫ

«Газпрам» можа страціць газатранспартныя актывы ў Прыбалтыцы. Кіруючыя партыі Эстоніі настойваюць на тым, каб краіна ўжыла самую цвёрдую схему ў рамках Трэцяга энергапакета ЕС і абавязала Eesti Gaas (на 47% належыць «Газпраму» і «Ітэры») расстацца з магістральнымі газаправодамі, піша «Коммерсантъ».

Аналагічнае рашэнне ўжо разглядае і Літва, доляй у газатранспартнай сістэме якой таксама валодае ААТ «Газпрам».

Падзел энергаканцэрнаў па відах дзейнасці абумоўлівае прыняты ў 2009 годзе Трэці энергапакет ЕС. Аднак у ім прадугледжаны розныя схемы. Паводле слоў аўтара ідэі дэпутата парламента Эстоніі Ігара Гразіна, ёсць тры варыянты адчужэння газаправодаў. «Я не падтрымліваю ідэю нацыяналізацыі. Калі б труба была прададзена нават іншай расійскай кампаніі, то нас бы такі варыянт задаволіў. Галоўнае, каб на рынку газу з'явілася нарэшце канкурэнцыя», — тлумачыць ён. Другі варыянт — стварыць незалежнага аператара для кіравання газаправодамі, трэці — саступіць эстонскаму ўраду залатую акцыю Eesti Gaas з правам вета. У «Газпраме» ад каментароў адмовіліся.

Кіраўнік East European Gas Analysis Міхась Карчэмкін тлумачыць, што краіны Прыбалтыкі плацяць за расійскі газ самыя высокія цэны ў ЕС. У першым квартале, паводле справаздачы «Газпрама», гэта $318,2 за тысячу кубаметраў. «Газпрам» у чацвёртым квартале прадаваў газ у Еўропу ў сярэднім па $234, — адзначае эксперт. Прэм'ер Літвы Андрус Кубілюс нядаўна пацвярджаў, што «кошт прыроднага газу ў Літве на $100-150 вышэй за кошт на газ у Заходняй Еўропе».

РАСІЯ МОЖА ЎВЕСЦІ ПОШЛІНЫ НА НАФТУ І ДЛЯ КАЗАХСТАНА

Беларусь можа апынуцца не адзінай краінай, якая пазбавілася бязмытнай нафты з Расіі. Расійскія чыноўнікі задумаліся пра ўвядзенне з 2011 года пошліны на пастаўкі сыравіны і ў іншую краіну — удзельніцу Мытнага саюза — Казахстан.

Увядзенне пошліны на нафту, якая экспартуецца ў Казахстан, з'явілася сярод прапаноў па павелічэнні прыбыткаў расійскага бюджэту ў 2011—2013 гадах. Мера павінна папоўніць казну на 46,8 млрд руб. у наступным годзе, у 2012 і 2013 гадах бюджэт атрымае па 48 млрд рублёў. Пошліна ўжо абмяркоўвалася з уладамі Казахстана, але ніякіх рашэнняў пакуль не прынята. Гэта палітычнае пытанне, тлумачыць адзін з суразмоўцаў «Ведамасцяў»: на экспарт у Беларусь пошліна ўведзена сёлета, было б лагічным абкласці ёю пастаўкі і ў Казахстан, каб правілы ў Мытным саюзе былі адзінымі для ўсіх.

ЕЎРАКАМІСІЯ АБАВЯЗАЛА ВЫТВОРЦАЎ МАБІЛЬНІКАЎ ПЕРАЙСЦІ НА АДЗІНУЮ ЗАРАДНУЮ ПРЫЛАДУ

Еўрапейская камісія прыняла рашэнне, якое абавязвае вядучых вытворцаў мабільных тэлефонаў з 1 студзеня 2011 года абсталёўваць сваю прадукцыю, што рэалізуецца на рынку ЕС, уніфікаванай зарадной прыладай.

Вышэйшы выканаўчы орган Еўрасаюза мае намер спыніць нерацыянальную практыку, пры якой сям'я з пяці чалавек можа карыстацца пяццю рознымі прыладамі для зарадкі сваіх сотавых апаратаў. Па патрабаванні Еўракамісіі такая прылада павінна быць распрацавана ў самыя кароткія тэрміны. Да мабільнага апарата яна будзе далучацца праз раз'ём тыпу mini USB. У наш час спажыўцы ў Еўропе практычна кожны год мяняюць свой мабільны тэлефон на новую і больш дасканалую мадэль. Такім чынам, амаль у кожнай хаце захоўваецца цэлы набор нікому не патрэбных зарадных прылад. Пасля 1 студзеня 2011 года адной прылады хопіць на ўсю сям'ю і на доўгія гады.

ТОЛЬКІ ПАСЛЯ 60 ГАДОЎ МОЗГ ПАЧЫНАЕ ПРАЦАВАЦЬ НА ПОЎНУЮ СІЛУ

Амерыканскія навукоўцы высветлілі, што з узростам чалавек становіцца разумнейшым і больш разважлівым, бо яго мозг пачынае працаваць у поўную сілу. Пры гэтым пік інтэлектуальнай актыўнасці прыпадае на 50—70 гадоў. Такія сенсацыйныя вынікі працы даследніцы Барбары Стоўч, паведамляе The Daily Mail.

Традыцыйна лічылася, што разумовая дзейнасць згасае, бо нейроны — клеткі галаўнога мозга — паступова адмаюць, і да канца жыцця чалавек губляе да 30 % нейронаў. Аднак падчас апошніх даследаванняў высветлілася, што гэта зусім не так: клеткі галаўнога мозга не паміраюць. Могуць быць страчаны сувязі паміж імі, але толькі ў тым выпадку, калі чалавек іх няк не задзейнічае. Пры гэтым з часам у галаўным мозгу павялічваецца колькасць міэліну — рэчыва, якое прымушае сігнал хутчэй праходзіць паміж нейронамі. За кошт гэтага агульная інтэлектуальная сіла мозга павялічваецца да 3000 % у параўнанні з сярэднім паказчыкам. А пік актыўнасці вытворчасці міэліну прыпадае на 60-гадовы ўзрост і старэй.

Акрамя таго, калі да 50 гадоў паміж двума паўшар'ямі галаўнога мозга існуе цвёрды «падзел працы» і кожнае з іх выконвае строга вызначаныя функцыі, то пасля 50 гадоў чалавек можа выкарыстоўваць абедзве часткі мозга адначасова. Разам з гэтым, сказваецца і жыццёвая практыка сталых і пажылых людзей, назапашаная на працягу ўсяго жыцця.

ОДА ПЕРАМОЖЦУ

Вадзіцель МАЗа на перавозцы збожжавых Ігар Пузырын не чакаў, што стане віноўнікам святочнага міні-канцэрта на жніўным полі. У дзень перавозкі ім тысячнай тоны новага хлеба артысты з Хойніцкага Дома культуры — вакальная група «Журавінка» — прыехалі віншаваць пераможцу на месца сапраўднай бітвы за ўраджай. У Хойніцкім раёне зрабілі добрай традыцыяй — як толькі з'яўляецца камбайнер ці вадзіцель з тысячным намалотам ці перавозкай, яго віншуюць улады і ў яго гонар ладзіцца невялікі канцэрт. У эксперыментальнай базе «Стралічава» сёлетні ўраджай не падвёў надзеі хлебаробаў, і ўборачная ідзе зладжана і хуткімі тэмпамі. Ігар Пузырын аказаўся чалавекам сціплым, перад камерай красавацца не стаў, але, як паказваюць вынікі, працаўнік ён выдатны.

Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.

Ведай нашых!

БЕЛАРУСКІ ГЕРАКЛ

Фота БЕЛТА.

Трэці медаль чэмпіянату Еўропы па лёгкай атлетыцы на рахунку зборнай Беларусі! Дзесяціборац Андрэй КРАЎЧАНКА падтрымаў нашых штурхальніц ядра і ўзышоў на «бронзавы» прыступак барселонскага п'едэстала.

Шчыра прызнацца, гэтага медаля ўсе чакалі. Сярэбраны прызёр Алімпіяды ў Пекіне з самага пачатку разглядаўся адным з верагодных здабытчыкаў еўрапейскага лёгкаатлетычнага каштоўнага металу. Насцяроджвала толькі траўма, якая не давала Краўчанку выступаць ва ўсю моц, але Андрэй чарговы раз даказаў, што эпітэт «мужны» — гэта пра яго.

Як мы ўжо паведамлялі, пасля шасці відаў праграмы беларус займаў другое месца. Пасля ў кіданні дыска Краўчанка паказаў свой лепшы вынік у сезоне — 45,48 і застаўся на другім месцы. Другі наш спартсмен, Эдуард Міхан, кінуў дыск на 45 метраў 4 сантыметры, паказаўшы свой лепшы вынік у кар'еры і падняўся на шостае месца.

Пасля аднаго са сваіх любімых відаў, скачкоў з шастом, Краўчанка (вынік 5,05) узняўся на першы радок турнірнай табліцы. Але ўсе роўна застаўся не вельмі задаволены. Пра гэта трошкі ніжэй раскажа сам герой турніру. Міхан, зноў устанавіўшы асабісты рэкорд (4,65), апусціўся на сёмае месца.

СТАР. 2

ISSN 1990 - 763X

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 31.07.2010 г. (для б/н разлікаў)			
▼1 долар ЗША	2 974,00	1 чэшская крона	156,37
▲1 еўра	3 883,75	1 польскі злоты	967,63
1 латвійскі лат	5 474,96	▲1 расійскі рубель	98,52
1 літоўскі літ	1 123,98	1 украінская грыўня	376,79

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ	
USD	30,1869
10 UAH	38,2316
1000 BYR	10,1434
EUR	39,4694

Агенцтва Уладзіміра Грачова

АУКЦИОНЫ ПО ПРОДАЖЕ КОММЕРЧЕСКОЙ НЕДВИЖИМОСТИ
WWW.RLT.BY

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

КУП «Минский областной центр учета недвижимости» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Белстройматериалы» (продавец)

проводит повторный открытый аукцион по продаже зданий и сооружений производственного участка, расположенного по адресу: **г. Смолевичи, ул. Торговая, 20а,** в составе здания вспомогательного корпуса, об. пл. 942,3 кв.м; объектов незавершенного строительства: складской корпус, об. пл. 6246 кв.м, административно-бытовой корпус, об. пл. 635,7 кв.м, склад ГСМ, об. пл. 33,8 кв.м, контрольно-проездной пункт (3х3 м); канализационная насосная станция; очистные сооружения дождевых вод; прожекторная мачта (2 ед.); резервуары запаса воды (3 ед.); **железная дорога** (протяж. 1268,71 п.м.); ворота металлические; осветительные ж/б столбы (18 ед.); ограждение территории (275 бетонных плит); открытый склад под козловым краном (бетон. площадка); внутриплощадочные сети; внеплощадочные сети, а также оборудования.

Начальная цена с НДС (снижена на 10 %) – 7 228 242 024 бел. руб.

Площадь земельного участка **9,2953 га.**

Задаток – 20 000 000 бел. руб.

Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 23.12.2009. Аукцион состоится **12.08.2010 в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **11.08.2010 до 17.00** по указанному адресу.

Тел.: (8017) 224 61 34, 500 47 12.

БЕЛАРУСКІ ГЕРАКЛ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Падвёў беларусаў перадапошні від праграмы — кіданне кап'я. Нашы спартсмены хоць і паказалі вынікі, блізкія да сваіх лепшых, але значна саступілі супернікам. Перад фінальным этапам праграмы — бегам на 1500 метраў — Краўчанка займаў трэцюю пазіцыю, Міхан — дзявятую. Такімі яны ў выніку і фінішавалі. Чэмпіёнам Еўропы стаў француз Раман Барас.

— Эмоцыі сёння ў мяне вельмі станоўчыя, нібы рай адамкнуўся, — расказаў Андрэй КРАЎЧАНКА. — Вельмі задаволены — змагаўся як мог. У Барселоне былі вельмі цікавыя, напружаныя спаборніцтвы — мне спадабаліся. Ды і надвор'е таму спрыяла. І рады ў першую чаргу не медалю, а таму, што зноў вяртаюся ў нармальную каляіну. У мяне былі праблемы са здароўем, у асабістым жыцці, у сям'і — усё неяк наклалася адно на адно. Цяпер усё наладзілася. Рады, што ўсё добра, што нічога не баліць, што медаль ёсць.

— А напрэзадні спаборніцтваў якое месца для сябе планавалі ў Барселоне?

— Мне прыснілася, што буду трэцім. Апошні час нейкія пророчыя сны мне сняцца! Так, перад Алімпіядай прыснілася, што з кубінцам буду за 2-3 месца змагацца, што потым і атрымалася. Але я разлічваў на першае месца ў Барселоне! Аднак спорт — гэта фартуна: сёння яны першыя, заўтра я буду. Думаю, супернікам проста надта шанцавала ў тэхнічных відах — шасце, кап'і. Барас у першай спробе кап'ё ў лівень кінуў за 65 метраў. Проста фантастыка!

— А вы, якім сваім відам задаволеныя?

— Скачкамі з шастом, безумоўна! Мяне чамусьці паставілі ў слабейшую групу, хоць я маю вынік 5,20. І я паўтары гадзіны чакаў сваёй вышыні. А калі стаў скакаць, шост у першай жа спробе і зламаўся. Думаю, гэта таму, што кавалак яго тырчаў з корабa, можа ён нагрэўся на сонцы, таму зламаўся. Я бегаў і пытаў, у каго ёсць вось такі шэст, але ніхто не даваў. Літовец Драўдвіла, які тады ішоў на першым месцы, дапамог мне — ён сам падышоў і кажа: «Бяры мой шэст». Пытаю: «А як жа ты?», а ён мне: «Буду скакаць на іншым». Я яго ледзь не расцалаваў. Ён — малайчына проста! Можна сказаць, выратаваў мяне. А то мы з трэнерам думалі, што будзем заканчваць спаборніцтвы — шаста няма, скакаць няма на чым.

— Вы выступалі разам з другім нашым спартсменам, Эдуардам Міханам. Гэта дапамагае, калі два беларусы ў сектарах і на дарожках?

— Добра, калі выступаеш не адзін ад краіны. І нават лепш, калі тры чалавекі, як было ў Пекіне. Тады мы адзін аднаго падтрымлівалі, дапамагалі, падказвалі. Мы з Эдзікам разам трэніруемся ў Івана Пятровіча Гардзіенкі. І заўсёды адзін аднаму дапамагаем. На чэмпіянаце Эдзік мяне вельмі падтрымліваў. У «кап'і» я разгубіўся зусім, а ён мне — збярыся, давай, будзеш першым. Я ж дапамагаў яму, раіў. Хвалявaліся сябар за сябра. Хацелася таксама перадаць прывітанне ў Беларусь і падзякаваць усім, хто за нас хвалявaўся і падтрымліваў нас! Дзякуй за веру!

У кваліфікацыйных спаборніцтвах па трайным скачку выступалі дзве беларускія спартсменкі. Наталля Вяткіна з вынікам 14 метраў 20 сантыметраў прайшла ў фінал, які пройдзе сёння ўвечары. Ксенія Дэцук (14,01) сваё выступленне на турніры ўжо скончыла.

Аніс Ананенка на 800-метровай дыстанцыі прыпыніўся ў адным кроку ад фіналу, у яго 9-е выніковае месца.

На стаметроўцы з бар'ерамі абедзве беларускі прайшлі ў паўфінал. Аліна Талай паказала вынік 13,17, Кацярына Паплаўская — 13,19.

Прымусіў за сябе пахвалявацца штурхальнік ядра Павал Лыжын. Першыя дзве спробы кваліфікацыйных спаборніцтваў пакідалі яго па-за межамі фіналу, але трэцім штуршком ён не толькі афармiў пропуск далей, але і паказаў лепшы вынік сярод усіх удзельнікаў кваліфікацыі — 20 метраў 42 сантыметры. У Андрэя Міхневіча — 20,35. Фінал пачнецца сёння ўвечары ў 19.30 па беларускім часе.

Яўген ВАРАКСА.

«...У НАС САЦЫЯЛЬНА-АРЫЕНТАВАНАЯ РЫНКАВАЯ ЭКАНОМІКА ЕЎРАПЕЙСКАГА ТЫПУ...»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

У другім паўгоддзі 2010 года такая палітыка Нацбанка будзе працягнутая — як сказаў Пётр Пракаповіч, стаўка рэфінансавання будзе далей зніжацца ў адпаведнасці з асноўнымі напрамкамі грашова-крэдытнай палітыкі (там памер стаўкі рэфінансавання абазначаны ў калідоры 9-12 %), а крэдытныя стаўкі банкаў павінны выйсці на ўзровень 12-15 %.

— Асноўныя крыніцы для банкаў — гэта дэпазіты, таму калі мы будзем зніжаць працэнтныя стаўкі па крэдытах, а да гэтага мы ўсе імкнёмся, бо тое патрэбна для эканамічнага росту краіны, то, натуральна, стаўкі па дэпазітах таксама будуць зніжацца, — патлумачыў Пётр Пракаповіч. — Але стаўкі па дэпазітах у беларускіх рублях будуць вышэйшыя за ўзровень інфляцыі, а размяшчэнне валюты будзе больш цікавае, чым у іншых краінах... Мы павінны імкнуцца да таго, каб было выгадна дэпазіты размяшчаць і каб было выгадна прыцягваць крэдытныя рэсурсы, асабліва ў рэальны сектар эканомікі, у малы і сярэдні бізнэс, у мікракрэдытаванне або крэдытаванне насельніцтва. Мы павінны паскорыць працу па зніжэнні працэнтных ставак, каб крэдыты былі даступныя большай частцы нашага насельніцтва — спажывецкія, на будаўніцтва жылля і гэтак далей, — сказаў старшыня праўлення Нацбанка.

Усяго аб'ём крэдытаў, выдадзеных банкамі краіны за паўгоддзе, павялічыўся амаль у 1,5 раза ў параўнанні з выдачай за аналагічны перыяд 2009 года, прычым 29,5 % з іх накіраваныя на доўгатэрміновае крэдытаванне. Аб'ём прыцягнутых сродкаў ад насельніцтва сёлета ў першым паўгоддзі павялічыўся на 3 трыльёны рублёў і склаў 21,7 трыльёна рублёў.

Пётр Пракаповіч паведаміў таксама, што да канца 2010 года плануецца павялічыць золатавалютныя рэзервы, якія сёння складаюць 5,5 мільярда долараў, да 6,2-7,5 мільярда

долараў. Зроблена гэта, па меркаванні старшыні праўлення Нацбанка, павінна быць за кошт лепшай працы эканомікі, прыватызацыі прадпрыемстваў, знешніх запазычанняў.

Абяцаная 500-доларавая зарплата валютны рынак не дэстабілізуе

Старшыня Нацбанка выказаў меркаванне, што зарплата ў 500 долараў у цэлым па краіне можа быць дасягнутая:

— Ёсць усе магчымасці, каб гэты паказчык у цэлым па краіне быў выкананы. Ёсць прадпрыемствы і цэлыя сферы, дзе гэты паказчык выканалі, ёсць і прадпрыемствы, дзе зарплата яшчэ дастаткова нізкая. Таму менавіта на гэтых прадпрыемствах у першую чаргу трэба прымяняць новыя падыходы, рэалізоўваць інвестыцыйныя праекты, праводзіць мадэрнізацыю, каб вырашыць пытанне павелічэння зарплаты. Бо калі мы сёння кажам пра 500 долараў, то ў наступную пяцігодку — не менш за 1000. Калі цяпер не зробім, то потым яшчэ цяжэй будзе, — сказаў Пётр Пракаповіч. — Што з'яўляецца асновай эканамічнага росту? Усяго два паказчыкі — унутраны і знешні попыт. Унутраны попыт — гэта магчымасці перш за ўсё нашага насельніцтва ў набыцці тавараў і паслуг. І калі мы не будзем павялічваць зарплату, не будзем нарошчваць спажывецкія магчымасці насельніцтва, то ў нас няма будучыні, няма развіцця эканомікі. І па-другое, трэба не забываць, што ў нас сацыяльна-арыентаваная рынкавая эканоміка еўрапейскага тыпу, дзе галоўная мэта — паляпшэнне жыццёвага ўзроўню. І калі мы гэтую мэту не выконваем, тады нам трэба прыняць іншую мадэль і развівацца іншымі шляхамі.

Пётр Пракаповіч таксама запэўніў, што ўсе пытанні пры вядзенні валютнай і курсавой палітыкі адсочваюцца і пагрозы, што павышэнне зарплаты прывядзе да дэстабілізацыі валютнага рынку, няма.

Еўрабонды: сёння Еўропа, заўтра Расія, потым — Азія

Старшыня Нацбанка заявіў, што выпушчаныя нядаўна аблігацыі на еўрапейскім рынку паказалі станоўчыя тэндэнцыі:

— Прайшло некалькі дзён, а тэндэнцыі для нас станоўчыя. Чаму мы пайшлі на адносна высокую стаўку — 9 %? Па-першае, такая сітуацыя склалася на рынку, ну а па-другое, і самае галоўнае — гэта наша першае размяшчэнне еўрабондаў. Сёння ў нас няма крэдытнай гісторыі па еўрабондах, нас ніхто не ведае ў свеце, таму наша першае размяшчэнне больш дарагое. Мы размясцілі нязначную суму, гэта наш першы крок і ён для нас вельмі станоўчы і паспяховы. А другое і трэцяе размяшчэнні будуць па больш нізкіх працэнтных стаўках з улікам назапашанага вопыту, нашай крэдытнай гісторыі і іншых пытанняў, — сказаў Пётр Пракаповіч. — Зразумела, нам бы хацелася пад 1-2 %, але для гэтага павінна быць праведзена адпаведная праца ў эканоміцы: і рэйтынг краіны павінен быць адпаведны, і золатавалютныя рэзервы, і плацежны баланс.

Пры гэтым старшыня Праўлення Нацбанка паведаміў, што наступнае размяшчэнне еўрабондаў будзе ў жніўні на расійскім рынку, а ў канцы 2010 ці пачатку 2011 года — на азіяцкім. Пётр Пракаповіч таксама адзначыў, што працягваецца супрацоўніцтва з Міжнародным валютным фондам, але пакуль няма неабходнасці ў прыцягненні рэсурсаў МВФ для эканомікі.

Белінвестбанк будзе прададзены толькі еўрапейцам

Расказаў Пётр Пятровіч і пра продаж Белінвестбанка. Па яго словах, гэты працэс ідзе, але галоўнае тут — прадаць банк не проста для змены назвы, а каб прыцягнуць стратэгічнага інвестара, які б уваходзіў у вядучую дваццатку самых буйных банкаў свету:

— Нам простыя продаж не патрэбны, нам патрэбны стратэгічны інвестар, які можа ўкладваць мільярды еўра ў развіццё гэтага банка. Пры гэтым інвестар павінен быць з Еўрасаюза, бо ў нас два галоўныя эканамічныя партнёры — краіны СНД і Еўрасаюз. Калі сёння з удзелам капіталу Расіі і іншых краін СНД функцыянуе 10 банкаў у Беларусі, то з удзелам капіталу ЕС — толькі 2. Гэта дыспарытэт, таму апошні буйны банк павінен быць прададзены буйному еўрапейскаму інвестару з дваццаткі самых вялікіх банкаў. Такія нашы абмежаванні прадугледжваюць паступовую працу, мы любой цаной гэтае пытанне не вырашаем, — адзначыў Пётр Пракаповіч.

Што датычыцца прыцягнення кітайскіх банкаў у Беларусь, то, на думку Пятра Пятровіча, кітайскі бок сёння да гэтага не гатовы: кітайскія банкі пачынаюць працаваць тады, калі абарот паміж краінамі дасягае пэўных аб'ёмаў. Старшыня Нацбанка мяркуе, што такі абарот будзе дасягнуты праз 1-2 гады, тады ў Беларусі і з'явяцца кітайскія банкі.

Павел БЕРАСНЕЎ.

Абзац

◢ Сёлетні ліпень аказаўся самым цёплым за ўсю гісторыю метэаназіранняў у Беларусі (з канца XIX ст.). Сярэдняя тэмпература склала 21—24 градусы і аказалася на 3-5 градусаў вышэй за кліматычную норму. Самая высокая дзённая тэмпература была зарэгістраваная на метэастанцыі Жлобін 23 ліпеня, калі слупок тэрмометра дасягнуў адзнакі плюс 36,2 градуса.

◢ **У Віцебскай вобласці за першае паўгоддзе ў вясковую мясцовасць перасяліліся 76 сем'яў. Гэты паказчык — самы высокі сярод рэгіёнаў краіны і складае трэць ад усяго ліку сем'яў, якія перасяліліся ў вёску (усяго па краіне — 241).**

◢ У першым паўгоддзі піваварныя заводы Беларусі павялічылі экспарт піва ў 2 разы ў параўнанні з паказчыкам за такі ж перыяд мінулага года.

◢ **Мільён кантрабандных і нелегальна выпушчаных цыгарэт (47 тыс. пачкаў) знішчаныя ўчора на палігоне «Прудзішча» пад Мінскам. Нелегальны тавар быў затрыманы мытнікамі пры спробе перамяшчэння праз мяжу Беларусі.**

◢ Наглядчыца аднаго з філіялаў Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка паўгода крала выручку за квіткі і сувеніры. Летась 47-гадовая супрацоўніца музея частку сродкаў пачала забіраць сабе. Такім чынам за паўгода жанчыне ўдалося скрасці больш за Br15 млн, якія яна патрацiла на дробныя расходы. Інфармацыя трапіла ў праваахоўныя органы, а праверка выявіла недастачу. За прысваенне і растрату даверанай маёмасці ў буйным памеры палачанка асуджаная на 2 гады пазбаўлення волі з канфіскацыяй маёмасці. Прысуд увайшоў у законную сілу.

Поўны абзац

◢ **Галоўны трэнер зборнай КНДР Кім Чон Хон выключаны з шэрагаў Працоўнай партыі Карэі за няўдалае выступленне каманды на футбольным чэмпіянаце свету. Зборная КНДР упершыню з 1966 года здолела прабіцца ў фінальную частку чэмпіянату свету, аднак на паўднёваафрыканскім мундыялі выступіла няўдала. Каманда, як вядома, прайграла ва ўсіх трох матчах: бразільцам — 1:2, партугальцам — 0:7 і камандзе Кот-д'Івуара — 0:3.**

◢ Мастак з украінскага горада Запарожжа Максім Агародны стварыў серыю карцін з мух пад назвай «Муха — таксама чалавек». У серыю ўвайшло больш за 300 малюнкаў. Як расказаў мастак, зараз лепшы час для збору матэрыялу. «Галоўнае, каб вокны ў кватэры былі адчыненыя на працягу дня», — адзначае ён. Далей — справа тэхнікі: мастак прымяняе спецыяльныя ліпкія стужкі. Сюжэты творца бярэ з навакольнага жыцця.

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

ФОКУС

КАЛІ ДА НАС ЛАМАНУЦЦА ТУРЫСТЫ?



Каторы год чую з навінаў пра тое, як імкліва ў нас развіваецца турызм. Адразу ў некалькіх універсітэтах рыхтуюць адпаведных менеджараў. З тэлевізара распавядаецца пра новыя аграсядзібы, але выніку пакуль не відаць.

Днямі размаўляў з жанчынамі, якія адпачываюць у санаторыі побач з маім лецішчам.

— Тут, бясспрэчна, добра, ходзім то ў краму, то на возера. Але няма ніводнай экскурсіі, каб цэрквы, замкі паглядзець, — жаліліся ўсходняя суседкі. — Украінцы ўжо даўно зарабілі б на нас грошы, звазілі б на якую экскурсію.

Я дзіўлюся, чым займаюцца падрыхтаваныя дзяржавай менеджары? Замест іх на турыстах-экстрэмалах з Еўропы часам нажываюцца несумленныя таксісты, «клафеліншчыцы» і гэтак далей. У выніку церпіць наш міжнародны імідж!

Днямі інтэрнэт абляцела гісторыя пра брытанскага турыста, які прыехаў у Мінск на 10 сутак, і ўжо праз тры дні папрасіўся дадому. Сказаў, што кошты ў нас даражэйшыя, чым у Лондане, за тры дні патрацію 500 долараў. Відаць, падманвалі дзядзечку таксісты, лупілі за праезд у пяць разоў дарагжэй...

Але гэта гісторыя ў многім адкрывае вочы на не вельмі вясёлае становішча нашага турызму. У дадатак да гэтых праблем даведваюся з інтэрнэту, што візы для замежных турыстаў каштуюць 60 еўра для турыстаў з Заходняй Еўропы, а для больш далёкіх краін нават і больш.

Перакананы: калі заняцца турызмам прафесійна і крэатыўна, Беларусь падалася б замежнікам спакуслівай цукерачкай.

На мінулым тыдні ездзіў па краіне, рыхтаваў даволі сумныя матэрыялы — забойствы, трагедыі, крымінальныя справы. Нават падчас такіх сур'ёзных вандровак хочацца нейкага пазітыву. На першы погляд, мястэчкі і вёскі, куды даводзілася заязджаць, выглядалі стандартна і месцамі нават шэра. Але гэта толькі ад няведання гісторыі і геаграфіі. Метадам тыку аналізую першую вёску, якая трапляецца на шляху, — Журавічы Рагачоўскага раёна. З выгляду — шэрая вёска. Ну што ту цікавага, які тут турызм? Але падумаўшы над пытаннямі маркетынгу, разумею — сюды за-

межнікаў можна завабіць на раздва. Як мне распавялі мясцовыя чыноўнікі, у рэгіён ужо штогод прыязджаюць галандцы.

— Калісьці гэта было мястэчка. Прыкладна ў 1880 годзе тут жыло каля 2000 чалавек, з іх — 1500 яўрэяў, — кажа **старшыня Журавіцкага сельскага Савета Таццяна ДРАЗДОВА**. — Тут стаяла аж 54 лаўкі, дзе паслугі аказвалі кавалі, краўцы, гандляры... Журавічы мелі цікавую гісторыю.

Таццяна Іванаўна паказала свае альбомы з фотаздымкамі Журавічаў савецкага перыяду. Сярод шматлікіх фотакартак бачу выяву пацешнага савецкага мітынгу. Стаяць мясцовыя жыхары, а ля іх праязджае воз з акцёрамі, якія іграюць ролі ворагаў савецкага народа — бацюшкі, памешчыка і кулака. Бачыў маленькія музеі з такімі гістарычнымі фотаздымкамі ў нямецкіх мястэчках. Нечакана даведваюся, што ў Журавічах нарадзіўся знакаміты савецкі публіцыст Фрыдрых Нязнанскі, выкладчык Гарвардскага ўніверсітэта, аўтар «Марша Турэцкага». Тут навучаўся беларускі драматург Андрэй Макаёнак, якога вывучаюць нашы школьнікі.

Хапае ў Журавічах і сваіх таямнічых міфаў. Кажуць, што купальскай ноччу ў ваколіцах вёскі адбываюцца трагічныя здарэнні. Летась, напрыклад, матацыкліст збіў дзяўчынку, а на хлопчыка ўпала запаленая пакрышка. Старшыня сельскага Савета Таццяна Драздова ўдакладняе, што дзяўчынка сёння амаль паправілася, а хлопца, на жаль, выратаваць не ўдалося...

Вось вам і шэрая вёска — хоць серыял здымай.

Цяпер, калі я даведаўся пра Журавічы (яшчэ раз нагадаю, што вёску я аналізаваў метадам тыку), гэты турыстычны пункт стаўлю для сябе ў адзін шэраг з легендарным Гальшанскім замкам, дзе блукала міфічная Белая Дама. Хоць нашы дзеячы ў галіне турызму і туды не ўмеюць завабіць людзей, зарабіць грошай для сябе і дзяржаўнага бюджэту.

Часам ад гэтай турыстычнай неадукаванасці робіцца забаўна. Памятаю, як сам ездзіў па Віцебскай вобласці з калегам Глебам Лабадзенкам. Той літаральна прымусіў мяне завітаць у вёску Сар'я Верхнядзвінскага раёна. А там — шыкоўны храм у стылі рэтраспектыўнай готыкі. Стаялі пад даждж ом — вачэй не маглі адвесці. Аказалася, што і пра Сар'ю, і пра суседнюю вёску Росіца ведаў нават легендарны Папа Рымскі Ян Павел Другі. Гэта ён даваў згоду на тое, каб узвесці да славы алтара мясцовых святых Юрыя Кашыру і Антонія Ляшчэвіча, якія ў Другую сусветную вайну не пагадзіліся заставацца жывымі, калі фашысты спальвалі мясцовых жыхароў...

Пра прыгажосць Успенскага храма ў Сар'і ведаюць замежныя хрысціянскія іерархіі. Але мала хто з беларусаў бачыў святыню жыўцом.

Як вы думаеце, ці ёсць у Беларусі мясціны, куды пры належным падыходзе ламануцца турысты? Знайсці хітовыя турыстычныя пункты можна ў розных рэгіёнах. Я дык увесь час злуюся — чаму дагэтуль наш турыстычны рынак «ляжыць», а бюджэт недаатрымоўвае грашовыя сродкі!

Яўген ВАЛОШЫН.

НЕСПРЫЯЛЬНЫЯ ДНІ І ГАДЗІНЫ Ў ЖНІЎНІ

2, панядзелак, *3.00—7.00*
4, серада, *11.30—16.00*
6, пятніца, *20.00—21.00*
7, субота, *17.30—23.00*
8, нядзеля, *1.00—22.00*
10, аўторак, *18.00—22.00*
12, чацвер, *0.00—21.00*
14, субота, *19.00—23.00*
19, чацвер, *13.00—15.00*
22, нядзеля, *0.00—2.00*
24, аўторак, *7.30—13.00*
27, пятніца, *1.00—3.00*
29, нядзеля, *8.00—13.30*

ВУЧЭННІ Ў АЭРАПОРЦЕ

Вучэбную контртэрарыстычную аперацыю па вызваленні закладнікаў і нейтралізацыі тэрарыстаў, якія захапілі самалёт і аўтобус, правялі на тэрыторыі Нацыянальнага аэрапорта «Мінск» Камітэт дзяржаўнай бяспекі, Міністэрства ўнутраных спраў і Міністэрства па надзвычайных сітуацыях пры садзейнічанні Службы авіяцыйнай бяспекі аэрапорта. Упершыню падраздзяленні двух сілавых ведамстваў КДБ і МУС дзейнічалі адначасова на розных участках пры адзінай каардынацыі Антытэрарыстычнага цэнтра.

Як паведамілі ў Цэнтры інфармацыі і грамадскіх сувязяў КДБ, беларусы першымі пачалі праводзіць падобную контртэрарыстычную аперацыю. Раней лічылася, што гул і вібрацыя лайнера не дазваляюць незаўважна пранікнуць на борт. Група «Альфа» КДБ Беларусі штурмавала самалёт, які знаходзіўся ў руху на ўзлётнай паласе, нейтралізавала «тэрарыстаў» і вызваліла «закладнікаў». Адначасова спецыяльны атрад хуткага рэагавання МУС перахапіў «тэрарыстаў», якія перамяшчаліся на рэйкавым пасажырскім аўтобусе. У зламыснікаў не было шанцаў зарыентавацца і адрэагаваць на сітуацыю. Усе яны былі затрыманы. Да эвакуацыі ўмоўных закладнікаў і тушэння пажару падключыліся супрацоўнікі МНС.

Ацэначная камісія Міжнароднай арганізацыі грамадзянскай авіяцыі ў галіне забеспячэння авіяцыйнай бяспекі высока ацаніла магчымасці сілавых ведамстваў у правядзенні аперацыі.

Святлана БАРЫСЕНКА.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ПРАВА ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ ПОМЕЩЕНИЙ, НАХОДЯЩИХСЯ В РЕСПУБЛИКАНСКОЙ СОБСТВЕННОСТИ

Аукцион состоится 31 августа 2010 г. в 11.05 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 62, к. 106.

Организатор аукциона: фонд «Могилевоблимущество», 212030, г. Могилев, ул. Первомайская, 62, тел. 8(0222) 229022, 311185, 223375.

Продавец права заключения договора аренды недвижимого имущества: РУП «Белпочта», тел. 8(0222)253549, 8(017)2260173, 2261170.

Заявления с прилагаемыми к ним документами принимаются ежедневно в рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 62, к. 104. Последний день приема заявлений на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами **27 августа 2010 г. до 17.00.** Заключительная регистрация участников аукциона **31 августа 2010 г. с 10.00 до 10.50.**

№ лота	Сведения о предметах аукциона				
	Информация о недвижимом имуществе		Начальная цена продажи права заключения договора аренды недвижимого имущества, тыс. руб.	Срок аренды недвижимого имущества, лет	Сумма задатка, тыс. руб.
	Наименование и краткая характеристика	Место нахождения			
1	Помещение, размещенное на 4 этаже здания городского узла связи площадью 13,57 кв.м	г. Бобруйск, ул. Минская, д. 21	118,738	5	11,0
2	Помещение, размещенное на 4 этаже здания городского узла связи площадью 11,49 кв.м	г. Бобруйск, ул. Минская, д. 21	100,538	5	10,0
Краткая характеристика площадей по лотам №№ 1 и 2: здание телефонизировано, имеет электроснабжение, центральное отопление, водоснабжение, канализацию, находится в центре города.					
3	Помещение, размещенное на 2 этаже здания районного узла почтовой связи площадью 12,7 кв.м	г. Могилев, ул. Челюскинцев, д. 149	111,125	5	11,0
4	Помещение, размещенное на 2 этаже здания районного узла почтовой связи площадью 12,1 кв.м	г. Могилев, ул. Челюскинцев, д. 149	105,875	5	10,0
5	Помещение, размещенное на 2 этаже здания районного узла почтовой связи площадью 23,0 кв.м	г. Могилев, ул. Челюскинцев, д. 149	201,250	5	20,0
Краткая характеристика площадей по лотам №№ 3–5: здание телефонизировано, имеет электроснабжение, центральное отопление, водоснабжение, канализацию, находится в удалении от центра города.					
6	Помещение, размещенное на 1 этаже здания склада материально-технического снабжения площадью 192,9 кв.м	г. Могилев, ул. Челюскинцев, д. 178а	1687,875	5	168,0
7	Помещение, размещенное на 1 этаже здания склада материально-технического снабжения площадью 15,1 кв.м	г. Могилев, ул. Челюскинцев, д. 178а	132,125	5	13,0
8	Помещение, размещенное на 1 этаже здания склада материально-технического снабжения площадью 37,0 кв.м	г. Могилев, ул. Челюскинцев, д. 178а	323,750	5	32,0
9	Помещение, размещенное на 1 этаже здания склада материально-технического снабжения площадью 13,1 кв.м	г. Могилев, ул. Челюскинцев, д. 178а	114,625	5	11,0
10	Помещение, размещенное на 1 этаже здания склада материально-технического снабжения площадью 9,6 кв.м	г. Могилев, ул. Челюскинцев, д. 178а	84,000	5	8,0
11	Помещение, размещенное на 1 этаже здания склада материально-технического снабжения площадью 24,4 кв.м	г. Могилев, ул. Челюскинцев, д. 178а	213,500	5	21,0
12	Помещение, размещенное на 1 этаже здания склада материально-технического снабжения площадью 67,1 кв.м	г. Могилев, ул. Челюскинцев, д. 178а	587,125	5	58,0
13	Помещение, размещенное на 1 этаже здания склада материально-технического снабжения площадью 66,1 кв.м	г. Могилев, ул. Челюскинцев, д. 178а	578,375	5	57,0
Краткая характеристика площадей по лотам №№ 6–13: здание имеет электроснабжение, центральное отопление, находится в удалении от центра города.					

Задаток перечисляется на расчетный счет фонда «Могилевоблимущество» № 3642900001315 в филиале № 700 – Могилевское областное управление ОАО «СБ «Беларусбанк», код 536, УНП 700052050.

Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в фонд «Могилевоблимущество» подается заявление на участие в аукционе, к которому прилагаются следующие документы:

юридическим лицом резидентом Республики Беларусь – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица; копия платежного поручения о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона;

юридическим лицом нерезидентом Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; копия платежного поручения либо иного документа о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона;

индивидуальным предпринимателем – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию индивидуального предпринимателя; копия платежного поручения о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона;

физическим лицом – копия платежного документа о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона.

При подаче документов организатору аукциона предъявляются:

представителем физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность данного представителя;

физическим лицом – документ, удостоверяющий личность.

Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Датой поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, перечисленные выше, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды зданий, сооружений и помещений, находящихся в республиканской собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 8 августа 2009 г. № 1049.

Победитель аукциона в течение 3 рабочих дней со дня его проведения обязан в установленном порядке перечислить на текущий (расчетный) счет арендодателя сумму, за которую продан предмет аукциона, за вычетом внесенной им суммы задатка, а также возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение.

Цена продажи предмета аукциона не засчитывается в арендную плату, подлежащую уплате в соответствии с законодательством.

Победитель аукциона приобретает право заключения договора аренды после оплаты стоимости предмета аукциона и возмещения затрат на организацию и проведение аукциона.

МИНСКИЙ РАЙОННЫЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ *31 августа 2010 г.* ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН ПО ПРОДАЖЕ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ В ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ ГРАЖДАН РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ В МИНСКОМ РАЙОНЕ

		Лот 1	Лот 2	Лот 3	Лот 4	Лот 5
1	Адрес земельного участка	Сеницкий с/с, д. Атолино, участок № 59	Сеницкий с/с, д. Атолино, участок № 60	Горанский с/с, д. Тейки	Самохваловичский с/с, д. Слобода, участок № 174	Боровлянский с/с, д. Дроздово, У-77
2	Кадастровый номер	623686600601000521	623686600601000520	623681317601000011	623686304601000532	623680602601000846
3	Площадь земельного участка	0,1513 га	0,1482 га	0,1647 га	0,1372 га	0,1489 га
4	Целевое назначение	Для строительства и обслуживания жилого дома	Для строительства и обслуживания жилого дома	Для строительства и обслуживания жилого дома	Для строительства и обслуживания жилого дома	Для строительства и обслуживания жилого дома
5	Расходы по подготовке документации (рублей)	1 489 540	1 562 520	334 000	880 187	1 320 260
6	Начальная цена земельного участка (рублей)	19 000 000	18 000 000	7 000 000	12 000 000	95 000 000
7	Задаток (рублей)	1 700 000	1 700 000	600 000	1 100 000	9 000 000

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, д. 8. Дата проведения: 31.08.2010 г. в 9.00. Заявления на участие и необходимые документы принимаются с 9.00 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, д. 8, к. 416. Окончание приема заявлений и документов 18.08.2010 г. Контактные телефоны: (8 025) 92 761 92, 204 11 62, 204 35 25.

Задаток на участие в аукционе на Лоты 1–2 перечисляется на расчетный счет Сеницкого сельисполкома № 3600621160189 в филиале 614 АСБ «Беларусбанк» г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600052409, ОКПО 04432966, код платежа – 04901.

На Лот 3 – на расчетный счет Горанского сельисполкома № 3600621020043 в филиале 614 АСБ «Беларусбанк» г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600537220, код платежа – 04901.

На Лот 4 – на расчетный счет Самохваловичского сельисполкома № 3600621150173 в филиале 614 АСБ «Беларусбанк» г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600052424, ОКПО 04430482, код платежа – 04901.

На Лот 5 – на расчетный счет Боровлянского сельисполкома № 3600621010037 ГУ МФ РБ по Минской области, филиал АСБ «Беларусбанк», ул. Карбышева, 13/2, г. Минск, УНП 600052345, код платежа – 04901.

К участию в аукционе допускаются физические лица, подавшие в комиссию в указанные сроки соответствующее заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в объявлении расчетный счет задаток.

Все желающие могут ознакомиться с документацией и земельными участками в соответствующем сельисполкоме.

Аукцион признается несостоявшимся в случаях, если: ни один из участников аукциона после трехкратного объявления первой объявленной цены не поднял аукционный номер; ни один из участников аукциона в соответствии с решением комиссии не был признан победителем; заявление об участии в аукционе подано менее чем двумя участниками аукциона (в этом случае, местный исполнительный комитет в течение 10 рабочих дней после признания аукциона несостоявшимся принимает решение о предоставлении единственному участнику земельного участка в частную собственность. В течение 10 рабочих дней со дня принятия указанного решения гражданин обязан внести плату за земельный участок в размере его начальной цены, увеличенной на 5 %, возместить расходы, связанные с подготовкой аукциона и документации, необходимой для его проведения, и выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона).

Документы, необходимые для участия в аукционе:

1. Заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков.

2. Заверенные банком копии платежных поручений о внесении задатка на расчетный счет.

3. Гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования (ксерокопия паспорта);

3.1 представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь, а представители граждан – документ, удостоверяющий личность.

Спяваеце фолк? Вас запрашае «Камяніца»!

Не менш за дзве тысячы гледачоў плануе сабраць сёлета другі па ліку фолк-фэст «Камяніца». Мерапрыемства, запланаванае на 4 верасня, будзе арганізавана ў Музеі народнай архітэктуры і побыту ў в. Азярцо Мінскага раёна.

— ...Летась мы хутчэй спрабавалі свае сілы, таму гэтым разам павінны ўсё зрабіць яшчэ лепш, — прызнаецца **каардынатар фестывалю Сяргей ЧЫГРЫНЕЦ**. — Прычым лепш на ўсіх узроўнях, ад транспарту да музычнай праграмы. Акрамя нашых знакамітасцяў (сёлета гэта этна-трыа «Троіца» і гурт «Палац») на фэсце будуць і іншыя дастаткова вядомыя гурты. Але галоўнае — мы шукаем новыя таленты.

Свае запісы і прапановы арганізатары просяць дасылаць да 15 жніўня на электронную скрыню kamyanitsa@gmail.com. Папярэдняя рэгістрацыя і дадатковая інфармацыя на сайце мерапрыемства fest.kamyanitsa.by. Даведкі па тэлефонах: (029) 610 13 30, (017) 507 69 37.

— Дасылаць заяўкі могуць не толькі маладыя выканаўцы, якія хочуць выступіць на «Камяніцы», але і ўсе зацікаўленыя — пры ўмове, што ў іх ёсць вартыя прапановы па арганізацыі фолк-фэсту, — дадае Чыгрынец.

Ілья ЛАПАТО.

Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ ОБ АУКЦИОНЕ ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

Наименование	Характеристика
ЛОТ 1	
Автомобиль МАЗ-54329	Грузовой седельный тягач, инвентарный номер СЛ-644
Начальная цена продажи	6 702 969 белорусских рублей без учета НДС.
Сумма задатка	335 148 белорусских рублей.
Местонахождение объекта	Гродненская область, г. Слоним, ул. Озерная, 20
ЛОТ 2	
Автомобиль МАЗ-54323	Седельный тягач, инвентарный номер 952
Начальная цена продажи	9 741 329 белорусских рублей без учета НДС.
Сумма задатка	487 066 белорусских рублей.
Местонахождение объекта	Гродненская область, г. Волковыск, ул. Октябрьская, 153
ЛОТ 3	
Автомобиль МАЗ-437040	Грузовая платформа, тентованный, инвентарный номер 1451
Начальная цена продажи	4 102 722 белорусских рубля без учета НДС.
Сумма задатка	205 136 белорусских рублей.
Местонахождение объекта	Гродненская область, г. Волковыск, ул. Октябрьская, 153
ЛОТ 4	
Автомобиль МАЗ-54323	Грузовой седельный тягач, инвентарный номер 913
Начальная цена продажи	9 741 330 белорусских рублей без учета НДС.
Сумма задатка	487 066 белорусских рублей.
Местонахождение объекта	Гродненская область, г. Сморгонь, ст. Солы
ЛОТ 5	
Седельный тягач МАЗ 64229	Инвентарный номер 5052
Начальная цена продажи	7 649 375 белорусских рублей без учета НДС.
Сумма задатка	382 469 белорусских рублей.
Местонахождение объекта	Гродненская область, г. Гродно, ул. Дзержинского, 96
ЛОТ 6	
Полуприцеп-цистерна ППЦ 22/4 9397	Инвентарный номер 951
Начальная цена продажи	14 991 814 белорусских рублей без учета НДС.
Сумма задатка	749 591 белорусский рубль.
Местонахождение объекта	Гродненская область, г. Волковыск, ул. Октябрьская, 153
ЛОТ 7	
Полуприцеп-цистерна ППЦ 96742	Инвентарный номер 916
Начальная цена продажи	2 246 636 белорусских рублей без учета НДС.
Сумма задатка	112 332 белорусских рубля.
Местонахождение объекта	Гродненская область, г. Сморгонь, ст. Солы
ЛОТ 8	
Автомашина ГАЗ 3307	Грузовая платформа, инвентарный номер 8027
Начальная цена продажи	1 549 376 белорусских рублей без учета НДС.
Сумма задатка	77 469 белорусских рублей.
Местонахождение объекта	Гродненская область, г. Гродно, ул. Дзержинского, 96
ЛОТ 9	
Автомашина УАЗ-3909	Грузопассажирский фургон, инвентарный номер 5046
Начальная цена продажи	1 416 899 белорусских рублей без учета НДС.
Сумма задатка	70 845 белорусских рублей.
Местонахождение объекта	Гродненская область, г. Гродно, ул. Дзержинского, 96
Продавец	Республиканское дочернее унитарное предприятие по обеспечению нефтепродуктами «Белоруснефть-Гроднооблнефтепродукт», 230005, г. Гродно, ул. Дзержинского, 96
Организатор торгов	Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 41 98 32, 41 98 34
Условия аукциона	Аукцион без условий
Условия оплаты	По договоренности сторон
Срок заключения договора купли-продажи	Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов
Номер р/с для перечисления задатка	Р/с 3012286350011 отделение № 201 г. Гродно ГФ по Гродненской области ОАО «Белинвестбанк», код банка 152101705, УНП 500833225

Аукцион состоится 31 августа 2010 г. в 11.00 по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209

К участию в аукционе допускаются негосударственные юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами:

- заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;
- негосударственным юридическим лицом – доверенность, выданная представителю негосударственного юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), нотариально удостоверенные копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации;
- индивидуальным предпринимателем – нотариально удостоверенная копия свидетельства о государственной регистрации;
- иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с нотариально удостоверенным переводом на белорусский (русский) язык;
- представителем иностранного юридического лица – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально удостоверенным переводом на белорусский (русский) язык;
- представителем индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе представители негосударственных юридических лиц Республики Беларусь, представители иностранных инвесторов предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе.

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30.

Последний день приема заявлений – 30 августа 2010 г. до 15.00

Телефоны для справок: 41 98 32, 41 98 34 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки».

Каб «радавое гняздо» не стала раскіданым

Карэспандэнт «Звязды» пазнаёмілася з дынастыяй Клындзюкоў, агульны стаж якой у сельскай гаспадарцы — больш за 600(!) гадоў

Павел Кузьміч і Марыя Лявонцьеўна Клындзюкі ўсё свядомае жыццё прысвяцілі мясцоваму калгасу і роднай вёсцы Дамавіцк. Па іх слядах пайшлі ўсе як адзін дзеці і пляменнікі. Працуюць у падсобнай сельскай гаспадарцы «Дамавіцкі» ААТ «Мінскі падшыпнікавы завод» хто механізатарам, хто ветурачом, хто заатэхнікам, хто інжынерам... А вось унукі ў пераважнай большасці падаліся ў горад... Як бы сумна гэта ні было, але працяг аграрнай дынастыі Клындзюкоў пад сумненнем...

Дзеці і нявесткі, якія дзеля сустрэчы з карэспандэнтам «Звязды» адпрасіліся з працы, чакалі мяне ля бацькоўскай хаты, побач з якой месціцца каларытны калодзеж-журавель. Старэйшая дачка Ніна Клындзюк па-майстэрску набрала паўнюткае вядро вады і з парога прапанавала мне спатоліць смагу. Смачнейшай вады, шчыра прызнаюся, піць яшчэ не даводзілася!..

Па ваду да бацькоўскага калодзежа прыязджаюць нават з суседніх вёсак.

«І цяпер не хачу таго горада»

— Да нас па ваду нават з суседняй вёскі прыязджаюць, прыязджайце і вы, — усміхаецца Вольга Клындзюк, якая вось ужо трэці год разам з мужам Яўгенам гаспадарыць у хаце свёкра і свекрыві, і пры гэтым напаўняе мне ў дарогу бутэльку калодзежнай вады.

Вольга прыехала на працу ў Дамавіцк з Чэрвеня 25 гадоў таму. Першым часам жыла на кватэры ў брата мужа Колі Клындзюка. Там і пазнаёмілася з Яўгенам. Хутка ў іх закруціўся раман, неўзабаве згулялі вяселле.

— Адразу пасля вяселля я пачала ўгаворваць мужа пераехаць жыць у Чэрвень. Там можна было размясціцца ў бацькоўскай трохпакаёвай кватэры. Але Яўген, не вагаючыся, адказаў, што ён ад бацькоўскага дома ні на крок не ад'едзе. Я не стала пярэчыць, і мы пераехалі жыць да бацькоў мужа. Дарэчы, менавіта свякруха і навучыла мяне, гараджанку *(смяецца)*, карову даіць.

— Вольга, ваш муж багаты на братоў і сясцёр. Ці ўзнікалі спрэчкі пасля таго, як не стала бацькоў, наконт таго, каму дастанецца бацькоўская хата?

— Ды не, што вы. У свой час усе тут патроху пажылі. А цяпер ужо кожны свой кут мае. Коля сам пабудаваў сабе дом, Зіна таксама, Ніне ж з мужам за дбайную працу гаспадарка восем гадоў таму выдзеліла адзін з чатырох «прэзідэнцкіх» дамкоў.

— Усе жывяце ў адной вёсцы, працуеце ў адной гаспадарцы... Няўжо ніколі не хацелася паехаць у горад? Альбо бацькі не пусцілі?

— Колькі сябе памятаю, разам з братамі і сёстрамі хадзіла на ферму і дапамагала маці раздаваць кармы, карміць цялятак. Ды і дома на пару са старэйшым братам Колем даілі кароў, каб маці было лягчэй. А пасля школы чамусьці стрэльнула ў галаву паступаць у мінскае вучылішча, — з усмешкай узгадвае Ніна Паўлаўна. — Паступіць паступіла, але праз месяц зразумела, што горад не для мяне, і вярнулася ў Дамавіцк. Адразу ж уладкавалася даяркай у гаспадарку, хутка 30 гадоў будзе, як працую на ферме. Каб сказаць, што аб нечым шкадую, дык не. І цяпер не хачу таго горада. Мне дома лепш і спакайней за ўсё.

— Ды і так атрымалася, што хлопцаў пакахалі мясцовых, — падміргвае сястры Зінаіда Паўлаўна. — Яны нас, такіх прыгажунь, нікуды і не адпусцілі *(смяюцца)*.

— А вы, Мікалай Паўлавіч, што скажаце? — цікаўлюся ў прадстаўніка моцнай паловы Клындзюкоў.

— А ў мяне, у адрозненне ад сясцёр, і думак такіх, каб пакінуць тут бацькоў, не было. Як прыйшоў з арміі, адразу і пайшоў у памочнікі камбайнера. Неўзабаве выдзелілі гусенічны трактар. І да сённяшняга дня я на ім працую. Праўда, на днях замовілі ў Мінску спецыяльна для мяне трактар, хоць і не новы, але ўсё ж лепшы, чым той, на якім езджу.

— Я, шчыра прызнацца, і не ўяўляю, як бы мой Коля жыў у горадзе без Зосі і Машы — гэта нашы козы, без рыбалкі, лесу, — уступае ў размову яго жонка Тамара, якая працуе ў гаспадарцы галоўным заатэхнікам.

— Што праўда тое праўда, на рыбе я памяшаны, — прызнаўся Мікалай Клындзюк. — Што самае цікавае, падабаецца менавіта сам працэс лоўлі. Рыбы ж я зусім не ем. А вось унук вельмі яе любіць, асабліва сушаную. Не паспее прыехаць, адразу просіць: «Дзеда, палупі мне рыбку».

Мікалай Паўлавіч не толькі заўзяты рыбак, ён, як выдасца вольная хвіліна, не супраць і па грыбы схадзіць.

— Апенькі штогод нашы першыя, — з гонарам кажа Тамара Клындзюк. — Коля ведае ўсе грыбныя месцы ў наваколлі. Але мяне з сабой у лес не бярэ, бо я, маўляў, такая дабрачка, магу тыя багатыя на грыбы месцы каму-небудзь паказаць *(смяецца)*. Коз муж таксама мне не давярае. Сам іх даглядае, доіць.

Зоська і Машка пасяліліся ў Клындзюкоў пасля таго, як ва ўнука з'явілася алергія на каровіна малако.

— Ужо пару месяцаў п'е казінае малако, і, дзякуй Богу, дзіця чысценькае. Але акрамя дзяцей гэта малако ў нас нікому не падабаецца, таму, калі малыя ў Мінску, выліваем яго свінням.

— А ў іншую, больш перспектыўную, гаспадарку не было думкі паехаць?

— Ды ну, — адначасова заматалі галавой Клындзюкі, — там чужыя людзі... А тут куды ні кінь вокам — паўсюль сваякі.

«Мы адно аднаго ў крыўду не дадзім»

Вёска Дамавіцк працэнтаў на 35 складаецца з Клындзюкоў. Жывуць родныя, стрыечныя і траюрадныя браты і сёстры і іх сем'і дружна. І ў горы, і ў радасці — яны заўсёды разам.

— Падтрымліваем адно аднаго, як можам, — кажа Ніна Паўлаўна. — Так здарылася, што ў маладым узросце загінула наша родная сястра, яе маленькі сын застаўся сіратой. Зіна ўзяла Дзіму да сябе і выхоўвала пляменніка, як роднага сына.

— Я таксама заўсёды, калі ў гэтым была патрэба, адчувала падтрымку сваякоў мужа, — кажа Вольга Клындзюк. — Свякруха дапамагала выхоўваць дзяцей. А калі я трапіла ў бальніцу пасля родаў, месячнага Паўліка глядзела Зіна. Добра, безумоўна, што мы тут жывём разам, дапамагаем адно аднаму, калі справай, а калі і словам.

— Я ведаю нямала прыкладаў, калі нават родныя браты і сёстры жывуць як кот з сабакам ці наогул не кантактуюць... Магчыма, у вашых сем'яў ёсць нейкі сакрэт гарманічных адносінаў?

— Нам маці часта паўтарала: «Дзеткі, трымайцеся разам, тады вам нічога не будзе страшна, і ніколі не давайце адно аднаго ў крыўду». Гэта мудрыя словы. Нас бацькі выхоўвалі жаласлівымі, нясквапнымі і працалюбівымі. Як школьнікамі былі, летам не сядзелі без справы. Хадзілі на працу ў калгас. Зерне сушылі, карчы збіралі, сянаж нарыхтоўвалі... Акрамя таго, збіралі буякі, маліны і здавалі на грошы. На зарплату набывалі школьную форму, падручнікі, іншыя школьныя прыналежнасці. Памятаю, пачастуе нехта цукеркамі, дык колькі іх ні было б, заўсёды дзялілі па-брацку на ўсіх. Маці ўсё жыццё шкадавала нас. Калі ні прыйду, суне цукерку. Я смяялася: «Мама, не трэба, што я, дзіця малое». Няма бацькоў, шкада. Тата памёр 15 гадоў таму, ужо трэці год пайшоў, як не стала маці...

«Хочацца, каб і тут нешта змянілася да лепшага»

Ва ўсіх дзяцей Клындзюкоў па два-тры дзіцяці. Практычна ўсе ўжо дарослыя, у некаторых — свае дзеці. Але большасць з іх памянялі родную вёску на горад.

— З родных толькі мой Сашка ў гаспадарцы застаўся працаваць. Ужо пяць гадоў як працуе на трактары. Яны з нявесткай падарылі мне ўжо аднаго ўнучка Мікіту, цяпер чакаем чарговага папаўнення ў доме. Дачка ж у Мінску працуе. Калі прыязджае, дапамагае па гаспадарцы. Але ў вёсцы жыць не хоча.

Не гараць жаданнем вяртацца ў «радавое гняздо» і іншыя маладыя Клындзюкі. Напрыклад, сын Яўгена і Вольгі вучыцца ў Чэрвені на сталяра, там жа праходзіць практыку.

— Першую палучку атрымаў, дык апрануўся з іголачкі: набыў джынсы, вятроўку ды майку мадняцкую. Ганаруся сынам, грошы не пускае на вецер, ні на курыва, ні на гарэлку. Дачка Марыя вучыцца ў 11-м класе. У яе такія планы, што мне нават страшна. У Акадэмію МУС плануе паступаць.

— Больш як па 30 гадоў мы тут усе прапрацавалі, хочацца, каб нешта змянілася да лепшага, — уздыхае Любоў Іванаўна, жонка стрыечнага брата Клындзюкоў. — Каб школа была, садок, новая крама, новыя жыхары... Аджывае вёска... Праз колькі гадоў мы на пенсію пойдзем, і не будзе каму працаваць. Маладыя спецыялісты гаспадарцы вельмі патрэбныя, але хто сюды паедзе, калі жыллё не будуецца з таго часу, як мы адышлі да інвестараў. Хоць бы па два дамкі ў год будавалі, дык можа б і да нас хто прыехаў альбо ў нашых дзяцей і ўнукаў з'явіўся стымул тут застацца.

Надзея ДРЫЛА, фота аўтара.

Чэрвеньскі раён.

Крымінал

ТРЭНЕРЫ ПА ДЖЫУ-ДЖЫТСУ ЗАЙМАЛІСЯ РАЗБОЕМ НА МАГІЛЁЎШЧЫНЕ

Пракуратура Магілёўскай вобласці накіравала ў суд крымінальную справу, якая заведзена ў дачыненні да двух трэнераў па джыу-джытсу. Жыхары Гомеля і Гомельскага раёна абвінавачваюцца ў здзяйсненні шэрагу асабліва цяжкіх злачынстваў.

Падчас расследавання ўстаноўлена, што заснавальнік і старшыня Беларускага рэспубліканскага грамадскага аб'яднання «Джыу-джытсу і самаабарона» (крымінальнае пераследаванне ў дачыненні да яго спынена сёлета ў красавіку ў сувязі са смерцю) у чэрвені 2009 года стварыў і ўзначаліў узброеную банду. У яе склад увайшлі і два трэнеры-выкладчыкі.

З 25 ліпеня да 12 верасня мінулага года яны арудавалі на тэрыторыі Магілёўскай вобласці. Каб завалодаць аўтамабілямі, нападалі на людзей, здзяйснялі замахі на забойства. Мяркуецца, што і забойствы з выкарыстаннем агнястрэльнай зброі грамадзян Расіі і Малдовы — справа рук трэнераў па джыу-джытсу.

Сваімі дзеяннямі банда нанесла ўрон на суму звыш 138 мільёнаў рублёў. Падчас следства ён часткова кампенсаваны. На маёмасць, якая належыць злачынцам, накладзены арышт. Працэс па справе пройдзе ў Магілёўскім абласным судзе.

19-ГАДОВАЯ КІРОЎЦА НАЕХАЛА НА 4-ГАДОВАГА ХЛОПЧЫКА

Менш чым праз тыдзень пасля ДТЗ дзіця памерла ў бальніцы.

Няшчасце «прагрымела» ў вёсцы Добрыца Кіраўскага раёна. Мясцовая жыхарка са стажам кіроўцы менш за адзін год, ехала на аўтамабілі бацькі «Сузукі Свіфт». Неўзабаве на праезную частку выбег, убачыўшы на супрацьлеглым баку дарогі сяброў, маленькі хлопчык.

— Маці пацярпелага знаходзілася ў гэты час на працы, а бабуля, якая засталася за няньку, была ў доме, — паведаміў **начальнік службы прафілактыкі і прапаганды бяспекі дарожнага руху спецыяльнага падраздзялення ДПС «Страла» МУС Яўген ЛАПЕЦ**. — Хлопчык з чэрапна-мазгавой траўмай, ударам і гематомамі галаўнога мозгу, шматлікімі раванімі быў шпіталізаваны ў хірургічнае аддзяленне Кіраўскай цэнтральнай раённай бальніцы, дзе праз няпоўных шэсць дзён памёр.

Надзея ДРЫЛА.

Свая справа

ПАЛЬМЫ ПАД АГУРКАМІ

СЛАЎГАРАДСКАЯ гаспадыня кінула выклік традыцыйным для Магілёўшчыны шклоўскім агуркам. Жанна Антонава і пакупнікі яе прадукцыі ўпэўненыя: слаўгарадскія агуркі — не горшыя!

Гаспадыня слаўгарадскіх агуркоў.

Гарачыя цяпліцы

Жанна і яе сям'я жывуць ў раённым цэнтры на вуліцы Калгаснай. Падсобная гаспадарка, якая спецыялізуецца на вырошчванні агародніны, займае ўвесь невялікі зямельны ўчастак. На 19 сотках размясціліся 3 цяпліцы — для агуркоў, таматаў і расады. Але кожны кавалак зямлі тут заняты карыснымі раслінамі: перцамі, баклажанамі, нават базілікам.

З апошняй зёлкі, горача любімай італьянцамі, у сёлетнім спякотным сезоне дасведчаныя слаўгарадцы робяць ахаладжальны напой. Зусім не лішні сродак супраць спёкі, таму што пад сонцам у цяпліцы ў нязвыклых гасцей ногі адразу становяцца ватнымі, агуркі ды таматы плывуць перад вачыма.

— Мяне ў спёку ратуе толькі абліванне халоднай вадой, — усміхаецца Жанна. — Таму што сапраўды ў парніку немагчыма трываць гэтыя шалёныя 40 градусаў. Надвор'е вельмі ўплывае на працу: у раслінаў прыпыняецца рост. І нам спякотна, але мы працуем. Збіраць агуркі і таматы падымаемся а 5-й раніцы, увечары паліваем, таму кладзёмся апоўначы.

Жанна — ураджэнка Хоцімшчыны. Шмат гадоў таму яе бацька перавёз у Слаўгарад усю сям'ю: прывабілі яго тутэйшыя мясціны і рака Сож сваёй прыгажосцю. Жанна вывучылася на бухгалтара. Аднойчы, калі рабіла на складзе ў раённай нарыхтоўчай канторы, прымала агуркі са Столінскага раёна. Размаўляла з тамтэйшымі агароднікамі і нібыта заразілася, сама вырашыла паспрабаваць заняцца вырошчваннем агародніны.

— Мне 37 гадоў. Першая цяпліца з'явілася ў нас гадоў 6 таму, — расказвае Жанна. — З цягам часу давялося вызначыцца: служба ці свая справа. І асабістае пераважыла, бо мы выдаткавалі сямейныя грошы і не варта было спыняцца. Дарэчы, я не маю спецыяльнай адукацыі. Самавучка. Таму кожны, хто хоча, можа навучыцца і працаваць.

«Пасаліма» па-слаўгарадску

У цяпліцах — вялізныя расліны, вышэйшыя за рост чалавека. Пачаўся сезон таматаў: у важкіх зялёных гронках праглядаюць чырвоныя плады.

— З адной гронкі можна сабраць да кілаграма таматаў, а на расліне 6 гронак, — каментуе Жанна. — Цяпер мы прадаём таматы па 3500 рублёў, але кошт штодня мяняецца. Агуркі сёння каштуюць 800 рублёў за кілаграм.

На рынку ў абласным цэнтры ўсе агуркі рэкламуюцца толькі як шклоўскія. Горад Шклоў нездарма называюць агурковай сталіцай, і жыхары Магілёўшчыны ўпэўненыя, што яны там самыя смачныя. Антонава пераканала сваіх пакупнікоў, што слаўгарадскія агуркі не саступаюць шклоўскім.

— Спачатку многія сумняваліся, перапытвалі: а ці сапраўды слаўгарадскія, а можа набылі ў Шклове і перапрадаяце, — расказвае гаспадыня. — А цяпер ужо скарыліся. Мы вырошчваем смачныя агуркі галандскіх гатункаў, якія карыстаюцца попытам.

Ёсць у гаспадарцы Антонавай месца і для эксперыментаў. Напрыклад, пасярод таматаў растуць агуркі італьянскага гатунку «палерма». Нягледзячы на свой пагражальны ў сэнсе памераў выгляд, гэтыя салатныя агуркі вельмі смачныя і салодкія.

Але нашым людзям сёння больш даспадобы маленькія гурочкі гладкіх гатункаў — такія Антонава і вырошчвае. Слаўгарадскія людзі аддаюць перавагу гатунку «пасаліма», сапраўды аднаму з лепшых гатункаў агуркоў, які падыходзіць і для кансервавання, і для ўжывання ў свежым выглядзе.

Агурок да скваркі

— Самае галоўнае для агародніны — пастаянны догляд, — раскрывае сакрэт сваёй справы агародніца. — Вырасціць расліну — тое ж самае, што выгадаваць дзіця. Пра ўсё трэба паклапаціцца: прафілактыка хваробаў, праполка, паліўка... І для добрага ўраджаю трэба яшчэ і вельмі захацець вырасціць добры ўраджай!

Антонава папярэджвае: усё, што мы бачым у яе гаспадарцы, — напрацоўка некалькіх гадоў. Не ўсё атрымліваецца ў першы год. А аднойчы давялося ўвесь ураджай таматаў страціць: яны проста спякліся, таму што забыліся адчыніць у цяпліцы дзверы.

Цяпер у гэтай падсобнай гаспадарцы — перадавыя тэхналогіі. Дапамаглі ў гэтай справе маладой гаспадыні ў фондзе развіцця сельскіх тэрыторый «Адраджэнне-Агра». Спецыялісты параілі звярнуць увагу на кропельнае арашэнне, а фонд даў пазыку.

— Нам такая тэхналогія спадабалася, — Жанна паказвае на шланг, які працягнуўся ўздоўж усіх градаў. — Тут пад кожны канкрэтны куст ідзе паліў. Гэта насамрэч вялікая эканомія часу і вады. Для ўкаранення спатрэбілася больш за мільён рублёў, але грошы мы даўно вярнулі, а тэхналогіяй вельмі задаволеныя.

У сезон у гаспадарцы Антонавай сабрана каля 5 тон агуркоў, пачынаючы ад самых ранніх веснавых. Усё прадавалі без астаткаў на слаўгарадскім рынку.

— Нават калі нешта і застанецца, то мы скормім агародніну нашай жывёле: цяпер у нас з'явіліся свінні, куры і качкі, — не хвалюецца за збыт Жанна. — Каб да агурка былі кумпячок і скварка.

12-гадовы пальмавод

Натуральна, што адна Жанна, пры ўсім сваім жаданні і спартыўным выглядзе, ніколі б не справілася з такой гаспадаркай. Памочнік — гэта, безумоўна, муж, які цяпер працуе вадзіцелем на жніве па камандзіроўцы свайго прадпрыемства. А таксама дзеці: студэнтка Вікторыя і школьнік Антон.

— У цяпліцы працаваць цяжка, мне больш даспадобы гандляваць на рынку сваёй прадукцыяй, — прызнаецца дзяўчына. — Увогуле, калі з'явіліся цяпліцы, мы былі яшчэ малыя. Усё гэта было нечакана, але з цягам часу мы сталі маці дапамагаць. Робім усё, што трэба, і яна нас заахвочвае: з прыбыткаў нам прыдбалі добрыя мабільныя тэлефоны.

Праўда, Вікторыя выбрала сабе прафесію далёкую ад матчных цяпліц. Яна будзе вывучаць інфарматыку і жартуе, што з цягам часу камп'ютарызуе падсобную гаспадарку.

Антону цяпер 12 гадоў, і хлопчык ужо вызначыўся са сваёй будучыняй. Вельмі верагодна, што ў перспектыве ў сям'і ўсё ж такі з'явіцца свой дыпламаваны спецыяліст па раслінах.

— Так, я вельмі хачу стаць аграномам, — радасна пацвердзіў хлопчык.

Антон трымае ў руках гаршкі з невялікімі раслінамі:

— Гэта пальмы, і я іх вырасціў з насення, якое набыў у Магілёве. Вось гэта «Вашынгтонія», а гэта — «Дракон». Калі яны прараслі, гэта было проста цудоўна! Мы зразумелі, што ў нас можна вырошчваць і пальмы, каб потым упрыгожваць дамы.

Кавуновае поле

— У мяне самая вялікая праблема — недахоп часу, — прызнаецца Жанна. — Хочацца шмат зрабіць і давесці да розуму, але мы вельмі загружаныя працай.

Маленькі кавун і дыня, якія даглядае Антон, — гэта правобраз вялікай мары Антонавай і яе сям'і.

— Мы марым пасадзіць цэлае кавуновае поле, — сур'ёзна кажа Жанна. — Летась кавун на нашай градзе выспеў, быў чырвоным і смачным. Не, гэта зусім не жарт: у Беларусі ёсць гаспадаркі, дзе саспяваюць кавуны. Тым болей, калі ў нас цяпер такая цалкам паўднёвая спякота!

Праўда, пакуль гаспадарцы Антонавай няма куды пашырацца — проста банальна не хапае месца. Планы на замарожванне агародніны таксама недзе ў далёкай перспектыве, і ў яе чаканні маці з дачкой актыўна робяць нарыхтоўкі.

— Агуркі солім, марынуем, рэжам на салаты, — паказвае Вікторыя на новы строй слоікаў. — А вось гэта наша фірмовая страва: зялёныя стрэлкі часнаку (іх звычайна абрываюць, каб лепей расла галоўка) прапускаем праз звычайную мясарубку. Атрымліваецца духмяная прыправа для розных страў, асабліва для супоў.

У халодным падвале хаты захоўваецца каля сотні слоікаў.

— Мы самі ядзім і свежую прадукцыю, і кансерваваную, таму што наша агародніна — экалагічна чыстая, усе хімікаты мы выкарыстоўваем мінімальна, — запэўнівае гаспадыня.

Сезон свежай агародніны ў разгары: таматы набіраюць моц, чырванеюць на адкрытым сонцы перцы, у агуркоў пойдзе «другая чарга». Але калі прыйдуць халады (хоць сёння гэта падаецца распаленай працай на спёцы гаспадыні не вельмі рэальнай падзеяй), працоўны сезон у гаспадарцы не завершыцца: узімку Антонава і яе сям'я займаюцца вырошчваннем зялёнай цыбулі.

— Калі працуеш з любоўю, цяжкасці не адчуваеш, — сказала Жанна. — Калі бачыш вынікі сваёй працы, то вочы радуюцца. І душа таксама.

Ілона ІВАНОВА.

Фота Ірыны САВОСІНАЙ.

г. Слаўгарад.

Антон і яго заморскія пальмы.

Пра асвяжальны напой з базіліку і іншых зёлак расказала чытачам «Звязды» **дырэктар мясцовага фонду «Адраджэнне-Агра» Таццяна ГУРЫНА**:

— **Базілік** — гэта вельмі свежая прыправа. Трэба ўзяць маладыя парасткі расліны і 10 хвілінаў варыць іх у вадзе. Потым дадаецца лімоннае кіслата, цукар. Цукру трэба толькі крышачку, каб напой не атрымаўся прытарна салодкім. Астудзіце і піце на здароўе!

Падобныя напоі, ад якіх можна адчуць палёгку ў спякотныя дні, можна рабіць таксама на аснове мяты і мелісы. І ўвогуле эксперыментуйце: я, напрыклад, замест лімоннай кіслаты магу дадаць свежы лімон альбо яблыкі, замест цукру — прыгаршчы чорных парэчак, дарэчы будзе і пару галін рэвеню. Смачна піць!

ПЕРШЫ РАЗ Ў ПЕРШЫ КЛАС: ШТО ПАЧЫМ?

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Канцтавары лепш набываць у крамах. Не думайце, што калі вы будзеце затаварвацца да школы на рынках, то шмат зэканоміце. Кошты адрозніваюцца нязначна (некаторыя тавары ў краме нават танней шыя). Плюс ёсць рызыка набыць няякасныя рэчы. Напрыклад, можа патрапіцца гуаш, якая пеніцца. Аказваецца, бываюць нажніцы, што не рэжуць, ласцікі, што не сціраюць, васковыя крэйды, алоўкі і нават фарбы, якія... не малююць. Дакладней, амаль не малююць — след ад іх ледзьве бачны на паперы, і для дзіцяці, якое будзе бачыць яскравыя малюнкі, што атрымліваюцца ў суседзяў, гэта сапраўдны стрэс. Хоць, падобная прадукцыя можа трапляцца і ў крамах, напрыклад, зараз у многіх ляжаць на прылаўках упрыгожаныя малюнкамі з дыснэеўскіх мульцікаў чамаданчікі, змесціва якіх (фарбы, алоўкі, фламастары, крэйда) якраз такое, немалюючае. І каштуюць гэтыя наборы 35 тысяч. Між іншым, на іх пазначана: «Мэйд ін Кітай».

Але зэканоміць на канцтаварах рэальна магчыма, калі выбіраць на прылаўках самае таннае. Часам аднолькавыя па прызначэнні рэчы могуць розніцца ў два і больш разоў па цане. Так, лічыльныя палачкі могуць каштаваць 580 і 1200 рублёў, лінейка 290 і 540, пенал 4190 і 20490, пластылін 2720 і 5750, набор каляровых алоўкаў 4300 і 11490, папка для сшыткаў 1030—6340, нажніцы 2650 і 4660, пластылін 2720 і 5750, просты аловак 360 і 2280. Магчыма, вы не хочаце набываць дзіцяці ўбогі пенал? Але навошта пераплачваць за яркія вокладкі для каляровай паперы і кардона?

ДРУГІ: ЗАПЛЕЧНЫ

У продажы я сустракала заплечнікі коштам ад 40 да 120 тысяч. Асабіста мне спадабаўся ранец за 56490. Праўда, ён не такі кідкі, як тыя, што каштуюць каля 80-100 тысяч, але дарагія заплечнікі з усімі іх «наваротамі» вельмі цяжкія. Дарэчы, самымі лёгкімі аказаліся ранцы беларускай вытворчасці (яны бываюць нават вагой усяго ў 300-400 грамаў). У адпаведнасці з айчыннымі санітарна-гігіенічнымі нормамі заплечнікі для пачатковай школы павінны важыць не больш за 600 грамаў (для параўнання: у Расіі — не больш кілаграма).

Прынамсі, на заплечніках ёсць падказка для бацькоў: на этыкетках пазначана, якія з іх прызначаныя для малодшых школьнікаў. Да сумак самых юных вучняў ёсць пэўныя патрабаванні. Яны не павінны быць не толькі цяжкімі, але і вялікімі па памерах, ёсць абмежаванні па колькасці кішэняў. Вы не хочаце, каб за плячыма вашага дзіцяці была лішняя вага? Тады не набывайце школьную сумку з вялікай колькасцю кішэняў, якія малыя заўсёды знойдуць чым «пазабіваць». Перавагу аддайце заплечніку з шырокімі лямкамі, яны павінны быць не вузейшымі за 4 сантыметры.

ТРЭЦІ: ДЗЕЛАВЫ

Такім чынам, каб толькі спакаваць заплечнік, пайшло ўжо каля 140 тысяч. Але гэта яшчэ што. Дзіця трэба апрануць: толькі спартыўная форма пацягне мінімум на 60-80 тысяч, спартыўны абутак — ад 50 да 100. У крамах асенніх туфлі на хлопчыка я бачыла за 52 і за 120 тысяч, на дзяўчынку за 70 і 113. Вядома, пажадана, каб абутак быў натуральным, але калі пасля такой колькасці закупак на вырабы з натуральнай скуры вам не хапае, трэба хоць укласці ў больш танны абутак баваўняную альбо лямцавую вусцілку.

...Вось у ЦУМ зайшла сям'я за абноўкамі да школы. Малая доўгі час сядзіць у прымерачнай, яна надзела на сябе ўжо не адну блузку. Бацька не вытрымлівае: «Мне ўсё падабаецца, толькі выберыце што-небудзь». Дзяўчынцы шмат што спадабалася, але вырашана было абмежавацца трыма рэчамі, бо блузкі каштуюць 50-80 тысяч. Для дзяўчатак з малодшай школы можна сёння падабраць неблагі строй, праўда, і за немалую суму. Толькі спадніца можа абысціся ў 20-70 тысяч, камізэлька — 30-50, камплект са спадніцы і жакета — у 97, 102, 160, і гэта яшчэ не самыя высокія кошты.

Вісяць на кранштэйнах і яўна змрочныя рэчы, але ёсць і такое адзенне, у якім юная дзелавая лэдзі будзе выглядаць сапраўды модна. Дзяўчаткам прасцей: строгія спадніцы і сарафаны яны могуць спалучаць з рознымі, больш вясёлымі, джэмперамі і блузкамі. Прычым нават у аддзелах, дзе прадаецца адзенне для школы, трапляюцца мілыя рэчы. Напрыклад, ружовыя блузачкі і спадніцы з малюнкам (не абавязкова гэта павінны быць палоскі і клеткі, але і кветкі).

А вы паспрабуйце зрабіць з хлопчыка-першакласніка дзелавога чалавека. Так, касцюмы пакуль яшчэ можна падабраць (пажадана рабіць гэта з дзіцем, бо часам, калі яму прыйшліся па памеры штаны, пінжак не сядзіць, і наадварот. Самы танны касцюм (двоечка), што мне патрапіўся на вочы, каштаваў 88 тысяч, але ў асноўным на цэнніках сумы перавальваюць за сотню, плюс трэба яшчэ купіць некалькі кашуль (каля 25 тысяч за кожную). На многіх этыкетках касцюмаў пазначана, што ён прызначаны для ўрачыстасцяў. Увага: такое адзенне не падыходзіць для паўсядзённага нашэння, бо яно робіцца з ненатуральных тканін. Значыць, малому ў гэтым будзе некамфортна, хлопчык будзе мерзнуць у ім у халоднае надвор'е і перагравацца, пацець у цёплае. Пажадана, каб касцюмчык быў з бавоўны, ільну, паўшэрсці, віскозы. Калі вы ўжо набылі сінтэтыку, то пастарайцеся, каб хоць кашулі ў вашага сына былі натуральнымі. Дарэчы, падабраць іх першакласніку праблематычна. Вы можаце ўявіць свайго сына ў кашулях руковага, жоўтага, салатавага колеру? А менавіта такая гама (плюс класічны — белы), прапануецца зараз малодшым школьнікам. І калі на больш высокіх дзяцей можна купіць кашулі блакітнага ці шэрага колеру, на малых я такіх у продажы не сустрэла. А паспрабуйце яшчэ пад усё гэта падабраць гальштук! І наверх на такі дзелавы стыль начапіць ранец. І чаму хлопчыкі абавязаныя хадзіць у пінжаках? Хіба нельга прыдумаць для іх больш зручнае дзелавое адзенне. Напрыклад, пінжак можна замяніць на камізэльку. І танней, і дзіцяці зручней (яно не адчувае сябе, як у скафандры), і пад надвор'е можна падладжвацца (не так горача ў цёплыя дні), і, зноў жа, магчымасць ёсць для змены іміджу — пад камізэльку можна надзяваць розныя кашулі. Дарэчы, бачыла ў краме цікавую мадэль жакета для малодшых школьнікаў (зроблена з ільну, з нашыўкамі і капюшонам) — не дзелавы стыль, але затое зручна, прыгожа, сучасна, ды і служыць такая рэч можа больш, пінжак жа на два гады не купіш (дзіця не зможа займацца ў такім, у якім «патанае»). «Мне не падабаецца ідэя з дзелавым стылем, — заўважае Тамара Ракавец, што выбірае адзенне шасцігадоваму сыну. — Ну не магу я ўявіць свайго гарэзу ў пінжаку. Чаму б для малодшай школы не зрабіць паслабленне? Няхай малыя ходзяць у больш зручнай вопратцы. Чаму б, напрыклад, не падабраць для ўсіх дзяўчынак з класа аднолькавыя сімпатычныя джэмперы, а для хлопчыкаў — байкі? І неабавязкова ў чорна-шэра-сініх колерах».

Калі вы хочаце прыгожа апрануць сваіх першакласнікаў, не цягніце з гэтай справай. «Летась мы прыйшлі па форму за два дні да пачатку заняткаў у школе. Магазін быў напаўпусты. Выбіраць не было з чаго, узялі нейкае абы-што, а цяпер шукаем больш прыгожую і зручную вопратку», — прызнаецца Марына Верамейка, у якой дзіця ўжо ідзе ў другі клас. Ды і прадаўцы са школьных аддзелаў пацвярджаюць, што ў канцы жніўня ў магазінах робіцца нешта неверагоднае: пакупнікі ідуць натоўпамі, і ўжо зараз адчуваецца, што пакупнікоў прыбывае.

ЧАЦВЁРТЫ: ХАТНІ

Сёння раяць набываць дзецям мэблю, якая будзе расці разам з імі. У адным з гандлёвых цэнтраў натыкаюся на цудоўны столік. Вышыня ножак рэгулюецца, стальніцу можна размяшчаць як гарызантальна, так і пад вуглом. Прадавец рэкламуе: «Набывайце, добрая нямецкая мэбля і служыць будзе, пакуль дзіця малое, і калі стане падлеткам. Стол каштуе 700 еўра, а крэсла да яго 400 еўра». Не, за такі кошт няхай на ім немцы самі і сядзяць. Пашукаем танней. Удалося знайсці падобныя нямецкія столікі, што могуць «расці», і за 240, і 360 долараў. Але ў продажы бываюць і айчынныя сталы з вышынёй, якая рэгулюецца. Праўда, выглядаюць яны больш проста. Напрыклад, стол «Піянер» мне нагадаў... прасавальную дошку (такія ж жалезныя ножкі і такім жа чынам рэгулюецца вышыня), а сама стальніца настолькі малая, што, здаецца, тут, акрамя аднаго сшытка і дзіцячых локцяў, нічога не памесціцца). Затое каштуе ўсяго 92 (95) тысяч. У мэблевай краме патраліўся і больш прывабны стол з рэгулюемай вышынёй за 700 тысяч. А можа, лепш ужо купіць звычайны пісьмовы стол — там і працоўная паверхня больш вялікая, а яшчэ ёсць шуфлядкі, куды дзіця будзе складваць свае рэчы, ды і каштуюць пісьмовыя сталы 200-300 тысяч. Праўда, пад такі стол неабходна хоць крэсла набыць такое, якое рэгулюецца. У прадажы мне сустракаліся дзіцячыя крэслы на колах коштам 99—120 тысяч, і звычайнае драўлянае (накшталт такіх, як стаяць у школе), з механізмам, што дазваляе рэгуляваць яго вышыню, — за 50 тысяч.

А патрэбны яшчэ лямпа, шафа ці паліца для кніг.

Вядома, толькі вышэйзгаданымі пакупкамі вашы выдаткі не абмяжуюцца: трэба будзе набыць дзіцяці яшчэ ніжнюю бялізну, шкарпэткі (дзяўчатам панчохі і банцікі), заплаціць за карыстанне падручнікамі, здаць грошы ў бацькоўскі камітэт... Ну што, бацькі, ці гатовыя вы да школы?

Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.

Футбол. Ліга Еўропы

ПРОСТЫЯ ЛІЧБЫ

Магілёўскі клуб на родным стадыёне «Спартак» прымаў чэшскі клуб «Банік». І выглядаў з першай да апошняй хвіліны сапраўдным гаспадаром на полі. «Днепр» ведаў, што і як рабіць у змаганні з аўтарытэтным супернікам. У гэтым сезоне беларуская каманда праводзіла ўжо пятую еўракубкавую дуэль.

Першы больш-менш небяспечны момант каля магілёўскіх варот «Банік» змог стварыць толькі напрыканцы першага тайма, але выдатна згуляў галкіпер гаспадароў Капанцоў. «Днепр» жа да гэтага мог ужо некалькі раз забіць. У самым пачатку нядрэнна прабіў Юрчанка, потым Зяньковіч стрэліў з другога паверха, Турлін біў здалёк.

Другі тайм беларуская каманда зноў пачала з асады чужых варот, галоўнымі дзейнымі асобамі былі ўсё тыя ж Юрчанка і Зяньковіч. І менавіта 39-му нумару «Дняпра», Ігару Зяньковічу, лёс наканаваў забіць адзіны ў гэтай гульні мяч. У сярэдзіне другога тайма падчас мітусні ў штрафной «Баніка» нападаючы гаспадароў запіхнуў мяч у вароты. Не вельмі прыгожа, затое вельмі эфектыўна!

Пасля забітага мяча чэхі актывізаваліся, але найбольш небяспечныя моманты ўзнікалі менавіта каля іх варотаў. Зяньковіч меў шансы афармляць і дубль, і хетрык, але майстэрства трошкі падвяло. Фінальны свісток зафіксаваў лік 1:0. Гульня ў адказ пройдзе ў Астраве 5 жніўня.

Галоўны трэнер «Дняпра» Андрэй Скарабагацька на пасляматчавай прэс-канферэнцыі падзякаваў магілёскім заўзятарам за падтрымку. «У цэлым задаволены гульнёй і вынікам, а таксама тым, як мы дзейнічалі ў абароне. Добра, што не прапусцілі. Гэта галоўнае. Забіўшы мяч, і ў далейшым мелі перавагу. Але ўсё адно ў Чэхіі нам будзе вельмі цяжка. Рады, што абышлося без траўмаў і без лішніх картак. Шчыра кажучы, мы планавалі ехаць у Чэхію на другую гульню аўтобусам, цяпер трэба будзе паспрабаваць замовіць чартар. Для нас важна падысці ў добрай форме да зваротнага паядынку», — сказаў галоўны трэнер магіляўчан.

Яўген ВАРАКСА.

ДЫНАМАЎСКІЯ «ТАНЦЫ МІНУС 1»

Спецыяльны карэспандэнт «Звязды» перадае з Хайфы

Футбалісты мінскага «Дынама» з мінімальным лікам 0:1 прайгралі ў першым матчы трэцяга кваліфікацыйнага раўнда Лігі Еўропы на выездзе ў Хайфе мясцоваму клубу «Макабі». Хатні матч мінчане правядуць 5 жніўня на сталічным стадыёне «Дынама».

Будзе абсалютнай праўдай, калі сказаць, што беларускім футбалістам пашанцавала на стадыёне Кір'ят-Элізер — канчатковы лік мог быць зусім непрыстойным. Гаспадары бесперапынна атакавалі, госці адбіваліся, як маглі, і нават мелі некалькі небяспечных момантаў у сваім арсенале.

Пасля фінальнага свістка балельшчыкі «Макабі» яшчэ доўга стаялі ў задуменні, асэнсоўваючы тое, што нядаўна адбылося. Адзіны гол у вароты гасцей, забіты галавой грузінскім легіянерам Уладзімірам Давілішвілі — гэта не той задзел, якога павінна хапіць для ўпэўненай гульні ў адказ. А ў тым, што ізраільцяне без шапказакідальніцкага настрою ставяцца да беларускага клуба, няма ніякіх сумненняў.

Яшчэ за дзень да гульні мясцовая газета «Новости», якая выходзіць на рускай мове, падрабязна спынілася на буднях абодвух супернікаў. Выданне з Хайфы загадкава давала характарыстыку суперніку «Макабі». «Цяжка сказаць, што з сябе ўяўляе зараз мінскае «Дынама», — паведамляў мясцовы журналіст. — Калісьці адзін з лепшых клубаў Савецкага Саюза зараз уступіў першынства навет у Беларусі. Наймацнейшы ігрок каманды, паўабаронца Сяргей Кісляк, не выходзіць на поле, бо не дамовіўся з клубам аб умовах новага кантракта. Да таго ж на наступным тыдні ён адправіўся на агледзіны ў казанскі «Рубін», — заключыў аўтар артыкула.

Сапраўды, лідар дынамаўцаў Сяргей Кісляк, які трапіў у апалу кіраўніцтва клуба, наўрад ці сапсаваў бы агульны малюнак матча. Праўда, яго таварыш па «барацьбе за праўду» Антон Пуціла, аб важнай ролі якога ў шэрагах бела-блакітных ідзе шмат размоў, мог усе авансы сваіх прыхільнікаў і заступнікаў у Хайфе ўвасобіць у рэальнае жыццё. Ён выступаў у аснове ўсе 90 хвілін гульнявога часу. Праўда, не атрымалася, хоць у адным з момантаў Антон «зарабіў» пенальці, але ж італьянскі арбітр Лука Маджані вырашыў не выпрабоўваць свой лёс, і яго свісток прамаўчаў.

Магчыма, на ўсю судзейскую брыгаду свой уплыў аказала спякотнае ізраільскае надвор'е , за-за чаго чаша стадыёна ператварылася ў сапраўдную парылку. Балазе, і футбалісты, і балельшчыкі годна вытрымалі гэтае няпростае выпрабаванне. З боку прыхільнікаў нашай каманды, у шэрагах якіх аказаліся і супрацоўнікі беларускага пасольства ў Тэль-Авіве, выказвалася меркаванне, што ў Мінску праз тыдзень надвор'е дазволіць пакаэаць гульцам добры футбол. Вядома ж, рэверансы датычыліся футбалістаў мінскага «Дынама».

Уладзімір ЗДАНОВІЧ. *Мінск — Хайфа — Мінск.*

P.S. Рэдакцыя газеты «Звязда» выказвае ўдзячнасць кіраўніцтву ФК «Дынама» (Мінск) за садзейнічанне журналісту газеты ў падрыхтоўцы футбольнага рэпартажу з Хайфы.

ГАЙНЕНСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ ЛОГОЙСКОГО РАЙОНА (ПРОДАВЕЦ)

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН
по продаже 3 (трех) земельных участков для индивидуального жилищного строительства:

Лот 1 — земельный участок № 2 в д. Родевичи площадью 0,2282 га, кадастровый номер 623280810601000029, начальная цена 504 260 белорусский рублей;

Лот 2 — земельный участок № 3 в д. Родевичи площадью 0,2431 га, кадастровый номер 623280810601000027, начальная цена 504 260 белорусский рублей;

Лот 3 — земельный участок № 4 в д. Родевичи площадью 0,2394 га, кадастровый номер 623280810601000030, начальная цена 504 260 белорусский рублей.

Целевое назначение земельных участков — строительство и обслуживание жилого дома.

Задаток в размере 10 % от начальной цены перечисляется на р/счет № 3600619021104 в ЦБУ 611 ф-ла 500 Минское управление АСБ «Беларусбанк», МФО 153001601, УНП 600181697. Аукцион состоится **31.08.2010 г. в 11.00** по адресу: Логойский район, д. Гайна, ул. Советская, 14. Заявление на участие и необходимые документы принимаются **до 28.08.2010 г. до 17.00** по адресу: Логойский район, агр. Гайна, ул. Советская, д. 14.

Контактные телефоны: (8 01774) 58 2 35, 58 2 36, 56 4 98.

УНП 600181697.

ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКАЗЕ ОТ ПРОВЕДЕНИЯ АУКЦИОНА

ККУП «Витебский областной центр маркетинга» сообщает:

Лот № 4: Право заключения договора аренды земельного участка с кадастровым номером 221200000001001026 площадью 0,5876 га, расположенного по адресу: Витебская обл., Витебский район, для строительства и обслуживания объекта «Универмаг торговый площадью не менее 2500 кв. метров (2-3 этажа) в микрорайоне «Билево-2» в г. Витебске», срок аренды 50 лет, опубликованный в информационном сообщении о проведении открытого аукциона по продаже права заключения договоров аренды земельных участков, в газете «Звязда» от 30 июня 2010 г. № 125 (26733), снимается с торгов согласно решению Витебского районного исполнительного комитета.

Сумма задатка, внесенная участниками аукциона на счет городского исполнительного комитета, подлежит возврату им в течение 5 рабочих дней со дня отказа местного исполнительного комитета от проведения аукциона.

Приносим свои извинения.

Контактный тел. (0212) 47 97 35, e-mail: vcm74@mail.ru, vitinvest.biz.

Организация: **ООО «Семь холмов Строй»**
Учетный номер плательщика: **УНП191029575**
Вид деятельности: **оптовая торговля**
Организационно-правовая форма: **Частная**
Орган управления: **юр. лицо без ведомственной подчиненности**
Единица измерения: **млн руб.**
Адрес: **220025, г. Минск, ул. Наполеона Орды, д. 47, пом. 1Н, ком 2 А**

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 января 2010 г.

АКТИВ	Код строки	На начало года	На конец отчетного периода
1	2	3	4
I. ВНЕОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ			
Основные средства:			
первоначальная стоимость	101		6
амортизация	102		1
остаточная стоимость	110		5
Нематериальные активы:			
первоначальная стоимость	111		
амортизация	112		
остаточная стоимость	120		
Доходные вложения в материальные ценности:			
первоначальная стоимость	121		
амортизация	122		
остаточная стоимость	130		
Вложения во внеоборотные активы	140	2	16
В том числе:			
незавершенное строительство	141		
Прочие внеоборотные активы	150		
ИТОГО по разделу I	**190**	**2**	**21**
II. ОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ			
Запасы и затраты	210	2	208
В том числе:			
сырье, материалы и другие аналогичные активы	211	2	4
животные на выращивании и откорме	212		
затраты в незавершенном производстве и полуфабрикаты	213		
расходы на реализацию	214		1
готовая продукция и товары для реализации	215		166
товары отгруженные	216		34
выполненные этапы по незавершенным работам	217		
расходы будущих периодов	218		3
прочие запасы и затраты	219		
Налоги по приобретенным товарам, работам, услугам	220	2	31
Дебиторская задолженность (платежи по которой ожидаются более чем через 12 месяцев после отчетной даты)	230		
В том числе:			
покупателей и заказчиков	231		
прочая дебиторская задолженность	232		
Дебиторская задолженность (платежи по которой ожидаются в течение 12 месяцев после отчетной даты)	240	4	9
В том числе:			
покупателей и заказчиков	241		
поставщиков и подрядчиков	242	4	1
по налогам и сборам	243		7
по расчетам с персоналом	244		
разных дебиторов	245		1
прочая дебиторская задолженность	249		
Расчеты с учредителями	250		
в том числе:			
по вкладам в уставный фонд	251		
прочие	252		
Денежные средства	260	6	17
в том числе:			
денежные средства на депозитных счетах	261		
Финансовые вложения	270		55
Прочие оборотные активы	280		
ИТОГО по разделу II	**290**	**14**	**320**
БАЛАНС (190+290)	300	**16**	**341**

ПАССИВ	Код строки	На начало года	На конец отчетного периода
1	2	3	4
III. КАПИТАЛ И РЕЗЕРВЫ			
Уставный фонд	410	3	3
Собственные акции (доли), выкупленные у акционеров (учредителей)	411	-	-
Резервный фонд	420	-	-
в том числе:			
резервы, образованные в соответствии с законодательством	421	-	-
резервы, образованные в соответствии с учредительными документами	422	-	-
Добавочный фонд	430	-	-
Чистая прибыль (убыток) отчетного периода	440	-	-
Нераспределенная (неиспользованная) прибыль (непокрытый убыток)	450	-8	-26
Целевое финансирование	460	-	-
Доходы будущих периодов	470	-	-
ИТОГО по разделу III	**490**	**-5**	**-23**
IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Долгосрочные кредиты и займы	510	-	-
Прочие долгосрочные обязательства	520	-	-
ИТОГО по разделу IV	**590**	**-**	**-**
V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Краткосрочные кредиты и займы	610	15	-
Кредиторская задолженность	620	6	364
в том числе:			
перед поставщиками и подрядчиками	621	2	265
перед покупателями и заказчиками	622	-	1
по расчетам с персоналом по оплате труда	623	-	2
по прочим расчетам с персоналом	624	1	-
по налогам и сборам	625	-	-
по социальному страхованию и обеспечению	626	-	1
по лизинговым платежам	627	-	-
перед прочими кредиторами	628	3	95
Задолженность перед участниками (учредителями)	630	-	-
в том числе:			
по выплате доходов, дивидендов	631	-	-
прочая задолженность	632	-	-
Резервы предстоящих расходов	640	-	-
Прочие краткосрочные обязательства	650	-	-
ИТОГО по разделу V	**690**	**21**	**364**
БАЛАНС (490+590+690)	700	**16**	**341**
Из строки 620:			
долгосрочная кредиторская задолженность	701	-	-
краткосрочная кредиторская задолженность	702	6	364

Активы и обязательства, учитываемые за балансом	Код строки	На начало года	На конец отчетного периода
1	2	3	4
Арендованные (в том числе полученные в пользование, лизинг) основные средства	001	-	-
Товарно-материальные ценности, принятые на ответственное хранение	002	-	-
Материалы, принятые в переработку	003	-	-
Товары, принятые на комиссию	004	-	24
Оборудование, принятое для монтажа	005	-	-
Бланки строгой отчетности	006	-	-
Списанная в убыток задолженность неплатежеспособных дебиторов	007	-	-
Обеспечения обязательств и платежей полученные	008	-	-
Обеспечения обязательств и платежей выданные	009	-	-
Амортизационный фонд воспроизводства основных средств	010	-	-
Основные средства, сданные в аренду (лизинг)	011	-	-
Нематериальные активы, полученные в пользование	012	-	-
Амортизационный фонд воспроизводства нематериальных активов	013	-	-
Потеря стоимости основных средств	014	-	-

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ
период с 1 января по 31 декабря 2009 г.

Наименование показателя	Код строки	За отчетный период	За аналогичный период предыдущего года
1	2	3	4
I. ДОХОДЫ И РАСХОДЫ ПО ВИДАМ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ			
Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг	010	961	-
Налоги и сборы, включаемые в выручку от реализации товаров, продукции, работ, услуг	011	148	-
Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг (за вычетом налогов и сборов, включаемых в выручку) (010-011)	020	812	-
Справочно: из строки 010 сумма государственной поддержки (субсидии) на покрытие разницы в ценах и тарифах	021	-	-
Себестоимость реализованных товаров, продукции, работ, услуг	030	825	-
Валовая прибыль (020-021-030)	040	-13	-
Управленческие расходы	050	-	-
Расходы на реализацию	060	-	-
ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) от реализации товаров, продукции, работ, услуг (020-030-050-060)	**070**	**-13**	**-**
II. ОПЕРАЦИОННЫЕ ДОХОДЫ И РАСХОДЫ			
Операционные доходы	080	5	-
Налоги и сборы, включаемые в операционные доходы	081	-	-
Операционные доходы (за вычетом налогов и сборов, включаемых в операционные доходы) (080-081)	090	5	-
в том числе:			
проценты к получению	091	-	-
доходы от участия в создании (учредительстве) других организаций	092	-	-
доходы от операций с активами	093	-	-
прочие операционные доходы	099	5	-
Операционные расходы	100	-	-
в том числе:			
проценты к уплате	101	-	-
расходы от операций с активами	102	-	-
прочие операционные расходы	109	-	-
ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) от операционных доходов и расходов (090-100)	**120**	**5**	**-**
III. ВНЕРЕАЛИЗАЦИОННЫЕ ДОХОДЫ И РАСХОДЫ			
Внереализационные доходы	130	4	-
Налоги и сборы, включаемые во внереализационные доходы	131	-	-
Внереализационные доходы (за вычетом налогов и сборов, включаемых во внереализационные доходы) (130-131)	140	4	-
Внереализационные расходы	150	13	8
ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) от внереализационных доходов и расходов (140-150)	**160**	**-10**	**-8**
ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) (-/+070-/+120-/+160)	**200**	**-18**	**-8**
Расходы, не учитываемые при налогообложении	210	5	8
Доходы, не учитываемые при налогообложении	220	-	-
ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) до налогообложения (-/+200+210-220)	**240**	**-13**	**-**
Налог на прибыль	250	-	-
Прочие налоги, сборы из прибыли	260	-	-
Прочие расходы и платежи из прибыли	270	-	-
ЧИСТАЯ ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) (200-250-260-270)	**300**	**-18**	**-8**
Справочно (из строки 300):			
сумма предоставленной льготы по налогу на прибыль	310	-	-
Прибыль (убыток) на акцию	320	-	-
Количество прибыльных организаций/ сумма прибыли	330	-	-
Количество убыточных организаций/сумма убытка	340	-	-

РАСШИФРОВКА ОТДЕЛЬНЫХ ВНЕРЕАЛИЗАЦИОННЫХ ДОХОДОВ И РАСХОДОВ

Показатель		За отчетный период		За аналогичный период предыдущего года	
наименование	код	доход	расход	доход	расход
1	2	3	4	5	6
Штрафы, пени и неустойки, признанные или по которым получены решения суда (арбитражного суда) об их взыскании	350	-	-	-	-
Прибыль (убыток) прошлых лет	360	-	-	-	-
Возмещение убытков, причиненных неисполнением или ненадлежащим исполнением обязательств	370	-	-	-	-
Курсовые разницы по операциям в иностранной валюте	380	-	1	-	-
Списание дебиторских и кредиторских задолженностей, по которым истек срок исковой давности	390	-	-	-	-
Прочие доходы и расходы	400	3	12	-	8
ИТОГО	500	4	13	-	8

Руководитель **Самофалов М.Н.**
Главный бухгалтер **Осипенко О.П.**
24 марта 2010 г.

Казкі для дарослых

КІЛЕР

Яна такая, як усе, як тысячы іншых жанчын. На працы яе паважаюць, адзначаюць і нават прэміруюць. Сям'я і дом трымаюцца на ёй. Яна аднолькава ўпэўнена кіруе і аўтамабілем, і калектывам сваіх падначаленых. Жалезабетонная жанчына, лэдзі з «нержавейкі», як часам называюць яе за спінай злаславіўцы (або зайздроснікі, што, у прынцыпе, адно і тое ж). Яна ідзе па жыцці смеючыся, і ніхто ніколі не бачыў яе слёз. Ды і калі ёй плакаць і, галоўнае, аб чым? Усё складваецца ўдала, вельмі ўдала: праца, замужжа, дзеці ніколі не прыносілі ёй асаблівых расчараванняў. А цяпер з'явілася яшчэ і дача, ці, лепш сказаць, загарадны дамок. Яна даўно марыла пра такі — з вялікай светлай верандай, з вокнамі ад столі і амаль што да падлогі, з балкончыкам, абабітым вагонкай, дзе так прыемна сядзець летнім вечарам з кубачкам кавы і любавацца захадам сонца, з альтанкай, дзе можна снедаць і вячэраць з сябрамі, засяляўшы стол прыгожым ільняным абрусам, расставіўшы талеркі з новага нямецкага сервізу і расклаўшы па ўсіх правілах этыкету мельхіёравыя відэльцы і нажы... Стоп, стоп! Марыць не шкодна. Усё гэта яшчэ толькі ў перспектыве, хоць і не вельмі далёкай. А пакуль што яна едзе на сваю дачу ў электрычцы, каб потым сысці на пэўным прыпынку і прайсці яшчэ кіламетры тры пехам, спачатку праз лес, потым праз поле... Чорт бы пабраў гэтае садовае таварыства разам з яго кіраўніцтвам — ніяк не заасфальтуюць дарогу. А муж не хоча заўчаснай смерці для сваёй «аўдзі». Вось і даводзіцца ездзіць самой, скакаць, як дзяўчынцы, праз яміны і калдобіны.

...Пасажыраў у вагон набілася столькі, што яблыку няма дзе ўпасці. Людзі сядзяць, стаяць, вісяць, абапіраюцца... Ім горача і млосна, яны абмахваюцца газетамі, п'юць ваду і сварацца з-за месцаў... Яе гэта ўжо мала хвалюе, яна сядзіць ля акна, што гарантуе адносны спакой і камфорт (калі паездку ў набітай электрычцы ўвогуле можна лічыць камфортнай). Усё б нічога, толькі немагчыма выпрастаць ногі — уся свабодная прастора застаўленая сумкамі і бауламі (ну, вы прыкладна здагадваецеся, з якім багажом людзі едуць на дачы)... Яна дастае з сумачкі пухлы жаночы часопіс і пачынае гартаць. Дамскія часопісы для таго і існуюць, каб гартаць іх, калі няма магчымасці заняць рукі чым-небудзь больш карысным. Ёй заўсёды было цікава: у што, скажам, апранаюцца самі аўтары калонак пра моду, няўжо сапраўды завязваюць гэты шалік разам з такой вось сукенкай?.. Галава цяжэе і сама сабой апускаецца на спінку сядзення. Цудоўная ідэя — паспаць! Яна так мала спіць апошнім часам... Столькі хваляванняў! Будаўніцтва новай кватэры, абмен яе і старой «двушкі» на дзве іншыя. І яшчэ адно будаўніцтва. Яна не хацела ўжо ў яго «ўлазіць», але муж настояў, у яго па месцы працы якраз падышла чарга. Праўда, прыйшлося аформіць фіктыўны развод (а хто праз гэта не праходзіў?..). Затое дзеці цяпер, лічы, забяспечаныя жылплошчай. А гэта многа значыць, вельмі многа. У свой час яна пацягалася па чужых кватэрах, хапіла пад завязку. Ніякай свабоды, ніякай асабістай прасторы, толькі абмежаванасць дзеянняў і залежнасць. Ад настрою гаспадароў, ад іх фінансавага становішча, ад курсу долара, ад скаргаў суседзяў... Бр-р-р...

Яна ўзнімае галаву і расплюшчвае вочы. За акном мільгаюць знаёмыя немудрагелістыя пейзажы — бярэзнік, возера, дачны пасёлак, лясок... Дзякуй Богу, што ўсё склалася так, як склалася. Цяпер ёй спакойна і надзейна, бо ёсць «тыл». Вось толькі выспацца ніяк не атрымліваецца і ў найбліжэйшы час не атрымаецца. На дачы (ці, як гаворыць муж, «на доме») працуе брыгада будаўнікоў. Ім неабходна даваць распараджэнні, іх трэба кантраляваць, інакш сцёк для вады зноў будзе зроблены не з таго боку, а камін абкладзены не той цэглай...

Яна міжволі ўздыхае і хмурыцца, падлічваючы, колькі грошай яшчэ спатрэбіцца на гарачыя абеды, якія кожны раз даводзіцца вазіць з сабой у тэрмасах і каструльках з герметычнымі накрыўкамі. І раптам уздрыгвае ад смяшка. Усміхаецца мужчына, які сядзіць насупраць. Прычым гэта

«І НЯХАЙ ЗАПАЛІЦЦА СВЯТЛО ЛЮБОВІ Ў ДЗІЦЯЧЫХ ДУШАХ»

Добры дзень, паважаная рэдакцыя маёй самай любімай «Звязды»! Звяртаецца да вас даўняя і адданая чытачка з Навагрудка, якая працуе выкладчыцай беларускай мовы і літаратуры ў Навагрудскім прафесійна-тэхнічным ліцэі. З цікавасцю сачу за дыскусіяй, якая распачалася на старонках «Звязды» і звязана з абмеркаваннем пытання наконт выкладання ў школах прадмета «рэлігійная культура». Як чалавек глыбокай і моцнай веры ў Хрыста (па веравызнанні каталічка) і як выкладчык з дваццацівасьмігадовым стажам, хачу далучыцца да распачатай дыскусіі і выказаць свой пункт гледжання ў гэтым артыкуле.

Фота Catholic.by.

Удзельнікі пілігрымкі Баранавічы—Будслаў 23 чэрвеня 2010 г.

...Божае слова. Праменьчыкі, якія разыходзяцца ад гэтага слова, асвятляюць шлях да любові, дабрыні, міласэрнасці, да спазнання самага галоўнага на зямлі багацця — багацця духоўнага. Праменьчыкі хрысціянскай веры здольныя не толькі прасвятліць душу, але і выратаваць яе ад жорсткасці, нянавісці, зайздрасці, ад імкнення жыць па законах д'ябла, якія клічуць да духоўнай і цялеснай разбэшчанасці, да пакланення багаццю, сіле. Але, на жаль, яшчэ шмат цемры і зла, шмат спакусаў у сённяшнім свеце. Вельмі страшна і балюча ўсведамляць, што нашы дзеці, падлеткі, моладзь не толькі сутыкаюцца з усімі пачварнымі праявамі зла і цемры: п'янствам, наркаманіяй, сэксуальнай распушчанасцю, насіллем, але і многія з іх усур'ёз захапляюцца гэтым і калечаць душу і цела.

Некаторыя дарослыя лічаць, што засцерагчы дзяцей ад зла гэтага свету можна з дапамогай камп'ютара, розных гурткоў, клубаў, спартыўных секцый.

Вядома, ніхто не супраць тэхнічных навінак, спорту і падобнага, але ж калі дзіця расце поўнасцю пазбаўленым хрысціянскіх каштоўнасцяў, калі яно не ведае дарогі ў храм, калі яму ў дзяцінстве не быў адкрыты шлях да Хрыста, то ў пэўны небяспечны момант свайго жыцця яму цяжэй будзе пазбегнуць страшных памылак. І я з вялікай радасцю і надзеяй успрымаю магчымасць увядзення ў школе прадмета «рэлігійная культура», прадмета, які можа стаць тым сонейкам, што запаліць святло любові ў дзіцячых душах, асветліць ім шлях да духоўнага багацця. Будзе яно ў душах і сэрцах дзяцей — будзе ў нас будучыня, будзе моцнай і сапраўды квітнеючай наша Беларусь-Маці. За 28 гадоў працы ў прафесійна-тэхнічным ліцэі мне, як выкладчыцы беларускай мовы і літаратуры, вядома, давялося сустракацца з рознымі падлеткамі. І заўсёды хацелася адкрыць ім духоўны свет, далучыць хоць крыху да хрысціянскіх каштоўнасцяў.

Хачу падкрэсліць, што я вельмі-вельмі шчаслівая, што нарадзілася і выхоўвалася ў хрысціянскай сям'і, дзе нават у страшны атэістычны час Хрыстос, Касцёл былі на першым месцы. І толькі вера ў Хрыста, штодзённыя малітвы, штонядзельная дарога ў храм даюць мне жыццёвыя сілы, дапамагаюць пераадольваць выпрабаванні і даўно ўжо дапамаглі асэнсаваць, што духоўнае багацце — гэта самае галоўнае багацце ў жыцці. І не трэба баяцца паказаць нашым дзецям шлях да спазнання гэтага багацця.

Прадмет «хрысціянская культура» не стане, як думаюць атэістычна выхаваныя дарослыя, нейкай перагрузкай. Хіба ж гэта перагрузка — далучыцца да хрысціянскай маралі і выратаваць душу праз яе святло?!

Бог ёсць Любоў. Дык няхай жа гэтая Любоў стане пасярод нашых дзяцей. Хрыстос жа сцвярджаў, што «дзе двое ці трое сабраліся ў імя Маё, там і Я пасярод іх» (Евангелле паводле святога Мацвея, 18, 20).

На жаль, тыя, хто супраць выкладання хрысціянскай культуры ў школах, сцвярджаюць, што на спазнанне хрысціянскай культуры і хрысціянскіх каштоўнасцяў дастаткова ў нас нядзельных школ пры праваслаўных храмах і заняткаў на ўроках рэлігіі пры каталіцкіх.

Але ж давайце шчыра паглядзім праўдзе ў вочы: хто наведвае ўрокі рэлігіі пры храмах? Дзеці з сем'яў вернікаў, прычым з сем'яў практыкуючых вернікаў, чые бацькі імкнуцца жыць па хрысціянскіх запаведзях, часта ходзяць у царкву ці касцёл, самі нясуць у свет любоў, міласэрнасць. А як жа быць дзецям з сем'яў, дзе бацькі абыякава ставяцца да хрысціянскіх каштоўнасцяў, самі імкнуцца да спакусаў злога? А дзеці з сем'яў, чые бацькі — перакананыя атэісты?

Няўжо ім так і не зведаць Хрыстовай праўды, Любові, не далучыцца да хрысціянскіх скарбаў?! Дык няхай жа гэтыя святыя скарбы будуць адкрытыя ўсім дзецям.

Хрыстос казаў: «Пусціце дзяцей і не перашкаджайце ім прыходзіць да Мяне» (Евангелле паводле Святога Мацвея, 19,14).

Шчыра верыцца, што менавіта ўрокі хрысціянскай культуры навучаць нашых дзяцей арыентавацца, дзе дабро, а дзе зло, дзе святло, а дзе цемра, дзе вечныя скарбы, а дзе такія «скарбы», якія ржавеюць, разбуроцца самі і пры гэтым разбураюць душу.

Найлепш было б сучасным атэістам адправіцца з нашымі дзецьмі і моладдзю ў пілігрымку (пешае рэлігійнае падарожжа да Маці Божай Будслаўскай (Мінская вобласць), да Маці Божай Тракельскай (Гродзенская вобласць).

Я сама не раз хадзіла ў такія пілігрымкі, бачыла, як тысячы і тысячы юнакоў і дзяўчат, духоўна ўзнёслых, з песнямі, з вялікай радасцю ў 30-градусную спёку і пад праліўнымі дажджамі ідуць да Маці Божай, да нашай Нябеснай Заступніцы. А колькі размоў было з такой моладдзю! І самае галоўнае, што яны шчаслівыя, яны светлыя ад радасці, што спазналі Хрыста, што адкрылі скарбы хрысціянскай культуры. Яны вясёлыя, шчырыя, добрыя; брыдкаслоўю няма месца ў іхняй мове. Сярод дзяўчат цэніцца цнатлівасць, якую сёння некаторыя спрабуюць затаптаць у гразь. Але ж гэта самы дарагі дзявочы скарб! Гэтыя юнакі і дзяўчаты супраць таксама ўсіх гэтых грамадзянскіх сухыццяў, якія разбураюць і калечаць цела і душу. Яны прызнаюць толькі шлюб, асвечаны самім Богам у храме.

...Мы хочам, каб моцнай была наша нацыя, наша краіна. А нацыю і краіну ўмацуюць сапраўды хрысціянскія сем'і, дзе бацькі і дзеці разам будуць сеяць зярняты Хрыстовай любові і запальваць у сэрцах маленькія сонейкі ад нязгасных праменьчыкаў Хрыстовых запаведзяў, хрысціянскай маралі і культуры.

Хочацца верыць, што навучыць сеяць такія зярняты дапамогуць усім дзецям выкладчыкі тэалогіі, святары, магчыма, настаўнікі-вернікі на ўроках хрысціянскай культуры.

З вялікай павагай да рэдакцыі маёй самай любімай газеты Галіна Эдуардаўна ТАЎЛУЙ,
г. Навагрудак.

5 ПЕСЕНЬ, ЯКІЯ ПАВІНЕН ВЕДАЦЬ КОЖНЫ БЕЛАРУС (пяць суб'ектыўных меркаванняў)

БЕЛАРУСЫ, бясспрэчна, народ паэтаў і песняроў. Музыка, песня — неад'емныя складнікі як народнай культуры, так і высокага мастацтва нашай краіны. Але сёння з музычна-песеннай культурай адбываюцца страшэнныя пераўтварэнні! Здаецца, песня страціла тую сілу і духоўную значнасць, якую мела ўсяго дзесяць гадоў таму... Вінаватыя ва ўсім, вядома, новыя тэхналогіі, якія пераўтварылі працэс праслухоўвання музыкі з казачнага рытуалу ў імгненную загрузку файлаў на камп'ютар ці ай-под. Музыка стала больш даступнай, адпаведна — менш каштоўнай. Сёння толькі зрэдку людзі шукаюць у музыцы нешта важнае для сябе, часцей яны робяць з музыкі прыемны «фон» для працы, гутаркі, вячэры. Каб дапамагчы беларусам зарыентавацца ў вялікім мноcтве MP3-файлаў, я апытала пяць вядомых людзей, якія сцвердзілі сябе ў розных відах мастацтва: музыцы і тэатры, жывапісе, літаратуры. Кожны з іх раіць вам паслухаць пяць песень, у якіх вы знойдзеце нешта ўзнёслае і роднае, надзённае і нацыянальнае. Пра тое, што гэта песні вартыя, сведчыць той факт, што некаторыя пазіцыі супалі, хоць апытаныя належаць да розных пакаленняў.

Ганна СІЛІВОНЧЫК, мастачка:



1. Дзяржаўны гімн Рэспублікі Беларусь (словы М. Клімковіча, Ул. Карызны, музыка Н. Сакалоўскага). Кожны павінен ведаць, у першую чаргу, свой гімн. У нацыянальных гімнах заўжды ёсць нешта годнае і патрыятычнае. Добра, калі дзяржаўны гімн выклікае жаданне завучыць тэкст на памяць і спяваць яго хорам, высока ўзняўшы галаву...

2. «Туман ярам». Гэта шыкоўная беларуская народная песня, светлая і тужлівая. Наогул хочацца, каб беларусы ведалі як мага больш народных песень, бо гэта дае вельмі шмат для разумення сваёй ментальнасці, сваіх каранёў, гісторыі і культуры.

3. «Мой родны кут» (словы Я. Коласа, музыка І. Лучанка). Лірычная песня пра мілы родны край на верш народнага паэта. Думаю, акрамя таго, што яна надзвычайна ўзнёслая і патрыятычная, можна дадаць яшчэ хіба тое, што слухаць песню варта ў выкананні сапраўды нацыянальнага беларускага ансамбля «Песняры».

4. Паланэз «Развітанне з Радзімай» (музыка М. К. Агінскага). Пранікнёная класіка пра любоў да родных мясцін! І скончыліся спрэчкі аб тым, беларускім ці польскім кампазітарам з'яўляецца Міхал Клеафас Агінскі...

5. «Капитал» гурта «Ляпис Трубецкой». Пра нашу з вамі сучаснасць. Досыць яскравая песня досыць яскравага гурта. Жывая, вясёлая і якасная музыка.

Жанэт, спявачка:



1. «Беловежская пуща» (словы М. Дабранравава, музыка А. Пахмутавай). Мне здаецца, што кожны беларус павінен ведаць рэпертуар «Песняроў» Уладзіміра Мулявіна. Гэтая песня прасякнутая настроем аднаго з найгалоўнейшых сімвалаў Беларусі — Белавежскай пушчы.

2. «С чего начинается Родина» (словы М. Матусоўскага, музыка В. Баснера). На жаль, многія забылі гэтую шыкоўную песню. Але яе трэба ведаць, таму што ў ёй сабрана вельмі шмат чалавечых каштоўнасцяў, важных для кожнага патрыёта любой краіны, асабліва славянскай: матуліна песня, першы буквар, дзяцінства, сяброўства...

3. «Дзяржаўны гімн Рэспублікі Беларусь» (словы М. Клімковіча, Ул. Карызны, музыка Н. Сакалоўскага). Якая гэта песня ні была б (некаму яна падабаецца, некаму — не), але кожны беларус проста з павагі да сябе павінен ведаць свой гімн.

4. «Малиновка» (словы А. Папярэчнага, музыка Э. Ханка). У свой час гэтую песню выконваў гурт «Верасы». Яна вельмі тонкая і чуллівая, сугучная песенна-рамантычным ноткам беларускага сэрца. Акрамя таго, «Верасы» — гэта класіка айчыннай эстрады, якую таксама трэба ведаць.

5. «Касіў Ясь канюшыну». Кожны беларус павінен абавязкова ведаць песні на беларускай мове! Гэтая пазітыўная народная песня, якая добра стасуецца з весялосцю і дабрынёй беларусаў, вельмі падыходзіць. Акрамя таго, яе ведае шмат людзей па ўсім свеце — гэта такая своеасаблівая беларуская музычная візітоўка.

Анастасія ШПАКОЎСКАЯ, актрыса, лідар гурта «NAKA»:

1. «Дзяржаўны гімн Рэспублікі Беларусь» (словы М. Клімковіча, Ул. Карызны, музыка Н. Сакалоўскага). Гэта музычны твор, які ў першую чаргу павінен ведаць кожны беларус. У ім прысутнічае патрыятычны дух, настрой. Грамадзяне ўсіх краін ведаюць свой гімн, і мне здаецца, што гэта правільна.

2. «Белоруссия» (словы М. Дабранравава, музыка А. Пахмутавай). Гэта беларуская класіка ў выкананні «Песняроў» вельмі натхняе на любоў да Радзімы. Наогул, я старалася выбраць песні пра Беларусь, якія адпавядалі б інтарэсам беларусаў... Мне здаецца, што гэта адна з такіх песень.

3. «Мая краіна Беларусь» (словы і музыка В. Артыста, гурт «Без білета»). Думаю, гэта песня павінна спадабацца ўсім беларусам, таму што яна не абцяжараная шматсэнсоўным тэкстам, які кожны можа трактаваць па-свойму. У ёй проста спяваецца «Ла-ла-лай, мая краіна Беларусь!». Такі прыемны патрыятычны мінімалізм, у якім кожны знойдзе сабе прытулак.

4. Паланэз «Развітанне з Радзімай» (музыка М. К. Агінскага). Беларуская класіка, вельмі важная кампазіцыя для нашага народа.

5. «Слушай Батьку» (словы Я. Мураўёва, музыка А. Сарокіна). Адказ на тое, чаму я раю гэтую песню, думаю, кожны беларус знойдзе для сябе сам. Мне здаецца, што бацька для нас усіх — гэта вельмі істотная частка жыцця, значная фігура. Таму, безумоўна, разам з гімнам і іншымі песнямі, песня гурта «Сябры» павінна быць у гэтым спісе.

Уладзімір АРЛОЎ, пісьменнік:

1. Паланэз «Развітанне з Радзімай» (музыка М. К. Агінскага). Гэта мелодыя незабыўная для кожнага нашага суайчынніка. Асабліва калі чуеш яе за мяжой, не дома. Бывае, калі недзе чуеш, як вулічныя музыкі яе граюць, то вее такім родным беларускім ветрыкам. Цяпер, дарэчы, ужо ёсць некалькі варыянтаў тэкстаў на гэтую мелодыю. Гэтая песня ўпрыгожвае музычны дыск «Я нарадзіўся тут».

2. «Магутны Божа» (словы Н. Арсенневай, музыка М. Равенскага). Я думаю, гэта сапраўдны беларускі рэлігійны гімн. Мне даводзілася чуць, як гэты гімн спяваюць нашы суайчыннікі ў розных гарадах і краінах. Ён насамрэч магутны сваімі словамі, велічнай мелодыяй.

3. «Пагоня» (словы М. Багдановіча, музыка Ул. Мулявіна). Упершыню гэтая песня прагучала на канцэрце «Песняроў» у Нью-Ёрку ў 1991 годзе. Выконвалася канцэртная праграма «Вянок», якая, на жаль, потым практычна ні разу больш не прагучала. Чуллівая песня, працятая самаахвярнасцю дзеля дабрабыту роднай зямлі.

4. «Паветраны шар» гурта N.R.M. Гэтую песню я раю, можа быць, не кожнаму беларусу, але кожнаму маладому беларусу. Яна сапраўды ўзнёслая, напоўненая такой юнацкай прагай да палёту, свабоды. Я быў сведкам, калі на адным з канцэртаў, падчас якога выконвалася гэтая песня, хлопцы пасадзілі сваіх дзяўчат на плечы, і такім чынам усе пад яе танчылі. Быў сапраўды такі момант імкнення ўгору.

5. «У нескладовае» (музыка Р. Арлова, словы Р. Арлова, Б. Штэрна). Песня адрасаваная найперш моладзі. Яна падкрэслівае нашу адметнасць, бо прысвечаная беларускай літары, якая не сустракаецца больш ні ў якіх алфавітах свету.

Мікола МЯТЛІЦКІ, паэт:

1. «Шумяць вербы ў канцы грэблі». Мне вельмі дарагая гэтая песня. Бо душа народа — гэта менавіта народная песня. Каб прывывала святло ва ўласнай душы, трэба часцей звяртацца да роднай творчасці. Дарэчы, тэкст гэтай песні скарыстаны Іванам Мележам у знакамітым рамане «Людзі на балоце».

2. «Ручнікі» (словы В. Вярбы, музыка М. Пятрэнкі). Я думаю, што кожны беларус, чуючы гэтую песню, агортваецца пачуццямі годнасці, еднасці. Гэтая песня, як ніякая іншая, узнёслая і прасветленая, настолькі кранае душу! У свой час яна стала, можна сказаць, народнай прыжывых аўтарах. Песня «Ручнікі» яднае беларусаў не толькі ў Беларусі, але і за яе межамі.

3. «Алеся» (словы А. Куляшова, музыка І. Лучанка). Мяне заўсёды кранае тое, што тэкст гэтай песні напісаны 14-гадовым паэтам аб сваім страчаным першым каханні з такой журбой і пранікнёнасцю. Гэта песня нарадзілася не ў сэрцы кампазітара, а перш за ўсё, у сэрцы самога паэта. Песня гэтая будзе, пэўна, ва ўсе часы блізкая беларускаму сэрцу.

4. «Зорка Венера» (словы М. Багдановіча, музыка С. Рак-Міхайлоўскага). Лірычная цеплыня, уласцівая гэтай песні, так адпавядае нашай беларускай ментальнасці!

5. «Жураўлі над Палессем ляцяць» (словы А. Ставера, музыка І. Лучанка). Словы гэтай песні самі па сабе пачынаюць узнікаць у душы, калі ад'язджаеш ад свайго краю... Таму што ўсіх нас прыцягвае Радзіма.

Вольга ЧАЙКОЎСКАЯ.

ФІЛАСОФІЯ МОВЫ

Раней я не задумвалася пра гэта. Падыходзіла да гэтага неяк па-падлеткаваму наіўна. Але вось падумалася: я размаўляю і пішу на амаль-што-мёртвай-мове. Я спалохалася гэтай высновы. Я падумала: гэта абсурд. Бессэнсоўна. Па-дурацку. Глупства. Я падумала: як жа я так жыву, размаўляючы на мове, якой амаль-што-няма?! І чаму некаторыя людзі размаўляюць па-беларуску толькі ў беларускамоўных кампаніях, а не заўжды ў жыцці?.. І што гэта значыць, калі па-беларуску «гавораць» непрыемным голасам з няправільным вымаўленнем гучнагаварылькі ў метро і нешматлікія шыльды шматлікіх крамаў?.. Гэта спосаб стварыць беларускай мове імідж нягеглай і непрыемнай прадстаўніцы лінгвістычнага свету?.. Здаецца, найбольш па-беларуску называюць аптэкі. Відаць, таму, што ад рускага адпаведніка беларускае слова адрозніваецца толькі адна літара: і «непісьменным» беларусам так «панятней», і другую дзяржаўную мову нібыта не забылі...

Неяк стаяла на ганку ля пад'езда і чакала, пакуль скончыцца дождж, каб рушыць далей. Побач са мной стаяў незнаёмы малады чалавек, відаць, таксама чакаў. Раптам акурат насупраць пад'езда на небе з'явілася вясёлка! Ды такая яскравая, што я проста не магла не патэлефанаваць мужу і не абвясціць яму, што за дзіва я ўбачыла! Калі я скончыла размаўляць, незнаёмы малады чалавек ажывіўся і сказаў мне, што другі раз у жыцці чуе, як размаўляюць па-беларуску. Я разгубілася: няўжо і такое бывае?! «А як жа грамадскі транспарт?» — сціпла заўважыла. «А я ў грамадскім транспарце ўжо 10 гадоў як не езджу», — пахваліўся мой суразмоўца. Вось дык паварот падзей! Аказваецца, некаторыя беларусы проста ізаляваныя ад беларускай мовы і нават не ведаюць пра тое, што мова жыве... Ездзяць у сваіх дарагіх машынах на свае шыкоўныя лецішчы і да беларускай мовы ставяцца, як да экзотыкі. Альбо як да анахранізму...

Беларусы, якім за сорак пяць, падзяляюцца на дзве катэгорыі: адны беларускую мову не прызнаюць альбо не вельмі любяць, другія — з цеплынёй адгукаюцца на кожнае пачутае беларускае слова. Да першых, напрыклад, адносяцца людзі, якія выраслі ў вёсцы і пераехалі ў горад. Як мая маці. Яна не размаўляе на філіграннай рускай мове, таму што вучылася (вось дык пашчасціла!) у вясковай беларускамоўнай школе, і гэта не магло не пакінуць адбітак. Яна выдатна разумее па-беларуску. Але прысутнічае ў ёй гэткі сорам вясковага чалавека, з якога ў свой час добра пасмяяліся гарадскія за «гэканне» і «чэканне». І таму да маёй беларускай мовы маці ставіцца досыць паблажліва, з салідарнасцю пагаджаючыся з кожным, хто хваліць мяне за прыгожую мову, але гаворыць, што сама размаўляць не ўмее, хоць і разумее ўсё. Другія, наадварот, чуючы мову, на якой размаўлялі іх бацькі, на якой размаўлялі яны самі, жывучы ў вёсцы ў маленстве, лагоднеюць і дабрэюць. Ім прыемна, што нехта малады і новы цяпер падтрымлівае тое, ад чаго за савецкім часам іх адвучалі ў горадзе і з чаго смяяліся. Так, мне заўжды прыемна тэлефанаваць у свой ЖЭС: жанчына-дыспетчар сталага ўзросту, якая там працуе, заўжды радуецца маім скаргам на побытавыя паломкі... Таму што ёй надзвычайна падабаецца чуць пра іх па-беларуску!

Калі б беларуская мова была натуральнай з'явай у нашым грамадстве, то такіх (хоць часам і пазітыўных) рэакцый не існавала б. Для людзей было б нядзіўна пачуць беларускае слова ад мінака ці пакупніка ў краме. А так я часам адчуваю сябе нейкім дыназаўрам ці выкапнем, таму што даводзіцца тлумачыць прадавачкам, што такое «пакунак», «запалкі» альбо «марозіва». Тлумачыць, прыцягваючы сінонімы на дапамогу, выразна артыкулюючы, вымаўляць кожнае слова альбо наогул, перакладаць. І выслухваць рэплікі незадаволенасці, і трываць кплівыя позіркі.

Калі ты размаўляеш па-беларуску, то кожны дзень у грамадстве для цябе — гэта змаганне, бойка. Трэба кожнаму цікаўнаму як мінімум патлумачыць, чаму ты размаўляеш па-беларуску. Аднойчы прадавачка біжутэрыі на адным з самых вялікіх рынкаў Мінска спытала: «А вы па-беларуску прынцыпова размаўляеце?». — «Што?» — не зразумела я. «А вы па-руску?» — своечасова знайшлася. Для мяне размаўляць па-беларуску — гэта натуральна. У мяне гэта не выклікае пытанняў. Але сутыкаючыся штодня з непаразуменнем, я ўсё часцей думаю, што размаўляю на амаль-што-мёртвай-мове, і становіцца страшна. Людзі не прывыклі да (альбо адвыклі ад?) беларускай мовы, і майму маўленню стараюцца знайсці простае рацыянальнае тлумачэнне: вы, напэўна, вучыцеся на «беларускай філалогіі»! Не, я ўжо не вучуся наогул і ніколі не вучылася на «беларускай філалогіі»... А што — у беларуса, які не вучыўся на «беларускай філалогіі», няма падстаў размаўляць па-беларуску?!

Вольга ЧАЙКОЎСКАЯ.

Рэпетытар Яўген ЛІВЯНТ:

Школьная адукацыя: погляд

«Чаму вучань атрымлівае на іспыце ў школе 8—9 балаў з 10, а праз тыдзень на тэсце — 12—15 балаў са 100?..»

Яўген Барысавіч ЛІВЯНТ — аўтарытэтны рэпетытар, які легальна працуе з 2001 года, выкладчык матэматыкі і фізікі, рыхтуе штогод каля сотні вучняў. Да таго ж ён — тэлезорка: некалькі разоў яго запрашалі ў якасці эксперта на тэлешоу «Выбар». На размову са спадаром Яўгенам натхнілі вынікі цэнтралізаванага тэставання па фізіцы (73 % абітурыентаў атрымалі менш за 20 балаў) і матэматыцы (62,5 % абітурыентаў атрымалі менш за 20 балаў). Катастрофа школьнай адукацыі? Дрэннае выкладанне? Дрэнныя вучні? І гэта, і не толькі гэта, мяркуе Яўген ЛІВЯНТ.

«Я павінен быць удзячны Міністэрству адукацыі: з кожным годам у нас, рэпетытараў, усё больш працы»

— Спадар Яўген, якія школьнікі сёння звяртаюцца да вас як да рэпетытара?

— Як правіла, узровень ведаў у большасці сучасных школьнікаў вельмі нізкі. І з кожным годам ён робіцца ўсё ніжэйшы. Я павінен быць удзячны Міністэрству адукацыі: з кожным годам у нас, рэпетытараў, усё больш працы! У Мінску засталося літаральна 5-6 школ, дзе больш-менш прыстойны ўзровень ведаў па матэматыцы. Што датычна фізікі, то практычна ні ў аднаго вучня ніякіх ведаў па фізіцы няма. Калі прыходзіць вучань займацца да мяне матэматыкай, я стараюся выявіць яго пачатковы ўзровень, каб было ад чаго адштурхоўвацца. Калі ж прыходзіць вучань займацца фізікай, я ні пра што яго не пытаюся, бо ведаю, што ён нічога не ведае. І вельмі рэдка моцна здзіўляюся, калі вучань усё ж нешта ведае. Сёлета з некалькіх дзясяткаў маіх вучняў па фізіцы нешта ведаў адзін.

— Вашы словы пацвярджаюць стабільна нізкія вынікі на цэнтралізаваным тэставанні па згаданых прадметах...

— Ну так, бо падае таксама ўзровень настаўнікаў. Добрыя настаўнікі, якіх раней было вельмі шмат, альбо сыходзяць на пенсію, альбо ў рэпетытары. А на іхняе месца прыходзяць выпускнікі педінстытутаў. Гэта ў асноўнай масе нават не троечнікі, а двоечнікі. Пра гэта гавораць прахадныя балы ў педагагічныя ВНУ — як у Мінску, так і ў іншых гарадах. Яны ў сярэднім — 150-160 балаў з 400. Палічым. Сярэдні бал атэстата ў Мінску — 70-80. Атрымліваецца, што на трох тэстах, якія засталіся, вучань набірае недзе 70 балаў. Значыць, на адным тэсце ён набірае 20-25 балаў. Гэта ўзровень двоечніка, у лепшым выпадку троечніка! Зразумела, што ніякая вучоба ў інстытуце не зробіць з двоечніка выдатнага выкладчыка! Раней было інакш. Хоць і тады ў педінстытут ішлі не толькі лепшыя вучні, але і харашысты, і рэдка калі троечнікі.

— А чаму атрымліваецца так, што на выпускных іспытах у школе дзеці атрымліваюць высокія балы — 8, 9 (з дзесяці). А праз колькі тыдняў на цэнтралізаваным тэставанні — 12, 15, 18 (са ста)?..

— Калі б іспыты ў школе адбываліся так, як павінны, нікога б не здзівілі такія нізкія вынікі на цэнтралізаваным тэставанні. Пра тое, што іспыты ў школах — гэта, можна сказаць, прафанацыя, ведаюць усе, хто працуе ў сістэме адукацыі. Магчыма, многія робяць выгляд, што яны гэтага не ведаюць. Як праходзіць іспыт, скажам, па матэматыцы? Ёсць зборнікі экзаменацыйных матэрыялаў па матэматыцы, яны выдадзеныя. Афіцыйна выдадзеныя рашальнікі гэтых задач. Таксама шырока распаўсюджаныя і прадаюцца рашальнікі ў выглядзе шпаргалак. Калі вучань ідзе на іспыт — ён заўжды мае такі рашальнік. Рашальнік схаваны ў яго ў кішэні, ён жа схаваны за батарэяй у калідоры, ён жа схаваны ў прыбіральні, гэты ж рашальнік маюць і бацькі, якія сядзяць у суседнім пакоі з кавай-гарбатай. І яшчэ гэтыя рашальнікі маюць настаўнікі. Схемаў некалькі. Першая — настаўнік шчыра дае вучням спісаць. Прычым ён кантралюе, каб «шасцёрачнік» не спісаў на дзясятку. А вось калі вучань ідзе на медаль — у гэтым выпадку ён абавязкова пасля іспыта застанецца ў школе, ягоная праца будзе вычытаная ўсімі выкладчыкамі. Усе пымылкі будуць выпраўленыя, а калі выпраўленняў будзе больш чым трэба, праца будзе ахайна перапісаная вучнем. У некаторых школах так нахабна не спісваюць. Тады вучань чакае, пакуль настаўнік выйдзе. Альбо сам выходзіць — у прыбіральню ці пад'есці (гэта дазваляецца). І нават калі ў школе ёсць праваралькі, гэта не праблема, бо і яны ўсё ведаюць, усё разумеюць.

«Тэст цягнецца тры гадзіны, але палова вучняў сыходзіць у першыя паўгадзіны»

— Спадар Яўген, калі «ўсе ўсё ведаюць», навошта гэта?

— Я і сам не разумею! Гэта сакрэт палішыняля! А пасля прыходзяць вынікі тэставання — і ўсё робіцца зразумелым. У гэтым годзе тэставанне было самае простае і карэктнае за ўсе папярэднія гады, цалкам у межах школьнай праграмы. А сярэдні бал быў ніжэйшы, чым раней: па рэспубліцы 18 па фізіцы і 21 па матэматыцы!

— Але ж гэта — блізка да нуля!..

— А вы ведаеце, што тэст цягнецца тры гадзіны, але палова ўсіх абітурыентаў сыходзіць у першыя паўгадзіны? Чаму яны не змагаюцца?! А таму, што яны ў прынцыпе не разумеюць, пра што ідзе гаворка ў тэсце! Гэта адзіная прычына, чаму можа сысці абітурыент: словы, якія ён бачыць, не стыкуюцца ў сказы і тэкст. Таму ён наўздагад расстаўляе значкі, рашае самае простае, што ведае, — і сыходзіць. А праз гадзіну ў аўдыторыі застаецца 20—30 % абітурыентаў, і так — усе апошнія гады.

— Недаверлівы чытач пра вашы расповеды пра спісванне на іспытах скажа: нібыта са свечкай стаяў! Адкуль у вас такія сакрэтныя звесткі?

— Ніякі гэта не сакрэт! Гэта нейкая дурацкая гульня! Я разумею, калі людзі ашукваюць адно аднаго з нейкім сэнсам — скажам, гуляючы ў карты. Які сэнс ашукваць тут? Далі вы вучню спісаць, паставілі «восем» — а праз тыдзень ён атрымаў на тэставанні 14 балаў са 100 магчымых. Які сэнс? Мае словы можна праверыць двума спосабамі. Першы спосаб — нечакана прыйсці ў школу і даць вучням напісаць кантрольную. Другі — няхай чытачы «Звязды» (вучні, настаўнікі, бацькі...) дашлюць у рэдакцыю свае водгукі, як праходзяць іспыты ў школе. Думаю, вы атрымаеце гісторыі, цікавейшыя за мае.

— Ад вучняў, якія праходзілі тэставанне, даводзілася чуць: там вельмі складана, мы гэта ў школе не праходзілі. Ці сапраўды выходзяць заданні на тэстах за межы школьнай праграмы?

— Выходзяць — у тым сэнсе, што ў школе яны нічога не рашаюць. Не таму, што гэта не ўваходзіць у школьную праграму, а таму, што на ўроках вучні гэтым не займаюцца. Прывяду вам просты прыклад: у тэстах гэтага года палова абітурыентаў не адказала на пытанне, у якіх адзінках вымяраецца напружанне! Хоць, мне расказвалі вучні, на некалькі заданняў вышэй была фраза (у іншай задачы): «Напружанне ў ланцугу 220 вольт...» І гэта — не ўсе выпускнікі школ, а толькі тыя, каму для паступлення трэба здаваць фізіку, яны мусілі рыхтавацца.

«На выпускніках гэтага года выпрабавалі 4 рэформы адукацыі. Што ад іх патрабаваць?»

— А хто ў такім выпадку паступае ва ўніверсітэты, калі на тэстах усе такія дурні і пішуць на 18 балаў?

— Для мяне таксама загадка: навошта вышэйшая адукацыя для чалавека, які набірае такія нізкія балы? Нельга браць такіх вучняў ва ўніверсітэт! Універсітэт — гэта не дзіцячы садок, дзе вучаць з нуля. Без пэўнага ўзроўню ведаў там рабіць няма чаго. Мне нядаўна расказаў знаёмы дацэнт універсітэта рэальны выпадак. Студэнт здае іспыт. У яго пытанне — трэці закон тэрмадынамікі, дзе гаворыцца, што «тэмпература 0 К (чытаецца: «нуль Кельвін» — **Г.Л.**) недасягальная». Студэнт вымавіў гэтую фразу так: «Тэмпература О'кей — недасягальная»... А бачылі б вы, колькі памылак робяць студэнты, калі пішуць нейкія заявы ў дэканаце...

— Як вы мяркуеце, ці можа сёння школа — без рэпетытараў — падрыхтаваць вучня да годнага паступлення ва ўніверсітэт?

— У нас усе дыскусіі па адукацыю зводзяцца да пытанняў «Вы «за» ці «супраць» школьнай формы?», «Вы «за» ці «супраць» тэставання?» Усе гавораць пра форму — і ніхто не кажа пра змест. Узровень настаўнікаў падае, адпаведна падае іх аўтарытэт, адпаведна фарміруецца стаўленне вучняў да прадмета. Падручнікі — катастрафічныя. Праграмы — часам вельмі дзіўныя... *(на гэтым месцы спадар Яўген доўга і падрабязна прыводзіць прыклады — **Г.Л.**)*

— Недаверлівы чытач зноўку закіне вам: вось, які ён разумны, усё яму дрэнна. А чаму не прапануе, як палепшыць сітуацыю?

— Я, дарэчы, таксама не люблю людзей, якія кажуць, як усё дрэнна і нічога не прапануюць. Але сітуацыя ў адукацыі настолькі дрэнная, што нейкі просты чароўны рэцэпт ужо складана прапанаваць. Гэта павінен быць комплекс мерапрыемстваў на дзяржаўным узроўні, каб нешта змяніць: падручнікі, праграмы, заробак настаўнікам, узровень падрыхтоўкі настаўнікаў, бюракратыя ў школе... Такой бюракратыі не было ніколі! Калі я заканчваў школу, а пасля прыйшоў працаваць маладым настаўнікам, у кожнай школе была медсястра, у многіх школах — лекар, зубны кабінет. І была адна сакратарка, якая часам нешта стукала на савецкай друкарцы. Цяпер у Мінску адна медсястра на тры школы, ніякіх лекараў. Затое ў кожнай школе ёсць машбюро, у якім 3-4 чалавекі на сучаснай тэхніцы сядзяць і цэлымі днямі друкуюць ды памнажаюць дакументы. Дырэктар і завуч, замест таго, каб арганізоўваць навучальны працэс, таксама большую частку часу працуюць з дакументамі! Тое самае — псіхолагі і сацыяльныя педагогі! А доследы паказваць перасталі, лабараторныя работы праводзяцца тэарэтычна...

— Але што рабіць з гэтымі ганебнымі вынікамі тэстаў — 15-20 балаў?

— Сістэма тэставання — гэта адзіная сістэма ў нашай адукацыі, якая працуе добра, яна празрыстая і некарумпаваная. Ёсць два варыянты развіцця падзей. Першы, неверагодны: людзі, якія праводзілі гэтыя бясконцыя рэформы адукацыі... Патлумачу адразу, чаму «бясконцыя». Выпускнікі гэтага года пайшлі ў школу ў нулявы клас (а не ў першы). Затым яны з 4 класа пераскочылі ў шосты. Потым яны два гады вучыліся ў дзявятым класе. Потым яны з дзявятага пераскочылі ў адзінаццаты, дзе прайшлі матэрыял двух апошніх класаў за адзін год. Што хацець ад гэтых дзяцей?! Яны як падследняя сабакі! На іх выпрабавалі 4 рэформы! А рэформа — гэта не толькі змена класаў, гэта — змена праграм, змена падручнікаў! Дык вось, першы варыянт неверагодны: людзі, якія праводзілі ўсе гэты

ПАЧЫНАЦЬ ЭКСПАРТАВАЦЬ НЯЛЁГКА. АЛЕ ГАЛОЎНАЕ — ПАЧАЦЬ

Барысаўскі шпаланасычальны завод

1

2


3

Калі на Барысаўскім шпаланасычальным заводзе і ўзгадваюць пра сёлетняе гарачае лета, то маюць на ўвазе не толькі яго спякоту, але і той напружаны рытм, у якім калектыў працуе. «Без выхадных працуем, па 12 гадзін у суткі, а што датычыцца непасрэдна ўчастка па насычэнні драўляных шпалаў антысептыкамі, — там увогуле кругласутачны рэжым. Прыпыняемся толькі на два дні ў месяц», — так казалі на заводзе падчас яго наведвання.

Зразумела ўжо, прадукцыя завода (асноўная) — гэта чыгуначныя драўляныя шпалы, апрацаваныя спецыяльнымі антысептычнымі саставамі, якія ахоўваюць іх ад гнілі, ад уздзеяння грыбкоў і мікраарганізмаў і ў выніку ў некалькі разоў павялічваюць тэрмін іх службы. Зразумела таксама, што шпальная прадукцыя завода, нягледзячы на яе драўлянае паходжанне і цяперашні моцны ціск на рынак жалезабетону (г. зн. жалезабетонных шпалаў) — добра запатрабаваная.

Пра гэта няблага сведчаць і амаль поўная адсутнасць на прадпрыемстве так званых запасаў, і тэмпы росту вытворчасці (за паўгоддзе — 106,6 працэнта) і іншыя вытворча-эканамічныя паказчыкі. На заводзе пры ўсім гэтым падкрэсліваюць, што іх прадпрыемства — адзінае такога кшталту ў краіне, што яно разам з тым налічвае 110-гадовую гісторыю. Ну, а да ўсяго гэтага мы наведалі завод якраз напярэдадні Дня чыгуначніка — прафесійнага свята, якое разам з усімі працаўнікамі чыгуначнага транспарту адзначаюць і працаўнікі Барысаўскага шпаланасычальнага завода. Зразумела ж ужо, што гэта прадпрыемства адносіцца да чыгуначнага ведамства, пераважна на яго патрэбы і працуе...

На Барысаўскім шпаланасычальным заводзе даводзілася бываць раней, года паўтара таму. Што тут змянілася за апошні час?

Спачатку яшчэ раз нагадаем: шпалы тут праходзяць антысептычную апрацоўку пад высокім ціскам у герметычных вялізных (даўжынёй па 24 метры) аўтаклавах, пасля чаго яны і набываюць высокую ўстойлівасць да розных прыродных уздзеянняў. Так, адзін кубаметр драўніны «паглынае» сваёй вонкавай паверхняй да 90 кілаграмаў антысептыку. Адпаведны тэхналагічны працэс — поўнасцю аўтаматызаваны, з камп'ютарным кіраваннем. На заводзе некалькі гадоў таму правялі маштабную рэканструкцыю, у выніку якой атрымалі не толькі цяперашнюю высокамеханізаваную вытворчасць, але і аб'ёмістыя склады для захоўвання і натуральнага прасушвання драўніны (яна ў працэс павінна ісці з вільготнасцю не болей за 25 працэнтаў), свой участак лесапілавання (шпалы для прадпрыемства пастаўляюць лесанарыхтоўчыя прадпрыемствы, разам з тым цяпер 10 працэнтаў іх тут рыхтуюць самі), эфектыўную сістэму пажаратушэння, а таксама добраўпарадкаваныя бытавыя памяшканні. А яшчэ тут шмат зрабілі ў экалагічным плане. Напэўна, не варта тлумачыць: вытворчасць па насычэнні шпалаў антысептыкамі — не зусім «чыстая», і пэўны час таму не надта прыемныя хімічныя пахі даймалі нават тых, хто знаходзіўся за тэрыторыяй завода, гэта значыць жыхароў навакольных дамоў. Цяпер жа гэтыя пахі, як зазначаюць на заводзе, поўнасцю лакалізавалі; скарацілася колькасць працоўных месцаў са шкоднымі ўмовамі, на заводзе ўкаранілі зваротнае водазабеспячэнне, што значна зменшыла скідванне вады на ачышчальныя збудаванні. Словам, уся вытворчасць завода, яго цэхі і ўчасткі набылі, так бы мовіць, сучасны, цывілізаваны выгляд, што ўжо само па сабе сведчыць на карысць высокай культуры вытворчасці. Сведчаннем гэтага з'яўляецца і тое, што вытворчасць Барысаўскага шпаланасычальнага завода сертыфікаваная на яе адпаведнасць высокім патрабаванням міжнародных стандартаў ICO 9001, а цяпер на прадпрыемстве сур'ёзна рыхтуюцца да сертыфікацыі па экалагічных пытаннях і пытаннях аховы працы — зноў жа, у адпаведнасці з міжнароднымі стандартамі. Пра адпаведную культуру вытворчасці сведчыць і сам знешні выгляд прадпрыемства з акуратнай, добраўпарадкаванай тэрыторыяй.

* * *

Аднак што новага на Барысаўскім шпаланасычальным заводзе з'явілася за апошні час? Напэўна, самае галоўнае: тут упершыню за апошнія 7 гадоў зноў выйшлі са сваёй шпальнай прадукцыяй на экспартныя пазіцыі.

— Мы пачалі пастаўляць свае шпалы ў Латвію, — расказваў дырэктар завода Аляксандр Пашкееў. — Гэта пакуль што невялікія аб'ёмы, але галоўнае — менавіта пачаць, прычым мы выйгралі гэты рынак у даволі нялёгкім конкурсе. Ідуць таксама адпаведныя перамовы з Літвой, мяркую, хутка выйдзем на рынак і гэтай краіны...

4

І не толькі рынкі гэтых краін маюць на ўвазе на барысаўскім заводзе. Пробны вагон сваіх шпалаў адправіла прадпрыемства і ў Арменію. Наладжваюцца таксама партнёрскія адносіны з Расіяй. Як паведаміла інжынер-тэхнолаг завода Ала Маеўская, расіяне прапануюць цікавую тэхналогію насычэння асіны пад высокім ціскам, якая пасля гэтага набывае ўласцівасці і моц дубу. Цяпер чыгуначныя шпалы вырабляюцца на заводзе з елкі і хвоі, і, зразумела, дабаўленне да гэтых больш каштоўных парод дрэваў таннейшай за іх асіны нясе з сабой пэўныя выгоды. На заводзе таксама не так даўно атрымалі сертыфікат якасці расійскай чыгункі — вядома, з мэтай асваення гэтага рынку — можа, найбольш прывабнага.

Як падкрэсліваюць на заводзе, тут апошнім жа часам дасягнулі добрага прагрэсу ў асваенні новага віду антысептыкаў — водарастваральных. Традыцыйна шпалы насычаюцца антысептыкам, прыгатаваным на аснове масла, якое атрымліваюць з каруцых сланцаў. Аднак гэта тэхналогія ўжо не прымаецца больш далікатным у экалагічных адносінах Захадам і, зразумела ж, — і тымі ж прыбалтыйскімі краінамі. Водарастваральныя антысептыкі, як падкрэсліваюць на барысаўскім прадпрыемстве, акрамя таго, што яны экалагічна больш чыстыя, яны і больш прымальныя ў плане энергазберажэння. Тое ж сланцавае масла патрабуе папярэдняга немалога награвання, а пры гэтым, зразумела, і адпаведных энергарэсурсаў, і не патрабуюць такога награвання водарастваральныя антысептыкі.

Аднак як масляныя сланцавыя антысептыкі, так і водарастваральныя — гэта імпарт (першыя — эстонскага паходжання, другія — чэшскага і англійскага), і не зусім танны імпарт. На замену гэтага імпарту скіраваная сумесная распрацоўка (разам са спецыялістамі Беларускага тэхналагічнага ўніверсітэта), якая мае на ўвазе стварэнне антысептыку на базе айчынных прадуктаў нафтаперапрацоўкі.

З якім настроем сустракае калектыў сваё прафесійнае свята, што яшчэ прыкідваюць тут на найбліжэйшую перспектыву?

— Працуем, выконваем план; заработная плата, падаткі — своечасова, плата за энерганосьбіты — таксама своечасовая, — падкрэсліваў дырэктар завода Аляксандр Пашкееў. — Рыхтуемся да акцыянавання, пры гэтым не так даўно ў нас прайшла сур'ёзная комплексная праверка Камітэта дзяржаўнага кантролю, і якіх-небудзь парушэнняў не было знойдзена.

Што датычыцца далейшай перспектывы, на прадпрыемстве распрацаваны праект мадэрнізацыі нашай лесапільнай вытворчасці. У выніку будзем больш вырабляць сваіх шпалаў. (Мы іх пераважна атрымліваем ад лесанарыхтоўчых прадпрыемстваў.) Думаем таксама паставіць сваю лінію па абкорванні слупоў, прызначаных для ліній электраперадач. У нас ужо ёсць пэўная дамоўленасць з Міністэрствам энергетыкі наконт пастаўкі яму такіх апораў. Словам, будзем пашыраць сферу сваёй дзейнасці, прычым да гэтай прадукцыі ёсць зацікаўленасць і за межамі краіны. Думаем таксама паставіць лінію па наколванні драўніны перад яе антысептычнай апрацоўкай, з тым, каб гэта апрацоўка была больш глыбокай. Гэту аперацыю, у прыватнасці, прадугледжвае еўрапейскі стандарт. Ну, а ў нас, вядома, з'явяцца большыя экспартныя магчымасці.

І на заканчэнне яшчэ раз адзначу: у нас нялёгкая праца, тым не меней у калектыве ўсе ставяцца да яе з належнай адказнасцю, усе на заводзе заслугоўваюць (і можа, гэта асабліва трэба падкрэсліць менавіта напярэдадні нашага прафесійнага свята) самых добрых слоў. Вялікая група нашых працаўнікоў будзе адзначана ў сувязі з гэтым святам, практычна ўсе атрымаюць прэміі. Яшчэ раз падкрэслю: усе яны заслугоўваюць гэтага. Віншую ўсіх з нашым прафесійным святам. А таксама ад імя калектыву завода віншую нашых калегаў-чыгуначнікаў. Няхай заўсёды спадарожнічаюць ім поспехі, удача і павага людзей.

* * *

На гэтых добрых словах Аляксандра Пашкеева, дарэчы — выдатніка чыгункі, можна было б і закончыць, але ж мы неяк амаль што нічога не сказалі яшчэ пра адно свята калектыву Барысаўскага шпаланасычальнага — 110-годдзе з дня яго заснавання. Пры гэтым, варта нагадаць, ля вытокаў яго стварэння стаяў сам рускі цар Мікалай II. Дальнабачны быў цар, калі сваёй уладарнай рукой распарадзіўся заняць пад завод зямлю, якая належала тады аднаму з барысаўскіх купцоў Івану Каладзееву і якую той не зусім хацеў уступаць. Але ж вельмі нялёгка было штонебудзь запярэчыць супраць царскага «Повелеваем». Тым болей і зямлю цар забіраў, так бы мовіць, цывілізавана — за грошы, і прызначалася яна паслужыць на агульную карысць.

Іван БАРАНОЎСКІ.

УНП 600012389.

НА ЗДЫМКАХ:

1. Дырэктар прадпрыемства Аляксандр ПАШКЕЕЎ.

2. Інжынер-тэхнолаг Ала МАЕЎСКАЯ.

3. Майстар участка Віктар ЧЫСЦЯКОЎ і аператар Ігар ІГНАТОВІЧ.

4. Участак насычэння і адгрузкі шпалаў: стропальшчыкі Іван ДЗЯРУГА і Андрэй ЧАРНОЎ.

5. Машыніст цеплавоза Віктар ЛУХЦІН.

6. Брыгадзір сантэхнікаў Алег ВЯРШКОЎ — адзін з лепшых рацыяналізатараў завода.

7. У дрэваапрацоўчым цэху завода. На здымку: станочнік цэха Аляксандр ДАНІЛАЎ.

Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.

5

6

7

ЗМАГАЦЦА З ХВАРОБАМІ СЭРЦА ТРЭБА ПАЧЫНАЦЬ... З ГАЛАВЫ

А дакладней з уздзеяння на свядомасць людзей, бо ў большасці нашых немачаў вінаватыя мы самі

АСНОЎНЫМІ хваробамі, якія «забіваюць» людзей, з'яўляюцца сардэчна-сасудзістыя. Так, у 2010 годзе ў структуры смяротнасці сардэчна-сасудзістыя захворванні (ССЗ) складаюць 54 працэнты, далей ідуць анкалагічныя (15,6 працэнта).

Беларускія медыкі дасягнулі вялікіх поспехаў у галіне кардыялогіі, у нас праводзяцца такія ж складаныя аперацыі, як і ў Еўропе (на гэты час у Беларусі праведзена 10 аперацый па перасадцы сэрца). Але высокія тэхналогіі ў медыцыне не вырашаюць у цэлым праблему смяротнасці ад сардэчна-сасудзістых хвароб, упэўнены **дырэктар Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра «Кардыялогія», акадэмік Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, доктар медыцынскіх навук, прафесар Аляксандр МРОЧАК.** «Асноўны шлях паніжэння смяротнасці і захворванняў і сацыяльных затрат, якія звязаны з лячэннем людзей, — гэта прафілактыка, якая заключаецца ў змяненні ладу жыцця і фактараў асяроддзя», — заўважае Аляксандр Генадзьевіч.

Аказваецца, наша сэрца чуйна рэагуе нават на эканамічныя праблемы. Так, падчас сусветнага эканамічнага крызісу ў Амерыцы і еўрапейскіх краінах спецыялісты адзначалі рост ССЗ . У Беларусі летась таксама адзначана павышэнне смяротнасці ад сардэчных захворванняў — 73 тысячы чалавек (за год да таго — 70 тысяч). Сёння спецыялісты заўважаюць тэндэнцыю да зніжэння смяротнасці. Магчыма, гэта звязана не толькі з тым, што людзі перажывалі стрэсавыя сітуацыі, але і з тым, што адчуваючы адсутнасць перспектыў, маглі брацца за цыгарэты і алкаголь.

Ёсць фактары росту колькасці хвароб кровазвароту, на якія ўплываць не магчыма, напрыклад, старэнне насельніцтва, генетычныя захворванні і нават... пол пацыентаў. Заўважана, што каронарнай хваробай сэрца мужчыны хварэюць часцей за жанчын. Існуюць розныя версіі, чаму так адбываецца: маўляў, сярод мужчын больш курцоў і выпівох, ці што так распарадзілася прырода, бо моцны пол менш запатрабаваны для працягнення роду, ці што гэта звязана з мужчынскім гарманальным станам.

Але многія маглі б пазбегнуць сардэчных хвароб, калі б проста змянілі лад жыцця. І, відаць, тут трэба ўздзейнічаць не толькі на людзей, якія ўжо маюць пэўныя паталогіі, а мяняць стэрэатыпы грамадства ў цэлым. Толькі тады можна зменшыць захворванні сістэм кровазвароту, калі масава ўздзейнічаць на папуляцыю, выкараняць фактары рызыкі, мадыфікаваць стыль здаровага чалавека, запэўнівае дырэктар РНПЦ «Кардыялогія». «Як вы паставіцеся да таго, што чалавек прыйдзе і высмаркаецца ў фіранку? Можа, прыклад не зусім добры для прэсы. Але менавіта такімі несумяшчальнымі з меркаваннямі калектыву павінны быць адносіны да фактараў рызыкі, адным з якіх з'яўляецца курэнне», — заўважае Аляксандр Мрочак.

ЗАЎВАГА ШЦІРЛІЦУ...

У сардэчна-сасудзістых і анкалагічных хваробаў аднолькавыя фактары захворвання. Адзін з самых істотных — курэнне. Штогод памірае каля 5 мільёнаў прыхільнікаў гэтай дурной звычкі. Яшчэ ў 1946 годзе амерыканцы распачалі даследаванні, каб высветліць асноўныя фактары сардэчна-сасудзістай паталогіі. У 1975-м тут была прынятая нацыянальная праграма, падчас якой удалося сур'ёзна зменшыць колькасць такіх хвароб, у многім за кошт таго, што колькасць курцоў у краіне знізілася з 70 працэнтаў да 20. У Беларусі ж сёння тытунёвая індустрыя актыўна развіваецца і колькасць людзей з цыгарэтай павялічваецца з кожным годам. Змагацца трэба з тытунёвымі стэрэатыпамі, напрыклад, такім, што падлетак з цыгарэтай выглядае больш дарослым. Часам станоўчы вобраз курца ствараецца дзякуючы тэлебачанню. «Станоўчыя героі падчас роздуму курацьць. Узгадаю эпізод пра Шцірліца: поўная попельніца недакуркаў дэманструе самаадданы мысліцельны працэс разведчыка. Так прапагандуюцца згубныя прывычкі, якія пасля фарміруюць паталогіі, з якімі ўрачы гераічна змагаюцца», — заўважае Аляксандр Мрочак. — Нядаўна ў Галандыі было праведзена даследаванне, звесткі якога былі «накладзеныя» на цэлы горад. Паспрабуйце іх прывесці ў дачыненні да Мінска. Так, калі ўсе жыхары сталіцы кінуць курыць, у першыя ж суткі на 15 працэнтаў менш будзе выязджаць «хуткая дапамога» з нагоды каронарных прыступаў і павышанага артэрыяльнага ціску». Вось бы хто яшчэ правёў даследаванні, эканамічныя разлікі, што выгадней дзяржаве: атрымліваць грошы ад продажу цыгарэт ці выдаткоўваць вялікія сродкі на лячэнне хваробаў, выкліканых курэннем.

СУПРАЦЬ СКВАРКІ І ЧАРКІ...

Яшчэ адзін з фактараў рызыкі, які «ператварае» людзей у «сардэчнікаў» — тлустая, высокакаларыйная ежа. У Беларусі, як і ў многіх іншых краінах, павялічваецца колькасць людзей з павышанай масай цела, што можа суправаджацца ростам захворвання на цукровы дыябет другога тыпу, што, у сваю чаргу, правакуе высокі артэрыяльны ціск і частату каронарнай паталогіі. «Так, нацыянальная кухня павінна існаваць, але яе трэба карэктаваць пад «перспектывы» папуляцыі. Не трэба ствараць стэрэатып, што беларуская кухня — гэта скварка і чарка», — заключае Аляксандр Генадзьевіч.

Ёсць шмат даследаванняў, якія сведчаць, што алкаголь не такі актыўны ў плане фарміравання каронарнай паталогіі. «Сёння я гляджу праграму «Раніца», і карэспандэнт кажа, што на працягу паўгода бюджэт Рэспублікі Беларусь папоўніўся 916 мільёнамі долараў за кошт продажу алкагольных напояў. А я скажу як доктар: так, магчыма, алкаголь не з'яўляецца правакатарам фарміравання атэрасклерозу, затое алкаголь з'яўляецца правакатарам раптоўнай смерці ў асобаў, хворых на атэрасклероз», — заўважае Аляксандр Мрочак.

МАЎКЛІВЫ ЗАБОЙЦА

Артэрыяльную гіпертэнзію называюць таемным, ці маўклівым забойцам, бо ў многіх гэтая хвароба працякае бессімптомна, людзі могуць і не ведаць, што ў іх павышаны ціск. Прынамсі, яна адна з самых распаўсюджаных, у цывілізаваных краінах свету на яе хварэе каля 30 працэнтаў насельніцтва. Калі не кантраляваць ціск, можа развіцца ўскладненне, часцей за ўсё інсульт, на другім месцы інфаркт, на трэцім — нырачная недастатковасць.

У многіх краінах ужо дзейнічаюць адпаведныя праграмы, скіраваныя на барацьбу з высокім ціскам. Так, шырокавядомы паўночна-карэльскі эксперымент: толькі за кошт зніжэння спажывання солі насельніцтвам на 20 працэнтаў знізіліся сардэчна-сасудзістыя захворванні. Таму і беларускія ўрачы пацыентам з артэрыяльным ціскам рэкамендуюць менш ужываць солі, якая спрыяе хваробе.

Адным з правакатараў развіцця атэрасклерозу з'яўляецца гіперхалестэрынемія, парушэнне ліпіднага складу крыві. Тут трэба пераймаць практыку іншых краін, дзе праводзяцца спецыяльныя мерапрыемствы. Бо калі ўзровень халестэрыну на 5 працэнтаў змяншаецца, на 5 працэнтаў у структуры смяротнасці памяншаецца частата каронарнай паталогіі.

Аляксандр Мрочак паведаміў, што ліпеньская спякота не стала экстрэмальнай з'явай для сардэчнікаў: «Для людзей з сардэчна-сасудзістымі захворваннямі больш істотны ўплыў аказвае не столькі спякота, колькі хуткае змяненне клімату. Калі Беларусь пераходзіла з больш умеранага клімату ў спякоту, колькасць зваротаў да дактароў, выклікаў «хуткай дапамогі» была высокай. А цяпер яна такая ж, як была да спякоты. Арганізм прызвычайваецца і да спякоты, і да маразоў. Але людзі, якія прымаюць прэпараты ад гіпертэнзіі, пры такім надвор'і павінны быць асцярожнымі (такія прэпараты пашыраюць сасуды, але сасуды пашыраюцца і ў выніку рэакцыі на саму спякоту).

Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.

Прамая лінія

ЯЗВА АДСТУПІЛА. НАСТУПІЛА ПЯКОТКА

(Працяг. Пачатак у нумарах за 29 і 30 ліпеня.)

На пытанні чытачоў адказалі дацэнт 2-й кафедры ўнутраных хвароб Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта, кандыдат медыцынскіх навук Мікалай КАПРАЛАЎ і дацэнт гэтай жа кафедры, кандыдат медыцынскіх навук Ірына ШАЛАМІЦКАЯ.

☎ ***— Салігорск, Наталля. У мяне паніжаная кіслотнасць страўніка, а ў мужа — павышаная. Якой дыеты трэба прытрымлівацца кожнаму з нас? І які можна знайсці кампраміс у харчаванні, каб смачны абед падыходзіў нам абодвум?***

— Істотную ролю адыгрываюць прадукты харчавання, якія стымулююць унутрыстраўнікавую кіслотную прадукцыю. Да іх адносяцца сокі, перш за ўсё гранатавы, таматны, лімонны. Добра дапамагае гарбата з лімонам, бо натуральная лімонная кіслата валодае добрым кіслотастымулюючым дзеяннем. Пры павышанай кіслотнасці рэкамендуюцца сокі бульбы, белакачаннай капусты.

А вам абодвум падыдуць любыя кашы, ненаварыстыя дыетычныя булёны, адваранае або тушанае мяса і рыба, вараная ці паравая бульба. Акрамя дыетычных рэкамендацый, пры пацверджанай лабараторна-інструментальнымі даследаваннямі парушанай кіслотнай прадукцыі можа быць выкарыстана вялікая група лекавых прэпаратаў, прызначаных спецыялістам.

☎ ***— Мядзел, Таццяна. Цяпер у свабодным продажы шмат розных сродкаў ад дыскамфорту ў страўніку. Чым яны адрозніваюцца адзін ад аднаго?***

— Сапраўды, сёння паліцы ў аптэчнай сеткі дастаткова запоўнены прэпаратамі для лячэння хвароб страўнікава-кішачнага тракта. Лекі, якія мы выкарыстоўваем у гастраэнтэралогіі, дзеляцца на вялікую колькасць груп. І адрозніваюцца яны, у першую чаргу, механізмам дзеяння. Але даваць рэкамендацыю аб выбары прэпарата павінен толькі ўрач індывідуальна.

☎ ***— Астравец, Людміла Пятроўна. Ці заўсёды пры язвавай хваробе патрабуецца аперацыя?***

— Не заўсёды. Большасць страўнікава-кішачных язваў і язваў стрававода вельмі эфектыўна лечацца кансерватыўным метадам. Яшчэ гадоў трыццаць таму мы лячылі язву страўніка на працягу 1,5—2 месяцаў. Тады выбар прэпаратаў быў зусім невялікі. Але час змяніўся, і ў арсенале ўрача-гастраэнтэролага цяпер ёсць магутныя лекавыя прэпараты з язварубцуючым, язвазагойвальным дзеяннем. Распрацаваны і дакладныя схемы знішчэння бактэрыі хелікабактар пілары, якая была адкрыта каля 25 гадоў таму. Знішчэнне гэтай бактэрыі цяпер прыводзіць да выздараўлення ад хваробы без выкарыстання хірургічнага метаду лячэння. Зараз язву ў стацыянары мы лечым 10—12 дзён.

Пераважная колькасць хворых лечыцца кансерватыўным метадам. Аднак аперацыі застаюцца ў арсенале гастраэнтэролагаў і хірургаў. Да іх звяртаюцца ў асноўным пры ўскладненай язве, звязанай з кровацячэннем, перфарацыяй, калі разрываецца сценка страўніка або кішэчніка і змесціва выліваецца ў брушную поласць.

☎ ***— Гомельская вобласць, Ніна Іванаўна. У мяне — панкрэатыт. Якія прадукты неабходна ўжываць пры гэтым захворванні?***

— Калі ў вас востры панкрэатыт, то першыя 2—3 дні павінны быць поўнасцю галоднымі. Можна пакласці пузыр з лёдам на вобласць падстраўнікавай залозы.

Пры хранічным панкрэатыце харчаванне павінна быць частым, маленькімі порцыямі, як правіла, 4—5 разоў на дзень. Ежу варта ўжываць у адвараным, паравым, запечаным выглядзе, рэкамендуюцца вязкія кашы. Выключаецца смажанае, тлустае, салёнае, вэнджанае, алкаголь. На перыяд абвастрэння хваробы не рэкамендуецца сырая садавіна і гародніна.

☎ ***— Маладзечна, Іна Георгіеўна. Мне 85 гадоў. Скажыце, калі ласка, ці павінна я захоўваць пэўны рэжым харчавання. Калі так, то які?***

— Пэўнага рэжыму харчавання павінны прытрымлівацца практычна ўсе людзі і тым больш людзі старэйшай узроставай групы, у якіх вельмі вялікая верагоднасць развіцця атэрасклерозу. Таму трэба прытрымлівацца антыхалестэрынавай дыеты. Ужываць нятлустыя гатункі мяса — белае мяса птушкі, ялавічыну, цяляціну. Мяса варта варыць або гатаваць на пары.

Неабходна сачыць за ўзроўнем глюкозы ў крыві. Калі ёсць схільнасць да цукровага дыябету, то прадукты харчавання павінны быць з нізкім утрыманнем вугляводаў — несалодкія гатункі яблыкаў, вінаграду, іншай садавіны і гародніны. Харчавацца трэба невялікімі і частымі порцыямі, дзесьці праз кожныя 2—3 гадзіны. Варта абмежаваць соль — 5—6 г у суткі.

☎ ***— Стоўбцы, Надзея. Чула, што пры язве галоўнае — есці часта і, па вялікім рахунку, можна ўжываць любыя прадукты. Ці праўда гэта?***

— Пры абвастрэнні язвы любыя прадукты не ўжываюць. Трэба захоўваць рэжым харчавання і дыету. А любыя прадукты можна есці, калі язва зарубцавалася. Харчавацца трэба маленькімі порцыямі, часта. З працыёну выключаецца вострая, салёная ежа. Прадукты ўжываюць у вараным выглядзе.

Святлана БАРЫСЕНКА, Вольга ШАЎКО.

(Працяг будзе.)

Віртуальная будучыня.



КУПАЛАЎСКАМУ ТЭАТРУ ВЕРНУЦЬ ГІСТАРЫЧНЫ ТВАР

Але ў новым лагатыпе тэатра не будзе партрэта Купалы

ТВАРЫ

— Гэта не значыць, што дух Купалаўскага сыходзіць, — запэўніў **мастацкі кіраўнік Мікалай ПІНІГІН.** — На сённяшнім этапе тэатру важна зацвердзіць свой новы воблік. Гэтаму паспрыяе рэканструкцыя будынка і новы фірмовы стыль тэатра, які распрацаваў мастак Канстанцін Вашчанка. Цяпер стыль будзе вызначаць гістарычны выгляд будынка Нацыянальнага тэатра — гэта галоўнае, што нам падорыць дзяржава.

Падарунак дарагі — каля 200 мільярдаў беларускіх рублёў будзе каштаваць рэалізацыя праекта. У выніку рэканструкцыі ў тэатры павінна павялічыцца прастора — з 3,5 тысячы квадратнага метра да 12,5. Аднак пры гэтым зменшыцца колькасць месцаў: з 530 да 400. Усё дзеля выгод трупы і гледачоў, якія будуць забяспечаныя ўсімі найсучаснейшымі «навароцамі». Аднак пры гэтым у аснову праекта паклалі вяртанне будынку гістарычнага выгляду, які быў страчаны ўжо пасля вайны.

— Калі ў Мінску з'явіўся губернатар князь Трубяцкой, ён прапанаваў пабудаваць новы тэатр. 26 ліпеня 1888 года па старым стылі быў закладзены камень, — кажа **навуковы кіраўнік праекта, мастацтвазнаўца Вольга КУКУНЯ.** — Пры гэтым прысутнічаў вялікі князь Уладзімір Аляксандравіч з жонкай, якіх знарок запрасілі да гэтай падзеі. Праект будаўніцтва тэатра быў выкананы польскім архітэктарам Казлоўскім. У 1890 годзе 5 мая адбылося асвячэнне тэатра, быў дадзены першы спектакль. Да вайны змены ў архітэктуры былі вельмі нязначныя. Падчас Вялікай Айчыннай вайны ў будынку тэатра быў выбух — замах на Кубэ. Былі разбурэнні, але, паводле ўспамінаў дырэктара, усё было вынесена. Вырашылі зрабіць дадатковую рэканструкцыю, аўтарам праекта быў Георгій Заборскі. А ўжо ў 1957 годзе Аркадзь Духан зрабіў вялікую рэканструкцыю тэатра ў сувязі з тым, што не хапала памяшканняў. (Гэтае пытанне пачалі ўздымаць яшчэ з пачатку XX стагоддзя). Духан зрабіў прыбудовы па баках тэатра, цалкам змяніў галоўны фасад.

Прапанавала вярнуць тэатру першасны выгляд архітэктар-рэстаўратар Людміла Іванова. Яе праект вяртае да распрацовак Казлоўскага. Дадатковымі матэрыяламі для падрыхтоўкі праекта рэканструкцыі сталі старыя фотаздымкі, кінахроніка.

— Мы будзем вяртаць першасны фасад будынку, — тлумачыць Вольга Кукуня. — Але ёсць адзін невялічкі прабел: спачатку ў нішах сіметрычна былі бюсты. Мы не знайшлі дастаткова матэрыялу, каб аднавіць бюсты. Таму бюсты заменяць букетнікі. Даследаванні жырандолі ў глядзельнай зале паказалі, што на столі калісьці быў жывапіс на палатне з выявамі чатырох дзеячаў рускай культуры — Пушкіна, Гогаля, Астроўскага, Глінкі. Аднавіць іх на сённяшні дзень таксама складана; калі знойдзем дадатковыя матэрыялы, то будзем працаваць над гэтым. У глядзельнай зале стаялі крэслы, таму што падлога ўзнімалася да ўзроўню сцэны і ўтваралася вялікая прастора, дзе адбываліся балі і маскарады. Гэтая функцыя будзе адноўлена.

ТВОРЦЫ

Калісьці падлогу выраўноўвалі ўручную — дамкратамі, якія знаходзіліся пад сцэнай. А пасля рэканструкцыі іх заменяць сучасная тэхніка і найноўшыя тэхналогіі, якія дазволяць ператвараць глядзельную залу ў танцавальную з адмысловым пакрыццём — не больш за 4 гадзіны пойдзе на гэта. Імкнуся ўявіць, як гэта будзе — дапамагае выява на экране і спецыяліст, які праводзіць віртуальную экскурсію па будучым тэатры.

Тэхналогія камп'ютарнага мадэлявання ўпершыню візуалізавала працу. Дэталёвы план паказвае 90 працэнтаў ад таго, што будзе рэалізавана ў арыгінале іншымі творцамі, якія зоймуць месца ў тэатры на час рэканструкцыі.

Злева ад тэатра з боку праспекта будзе дадатковая прыбудова, якая дазволіць павялічыць прастору сховішчаў дэкарацый. Зменіцца фае, у першую чаргу з-за таго, што гардэроб перамяшчаецца на больш нізкі ўзровень. Аднак аднаўляецца чугуннае ліццё лесвіц а магчыма, і калон, калі пацвердзіцца, што яно схаванае пад бетонам. У фае другога паверха размесціцца вялікая рэпетыцыйная зала. Мэбля стылізаваная, экраны афармленыя пад карціны. У глядзельнай зале адновяць генеральную заслону, якая падымаецца толькі ўгору. Бардзюры адновяць паводле чарцяжоў Казлоўскага. У кабінках другога яруса будзе створана VIP-зона. Мадэрнізуюць сцэну. Паваротнае кола заменяць рухомыя шчыты, дзякуючы якім на сцэне будуць з'яўляцца акцёры. Тэхналогія найсучасная — ёй усяго два гады. Мабільная пляцоўка дазваляе павярнуць сцэну, калі трэба, можа трансфармавацца як заўгодна і ўтрымліваць больш за 500 кілаграмаў. Каб павялічыць прастору самой сцэны, бардзюры першага яруса будуць апускацца. Тры відэаэкраны дазволяць стварацъ на кожным з іх сваю відэакарцінку, якая можа быць выкарыстана для дэкарацый. Але дзякуючы ўсім задумам і магчымасцям, дэкарацыі для спектакля можна будзе сабраць максімум за гадзіну.

— У тэатры ўпершыню будзе прыменена сістэма «разумнага дома», якая будзе кіраваць усімі сістэмамі, прыборамі ў гэтым будынку. Створыць камфорт і дазволіць эканоміць на энерганосьбітах у год, па папярэдніх падліках, больш за 55 працэнтаў у параўнанні з тым, што тэатр траціць зараз на электрычнасць і ацяпленне, — тлумачыць **каардынатар праекта Георгій Вернякоўскі.** — У тэатры будзе выкарыстоўвацца сістэма не проста кандыцыянавання паветра, а размеркаванага клімат-кантролю. Упершыню ў Беларусі тэатр імя Янкі Купалы атрымае размеркаваную сістэму гуку, якая дазвалае стварацъ любыя гукавыя спецэфекты, нібыта мы глядзім фільм у сістэме «Долбі». Шматканальная сістэма відэазапісу адновіць забытую функцыю стварэння тэлеспектакля. Спектаклі потым можна будзе ўбачыць на дысках.

Дзеля таго, каб прадугледзець усё, былі запрошаныя лепшыя тэхнолагі пастановачнай часткі, што ёсць у рэспубліцы, спецыялісты з Расіі, дзе ўсё гэта прымяняецца. Аднак ці рэальна за той час, пакуль будзе ісці рэканструкцыя, асвоіць усё гэтае абсталяванне айчынным спецыялістам? Абяцаюць, што іх будуць вучыць спецыяльна.

— Наша задача была не проста аднавіць гістарычную справядлівасць, — гаворыць Георгій Вернякоўскі. — Мы разумелі, што тэатр — гэта вытворчасць, і імкнуліся стварыць лепшыя, зручныя эрганамічныя ўмовы для тых, хто дорыць нам гэтае мастацтва.

ТВОРЫ

Час рэканструкцыі трупа збіраецца перажыць на іншых пляцоўках. Асноўнай пляцоўкай, дзе будуць іграць спектаклі, хутчэй за ўсё, стане Палац прафсаюзаў, Малая сцэна пераедзе ў Канцэртную залу «Мінск».

— Мы не сыходзім з цэнтра, жыхары горада і госці не зведаюць вялікіх праблем, — абяцае **дырэктар тэатра імя Янкі Купалы Павел Палякоў.** — Размяшчацца адміністрацыйныя і тэхнічныя цэхі будуць па адной лініі — у будынках праспекта Машэрава. Па вуліцы Казлова, 9 размесціцца наша вытворчасць. Спадзяюся, гэта дазволіць нам працаваць не толькі на свае патрэбы, але і зарабляць грошы.

Але галоўнае, чым тэатр жыве і зарабляе — усё-такі спектаклі. За два гады жыцця «на выселках» **мастацкі кіраўнік Мікалай Пінігін** збіраецца папоўніць афішу:

— Я буду ставіць спектакль «Выкраданне Еўропы» з трох частак: балета, камічнай оперы, камедыі дэль артэ. Такім чынам мы ўзгадваем творчасць Францішкі Уршулі Радзівіл. Дажывём — будзем іграць у Нясвіжы, у яе родных сценах. Гэта задумана дзеля таго, каб беларускага гледача выцягнуць з ручнікоў, лапцей, ануч да еўрапейскіх каранёў, да нацыі пад назвай старажытная літва. Потым, у чэрвені, я паспрабую выпусціць «Ноч перад Калядамі» — гэта паўтор спектакля, які я рабіў у ВДТ. Падаецца, што тэкст будзе больш важны тут, бо роднасная культура, мы таксама спявалі калядкі. Такім чынам я пазбаўляюся ад цяжкай місіі тэатра рабіць дзіцячыя спектаклі. Мы будзем рабіць спектаклі для сямейнага прагляду. Першым прыкладам будзе «Ноч перад Калядамі», калі не класы будуць сядзець ў зале, а дарослыя і дзеці. У ВДТ, у спектаклі, дзе няма ніводнай зоркі, квіток на гэты спектакль каштуе 100 еўра. У нас больш сціплая сітуацыя... Але спектакль будзе музычны, што таксама павінна прыцягнуць гледача. Мы дамовіліся з Аляксеем Дударавым, што ён напіша нам п'есу пад рабочай назвай «Казкі». Я хачу, каб старэйшае пакаленне купалаўцаў разам з маладымі сыграла гэты спектакль, дзе дзядулі расказваюць унукам казкі. У снежні 2011 года паглядзім, што атрымаецца. У кастрычніку-лістападзе Павел Харланчук будзе ставіць ірландскую п'есу «Сіраглівы Захад» Макдонаха. У лістападзе 2011 года будзем ставіць «Ладдзю роспачы» Караткевіча. У планах ёсць «Дзяды» Міцкевіча і «Пан Тадэвуш».

Але лепш за ўсё час рамонту перажываць на гастролях. Такіх буйных, як калісьці, цяпер не бывае. Аднак ёсць у купалаўцаў найбольш «выязныя» спектаклі. Гэта сумесны расійска-беларускі праект «Вяселле», які вандруе па фестывалях. У верасні ў Літве будзе паказана «Пінская шляхта» ў межах дамовы аб супрацоўніцтве з Нацыянальным тэатрам. Таксама ён будзе паказаны ў Варшаве. Напэўна, дзеля параўнання. Бо Мікалай Пінігін ажыццявіў гэтую пастаноўку ў тэатры «Рампа». Дарэчы, у галоўнай ролі ў польскім спектаклі будзе Віктар Манаеў, які спецыяльна вывучыў тэкст па-польску. Нам сказалі: «Нарэшце вы нам прывезлі новага польскага драматурга», — гаворыць Мікалай Мікалаевіч. — Я сказаў: «Няхай так...»

— Мы разглядаем гастрольны графік тэатра, магчымасць выезду яго за мяжу, удзелу ў Днях культуры Беларусі, — запэўніў трупу **першы намеснік міністра культуры Беларусі Уладзімір Карачэўскі.** — Таму што Купалаўскі таэтр — наш гонар. Тут захаваўся дух, тут захаваўся твар, прафесіяналізм. Я хачу пажадаць, каб трупа не згубіла пачуцця каманды, захавала дух і ўсе цяжкасці змагла перанесці годна.

Купалаўцы і гэта ўмеюць. І толькі спадзяюцца, што калі ў дзяржавы знайшліся грошы на такую грандыёзную рэканструкцыю Нацыянальнага тэатра, то і заробак артыстаў будзе калі-небудзь адпавядаць гэтаму шыку. Бо які б ні быў будынак, галоўнае ў ім тое, што ідзе на сцэне і ствараецца людзьмі. І наўрад ці тэхналогіі могуць замяніць жывую эмоцыю, якая даносіцца рухамі, жэстамі, мімікай артыстаў. А ім так хочацца гаварыць, што праца ў Купалаўскім — гэта не хобі, а гонар, які выпадае не ўсім.

Ларыса ЦІМОШЫК.

Простая мова

ПРОЗА... І ПАЭЗІЯ ЖЫЦЦЯ

...Лета, спёка і вокны насцеж.
У праёме аднаго — невялічкі анёлак. Ён бялюткі, ён бязважкі (сплецены з танюткай пражы, шыдэлкам) ён вісіць на даўгаватай нітцы, але яна светлая, нябачная, адкуль уражанне, што анёл трымаецца сам — і ў нейкай развазе: ці то заляцець на гэтую кухню, займець свой дах (і дом), ці то па-ранейшаму быць на волі — гайдацца на лёгенькім ветры і грэцца на сонейку.
Дарэчы, ад яго, ад сонейка, у анёлка цень — гэткі ж жывы, і таму здаецца, што анёл не адзін, а ў пары.
Як мы — летась на яго «радзіме», у Дрэздэне.

...У лютым 45-га гістарычны цэнтр гэтага горада разбамбілі амерыканцы — толькі за тое, што ён нямецкі: загінулі тысячы безабаронных людзей — жанчын, малых, старых... Але тыя, што ацалелі, ці не назаўтра сталі сцягваць у кучы тое, што зрабілася друзам і з нямецкай педантычнасцю нумараваць, падпісваць, што і ад чаго.

У выніку яшчэ і гэтай цяжкай карпатлівай працы на сваіх ранейшых месцах цяпер і ў ранейшай красе знакаміты Цвінгер з Рафаэлеўскай «Сіксцінскай мадоннай», рачны вакзал над велічнай Эльбай, самая вялікая ў свеце тэраса, большасць храмаў-палацаў, тэатраў-музеяў, помнікаў... Карацей, хадзіў бы і хадзіў тут, глядзеў бы і глядзеў! Ды... Часу вобмаль! Таму, што-кольвек купіўшы на ўспамін (у тым ліку і анёлка), мы спяшаемся ў аўтобус, мы ад'язджаем.

— Что Дрезден? Не оправдал надежд, — па мабільніку скардзіцца камусь жанчына, што сядзіць спераду. — Ты только представь: четыре часа здесь носилась по магазинам. Нету белого пальто. И в помине нет! Ну скажи — мне стоило сюда ехать?

...Для шалёнага сабакі (светлай памяці — бацька казаў) сем вёрстаў не круг.

Свежым вокам

Уперад пра такія аперацыі не чуў ніхто — ну хіба зрэдку. Цяпер жа — паток, канвеер, як кажуць тыя, што з яго «сышлі» — хто без катаракты ўжо, хто з падлатанай сятчаткай, ці новым хрусталікам...

Першае, што пасля яго замены ўбачыла сяброўка, якія ж далікатныя, якія прыгожыя рукі ў яе хірурга! Які высакародны твар! Потым — як знасілася яе сумачка (не кажучы ўжо пра джынсы), як выцвілі дома шпалеры, як пашарэлі столі!

Карацей, сказала мужыку, што трэба грошай, каб абнавіць гардэроб, зрабіць рамонт у кватэры...

Муж прыкінуў, колькі — іх... трэба — цяжка ўздыхнуў і, пачухаўшы патыліцу, мовіў, што мо прасцей яшчэ раз... памяняць хрусталік — на той, стары. І жыць, як жылі?

Складанасці перакладу

...Іван Дамінікавіч Луцэвіч (ён жа Янка Купала), паводле успамінаў, быў франтам — хадзіў, па-руску кажучы, «с тростью», «с тросточкой».

Як гэта будзе па-беларуску?

З палачкай, сцвярджае слоўнік.

Аднак яна, палачка — ну згадзіцеся — неяк не пасуе франту... Не пасуе і кульба, кавенька, друк ці кіёк. Дык з чым жа хадзіў Купала? Як для мяне — пытанне...

З чым ходзіць каляжанка — таксама: яна сабе модны парасон прыдбала — у выглядзе той самай «трости», «тросточки» (не палачкі ж? Не кійка? Не кавенькі? Не кульбы?).

Аднойчы дождж находзіў, той абноўкі я ў яе на пракат узяла — на гадзінку, па справах з'ездзіць. «О-о, вам так пасуе, — зазначыла дзяўчына, пазычаючы, — усе хлопцы вашымі будуць»...

— Не ўсе, — вяртаючы пазыку, прызналася я. — Але ж адзін увагу звярнуў: месца саступіў у аўтобусе.

Паспееш?

У 20 Наста замуж не выйшла, як не выйшла ў 30... І ў 35.

Потым жаніхоў амаль не было, ды калі і здараліся, маці яе заводзіла адну і тую ж пласцінку: паспееш, маўляў, я старая, хворая — хутка памру, і тады ўжо рукі ў цябе развязаны — хочаш сама некуды выходзь, з'язджай, хочаш да сябе прымаку бяры, а што — і хата, і ў хаце...

Яна была добрай дачкой — матулю слухала, але да пары: пакуль «на гарызонце» не з'явіўся ён — сталы сур'ёзны ўдавец, не сказаў ёй: «Паехалі». І Наста як звар'яцела: за 24 гадзіны звольнілася з працы, пасядала ў чамадан што-кольвечы з рэчаў і пакаціла. Жах які — насуперак маці!..

Што, магчыма цікава, памерла тая праз... трыццаць з гакам гадоў, і на пахаванні ў яе (апроч іншай радні, суседзяў) было двое ўнукаў — Насцюсь дзяцей.

Ужо з дзецьмі.

Родныя? Розныя!

Усё як ва ўсіх. Ці ў многіх...

Жыў-быў бацька і меў сыноў. Меншы ўсе крошкі пабраў з жонкі, большы — з яго. Грэх такіх не любіць, грэх, любячы, не купіць ім ровар (і не нейкі там маленькі, дзіцячы, а сапраўдны, як вялікім)... Грэх не навучыць катацца!

Спачатку, вядома ж, па блізкай, роўнай дарозе, пасля якой не страшна ў далёкую.

Ведаючы што на ёй, той далёкай можа здарыцца усё, і аднаму і другому з сыноў бацька строга казаў, каб хаця глядзелі пад кола, каб абміналі лужыны і камяні, каб (даслоўна) не рвалі пупы, не ехалі ўгору, бо гэта вельмі цяжка (лепш злезці з веласіпеда...). І з гары каб таксама не несліся, бо з разгону можна зваліцца...

Хлопцы слухалі і не слухалі — ім карцела хутчэй ірвануць.

Але ровар быў адзін.

То паехаў смялейшы, меншы. І пераканаўся, што бацька праўду казаў: ехаць угару цяжка. Але ж калі вельмі пастарацца...

І з гары з'язджаць таксама страшнавата...

Але ж кайф які ад таго, што ты перамог — сябе і гару, ад таго, што ляціш — са свістам!..

Другі з сыноў таксама паехаў. І таксама ўбачыў, што бацька не падмануў: сем патоў сышло, пакуль на гару ўз'ехаў, душа ў пяткі зайшла, як каціўся адтуль.

Таму, вярнуўшыся, ён... паставіў веласіпед, пайшоў у хату і сеў чытаць кніжкі.

Міналі гады. Адзін з сыноў ірваў пуп на пад'ёмах, але браў горы; падаў, набіваў гузакі, але з іх спускаўся...

Цяпер ён, можна сказаць, далёка: у яго прыгожая сям'я, цікавая праца, дыхтоўны дом.

Другі з сыноў па-ранейшаму сядзіць — чытае кніжкі...

Што цікава, бацька любіў абодвух. І пытанне яшчэ, каторага больш?

Ад смешнага...

Кажуць, агенты тайнай паліцыі падстроілі калісь правакацыю, у выніку якой нашу турыстку (напярэдне ці не сем разоў праверваную) прывялі ў пастарунак. Суддзя ёй (па- англійску... праз перакладчыка):

— Грамадзянка Іванова, вас абвінавачваюць у тым, што вы скралі курыцу ў краме містара Сміта.

Кабета ў адказ:

— А як жа! Я ўсё жыццё толькі і марыла, каб тут яе скрасці!

Перакладчык: жанчына заяўляе, што яна ўсё жыццё марыла скрасці ў нас курыцу.

Суддзя (дужа здзіўлены, бо дагэтуль і сам не верыў, што гэта можа быць праўдай):

— Выходзіць, вы прызнаяце сябе вінаватай?

Іванова (абурана):

— Ото ж! Я ў Савецкім Саюзе курэй не бачыла. Спецыяльна прыехала — за тры моры, каб тут каштаваць...

Перакладчык:

— Містар, турыстка заяўляе, што ў СССР ніколі не бачыла курэй, што сюды, нягледзячы на вялікую адлегласць, прыляцела сумысля, каб пакаштаваць курынага мяса.

Суддзя:

— Але ж за гэта вам пагражаюць два гады турмы.

Іванова:

— Здрасце! Я ваша цёця!

Перакладчык:

— Містар, гэта руская з вамі вітаецца і кажа, што яна вам сваячка!

...У сітуацыі, калі на карту пастаўлена воля, добрае імя жанчыны (ды і краіны...) перакладчык (які ведае мову, а не пэўную колькасць слоў) згадзіцеся, вельмі патрэбен!

Вось другая: мёдам пачаставалі. І не з нейкай там звычайнай шкляначкі, а з прыгожанькай — з адмысловай (ведай нашых!) накрыўкай, з такой жа фірмовай «цыкеткай»... З форсам на іх (і па-нашаму, па-беларуску!) «Пружанскі слоік» .

Што ў ім да мёду было? Як сведчыць надпіс: «Огурчики маринованные стерилизованные».

Каб напісалі, што агурочкі (марынаваныя...), ніхто, відаць, не ўбачыў бы, не зразумеў. І не купіў.

Дзверы зачыняюцца

Стары анекдот. «Дзеванька, сядай, падвязу», — запрашае ў машыну кіроўца. «Я не дзеванька, мяне ўжо падвозілі», — кажа тая ў адказ. І не садзіцца, бо навучана.

Люсечка — таксама: пасля таго, як па кватэры ў яе пахадзілі нейкія зладзюгі (іх так і не знайшлі...), яна — сцеражонага Бог сцеражэ — паставіла металічныя дзверы на ўваходзе ў калідор (агульны з суседзямі), металічныя — у кватэру. За імі — каб цішэй і цяплей было — пакінула, так бы мовіць, родныя — драўляныя...

І цяпер жытло сваё заве сейфам.

Проза... І паэзія жыцця

Старыя людзі — старыя рэчы.

— О-о, які ў вас пінжачок?! — захоплена кажу сваёй 80-гадовай суседцы. — Такі цікавы фасон... А тканіна... Ніколі такой не бачыла...

— Ну што вы?! — бянтэжыцца, а хутчэй, ганарыцца жанчына. — Гэтаму пінжачку гадоў 40 ужо! У мяне, ведаеце, у Рызе сяброўка жыла — краўчыха, якіх пашукаць: усё, што хочаш пашые, абы толькі ўбачыла... Дык я да яе частавата ездзіла і добра апраналася. Вось, каб вы ведалі — такога пінжачка ў Мінску больш ні ў кога не было. І нямашака: мы яго самі прыдумалі, адзіны экзэмпляр, эксклюзіў, як вы цяпер кажаце.

— А лыжачкі, якія лыжачкі!.. (Тая ж суседка завяла на кухню, частуе гарбатай). І 64 капейкі ўсяго?!

— Ну, некалі гэта грошы былі! — з форсам прамаўляе гаспадыня і потым дадае, што лыжачкам гадоў з 50, што куплялі іх з нябожчыкам-мужам, калі пажаніліся, калі абжываліся. Яна тады штось прасцейшае хацела купіць, танейшае, бо ў яе толькі дзве сукенкі было (адна — на зіму, другая — на лета). А муж, светлай памяці, не дазволіў. Сказаў: мы не такія багатыя, каб траціцца двойчы... І меў жа, выходзіць, рацыю?! Лыжачкі во дагэтуль служаць! І ўсім падабаюцца...

— Настольнік прыгожы, — зноў жа прыкмячаю я, калі з кухні перабіраемся ў залу.

— Ой, яму гадоў 30, відаць. Сын служыў у Германіі, у водпуск прыязджаў, мне ў падарунак прывёз. Дык я цяпер кожны раз на стол пагляджу ды ўспомню, колькі ж ён радасці меў, прыехаўшы!..

Лыжачкі, абрусок, пінжачок — проза.

Паэзія?

...Вещь — это знак.
У каждой вещи
С годами возникает
Голос вещий.

Золата!

Лёс звёў, лёс развёў...

Звёў летам, на беразе рэчкі, у прыгожай бяседзе, цэнтрам якой былі двое — ён і яна, муж і жонка — вельмі прыгожыя (кожны па-свойму), вельмі непадобныя...

Але вочы цешыла не столькі рознасць: мяркуючы па дзецях, гэтыя двое жылі ў шлюбе гадоў з 25, мяркуючы па паводзінах — не жылі і тыдня. Бо варта было ёй брывом павесці, як ён ужо ведаў, што трэба зрабіць, тут жа рабіў (як найлепш) і крадком пазіраў ізноў, каб не прапусціць, каб нечым дагадзіць — сваёй жонцы, сваёй Тамары, свайму (так і сказаў!) золату.

Званне гэта яна заслужыла, заслужыла даўно, можна сказаць, змаладу, калі цягам васьмі гадоў, працуючы, гадуючы дзяцей і будуючы дом, дзень пры дні, ноч пры ночы даглядала паралізаванага свёкра. Даглядала тады, калі не дастаць было інваліднай каляскі і матраца, на якім у ляжачых не ўтвараюцца пралежні (пра іх нават не чулі тады. Як і пра памперсы... А тым больш — для дарослых...). Калі ў доме іх не было вады (нават халоднай), калі хранічна не хапала грошай і многага-многага іншага...

Але пры гэтым на хворага яна ніколі не павысіла голасу, ніколі не папракнула яго, ніколі не пакрыўдзіла — шкадавала.

«То ці ж не золата?!» — сцвярджаў-пытаўся муж.

З ім згаджаліся — усе...

Вось толькі пробу гэтага золата ведалі не многія, — толькі тыя, хто сам сутыкнуўся з такою ж бядой. Ці хоць трохі падобнай.

Валянціна ДОЎНАР.

Будзе новы дах

в. Стаі, Лепельскі раён.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Усходні гараскоп на наступны тыдзень

Вадалеяў чакаюць шматабяцальныя прапановы, а Дзеваў — цікавая інфармацыя

АВЕН. Працоўныя справы ўвойдуць у больш спакойнае рэчышча, хоць бурныя ўсплёскі мінулага могуць яшчэ нагадаць пра сябе. З дапамогай сілы волі, мэтанакіраванасці і ўпартасці зможаце давесці навакольным сваё права на самастойнасць і незалежнасць. У чацвер прытрымайце свае эмоцыі і прыцішце амбіцыі, інакш можаце «наламаць дроў».

ЦЯЛЕЦ. Давядзецца прадэманстраваць усю сваю вынаходлівасць і смеласць. Дзейнічайце рашуча — тады перад вамі адкрыюцца новыя гарызонты. Вашы амбіцыі могуць спрыяць умацаванню фінансавага становішча. Аднак у сярэдзіне тыдня магчымыя неспадзяваныя цяжкасці, для пераадолення якіх неабходна будзе прыкласці значныя намаганні.

БЛІЗНЯТЫ. Здаецца, наступіў час лічыць сябе пестуном лёсу. На гэтым тыдні ў вас будзе выдатна атрымлівацца роля пасярэдніка, так што можаце знарок шукаць канфлікты і ўладжваць іх. Пазбягайце частых сустрэч з начальствам, бо выпадкова сказанае пры шэфе слова можа справакаваць буйны скандал. У справах верагодная адсутнасць праблем.

РАК. У любой сітуацыі разлічвайце толькі на сябе. У аўторак варта вылучыць час для планавання найбліжэйшай будучыні — падчас абдумвання вас могуць наведаць цікавыя і перспектыўныя ідэі. Другая палова тыдня спрыяльная для вырашэння канфліктных пытанняў мірным шляхам, верагодны кампраміс без шкоды для вашых інтарэсаў. Паспрабуйце быць больш рашучымі і прынцыповымі.

ЛЕЎ. Паспрабуйце пазбягаць кардынальных зменаў у любых галінах сваёй дзейнасці. Сутыкненне з нязначнымі цяжкасцямі па шляху да мэты толькі дадасць вам унутранай упэўненасці ў сабе і рашучасці. Гэта дазволіць з лёгкасцю пераадолець усе перашкоды. Вашы прапановы выклічуць станоўчыя эмоцыі ў калегаў і ў начальства. Бліжэй да выхадных лепш трохі прыпыніцца і расслабіцца, успомніўшы пра тое, што ўсіх грошай усё роўна не заробіш.

ДЗЕВА. Вы як ніколі раней блізкія да таго, каб дасягнуць вяршыні. У аўторак можа азадачыць цікавая інфармацыя — не спяшайцеся з прыняццем рашэння. У пятніцу, верагодна, адбудуцца важныя падзеі, якія дазволяць увасобіць вашы планы і задумы ў жыццё. У суботу займіцеся сабой. У нядзелю лепш не мітусіцца і не даваць пустых абяцанняў.

ШАЛІ. Варта ўзяць кіраванне справамі ў свае рукі і наладжваць новыя кантакты і дзелавыя сувязі. У пагоне за справядлівасцю ў сераду паспрабуйце пазбегнуць канфліктаў. Справядлівасць пераможа крыху пазней, а пакуль паберажыце сілы. У нядзелю не рэкамендуюцца гутаркі на душашчыпальныя і душавыратавальныя тэмы, лепш адкласці іх на бліжэйшую будучыню.

СКАРПІЁН. Неабходна засяродзіцца на тых працоўных справах, якія разлічаныя на перспектыву. Будзеце імкліва прасоўвацца да вызначаных мэтаў. Аўторак можа апынуцца мітуслівым, але прыбытковым. Пятніца спрыяльная для паездак, перамоў, абмеркавання спраў з калегамі. Гэты тыдзень не падыходзіць для набыцця кватэры або пераезду.

СТРАЛЕЦ. Вось і надыходзіць час рашучых дзеянняў. Выдатны, яркі, насычаны тыдзень. У вас практычна ўсё будзе атрымлівацца. Беражыцеся: у аўторак дзелавыя партнёры могуць паспрабаваць скарыстацца вашай эмацыйнасцю ў карыслівых мэтах. А вашы ініцыятывы могуць сустрэць сур'ёзнае, хоць і пераадольнае супраціўленне з боку начальства. Неабходна завяршыць некаторыя важныя справы. Калі прысвеціце гэты перыяд адпачынку, то многія з вашых ідэй, на якія ў вас ніколі не хапала часу, могуць нарэшце ўвасобіцца ў жыццё. У суботу лепш не пачынаць новых спраў.

КАЗЯРОГ. Неабходна разумна падысці да вырашэння сітуацыі, якая склалася. Памятайце, што эмоцыі будуць толькі перашкаджаць. Планы на працы могуць змяняцца на супрацьлеглыя. Толькі не палохайцеся: вы бліскуча справіцеся з імі. Накіруйце сваю энергію на вырашэнне самай актуальнай на гэты момант справы. У выхадныя паспрабуйце не перастарацца з выхаваннем дзяцей. Найбольш спрыяльным для вас днём будзе пятніца, няўдалым — нядзеля.

ВАДАЛЕЙ. Тыдзень можа падрыхтаваць цікавыя перспектывы і шматабяцальныя прапановы для дзелавой актыўнасці. У аўторак пажадана суаднесці свае планы з рэальнай сітуацыяй і зрабіць своечасовую карэкцыю спланаванага. Падумайце аб змене спосабу заробку. У пятніцу вас можа чакаць поспех у справах, верагодны таксама грашовы прыбытак. На працы вашы прапановы адзначыць начальства. Яно нават можа задумацца пра павышэнне заработнай платы.

РЫБЫ. У панядзелак не варта спяшацца з ажыццяўленнем новых планаў, гэты дзень лепш прысвяціць завяршэнню няскончаных спраў. У аўторак важна не спазняцца, асабліва — на працу. Серада выдатна падыдзе для таго, каб будаваць планы на найбліжэйшую будучыню. І чым яны будуць больш падрабязнымі, тым лепш. Гэты ж дзень апынецца ўдалым для падрыхтоўкі нейкай аддаленай па часе справы, скажам, вандроўкі. У другой палове тыдня лепш дзейнічаць рашуча, ні ў чым не сумняваючыся. У пятніцу здзівіце сябе і навакольных здольнасцю да бліскучых імправізацый у дзелавой гутарцы. Аднак калі вы падрыхтуецеся да гэтай гутаркі, справа пойдзе яшчэ лепш.

ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ ПО ПРОДАЖЕ ГОСУДАРСТВЕННОГО ИМУЩЕСТВА И ПРАВА ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНОГО УЧАСТКА

Наименование предмета аукциона	Здание столовой и право заключения договора аренды земельного участка	Здание аптеки с сооружениями и право заключения договора аренды земельного участка	Капитальное строение и право заключения договора аренды земельного участка	Капитальное строение и право заключения договора аренды земельного участка	Подсобное хозяйство и право заключения договора аренды земельного участка	Вспомогательное здание столовой и право заключения договора аренды земельного участка	Производственное здание, здание сарая и право заключения договора аренды земельного участка
Местонахождение недвижимого имущества	Брестская обл., г. Барановичи, ул. Брестская, 282	Брестская обл., Брестский р-н, д. Новые Лыщицы, ул. Октябрьская, д. 25	Брестская обл., Барановичский р-н, 1,5 км южнее д. Млынок	Брестская обл., Барановичский р-н, 1,5 км южнее д. Млынок	Брестская обл., Дрогичинский р-н, д. Горавица	Брестская обл., Ивацевичский р-н, 2,2 км юго-западнее д. Холопья	Брестская обл., Ивановский район, Снитовский с/с, д. Снитово
Продавец недвижимого имущества	ЭРУП «Опытная путевая машинная станция № 115» Белорусской железной дороги, тел. 80163 49 27 75, 49 27 81	Брестское ТПРУП «Фармация», тел. 80162 41 69 50, 21 20 45	Главное управление командующего внутренними войсками Министерства внутренних дел, тел. 80163 45 72 33, 45 25 01		ГЛХУ «Дрогичинский лесхоз», тел. 801644 3 64 16, 3 64 20	Министерство энергетики РБ (в лице ОАО «Белтрансгаз») тел. 8017 219 14 37, 801562 7 23 53	РУПАД «Брествтодор», тел. 8 0162 20 31 09
Сведения о предмете аукциона	Здание столовой 1982 г.п., 1-этажн., кирпичное, площадь – 386,3 кв.м. Земельный участок площадью 0,1131 га, под размещение объекта торговли, по оказанию услуг населению, административного, производственно-складского назначения либо общественного питания, срок аренды – 30 лет с последующим продлением срока аренды.	Здание 1-этажн., 1953 г.п., площадь – 57,0 кв.м, холодная пристройка, погреб, сарай, уборная, воздушная линия 0,4 кВ, водопроводная сеть. Земельный участок площадью 0,1711 га, для размещения промышленного производства, общественного питания, торговли и услуг, для обслуживания жилого дома, срок аренды – 50 лет.	Специальное хранилище из бетона с четырьмя воздухозаборными трубами, площадь – 1365,1 кв.м. Земельный участок площадью 0,3004 га, срок аренды – 99 лет.	Сооружение специального хранилища из бетона, площадь – 951,0 кв.м. Земельный участок площадью 0,5322 га, срок аренды – 99 лет.	Здание свинофермы 1992 г.п., площадь – 252,2 кв.м; пристройка, водонапорная башня; здание зернохранилища 1988 г.п, площадь – 308 кв.м; здание коровника 1987 г.п.. площадь – 401 кв.м, весовая, сарай. Земельный участок площадью 0,8121 га, срок аренды – 50 лет.	Здание 1985 г.п., 1-этажн., площадь – 143 кв.м. Земельный участок площадью 0,0628 га, срок аренды – 50 лет.	Производственное здание – 1979 г.п, 1-этажн., кирпичное, площадь – 47,5 кв.м с пристройкой. Сарай – 1991 г.п, 1-этажн., кирпичный, площадь – 36,3 кв.м. Земельный участок площадью 1,6538 га, для размещения объектов по оказанию услуг, общественного питания, торговли, по согласованию с отделами архитектуры и строительства и экономики Ивановского райисполкома, срок аренды – 90 лет.
Начальная цена предмета аукциона, руб.	147 530 194	14 656 274	101 366 536	100 687 281	55 715 727	20 387 791	13 103 825
Сумма задатка, руб.	14 753 000	1 465 000	10 136 000	10 068 000	5 571 000	2 038 000	1 310 300
Организатор аукциона	**Фонд «Брестоблимущество», г. Брест, ул. Ленина, 11, тел. 8 0162 20 87 85, 23 12 63, 23 44 06, 21 19 82, www. brest–region.by**						

Аукцион состоится **31 августа 2010 года** в 11.00 по ад

СКАНВОРД

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.



ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ

Сканворд + судоку (28 ліпеня). Па гарызанталі: «Фаўст». Кажадуб. Сашэ. Стэп. Рол. Арэх. Ібіс. Аліўе. Ультрагук. Ара. Эдэм. Аўтар. Уліс. Вір. Амальгама. Алні. Адан. Сэнс. Аса. Стаж. Табаган. **Па вертыкалі:** Універсітэт. Анагр. Эльдарада. Стэрх. Ратан. Яслі. Араміс. Багара. Эльтон. Арэлі. Лён. Сакэ. Дуга. Эланда. Мімас. Бабслей. Сана. **Судоку:** адказы гл. у табліцы.

9	5	8	4	7	3	6	1	2
3	1	6	5	2	9	7	4	8
7	2	4	6	1	8	9	5	3
6	7	2	3	9	4	5	8	1
8	9	5	1	6	2	4	3	7
4	3	1	8	5	7	2	9	6
2	8	7	9	4	1	3	6	5
1	6	9	7	3	5	8	2	4
5	4	3	2	8	6	1	7	9

Сканворд (29 ліпеня). Па гарызанталі: Вішня. Слюда. Груша. Ява. Ранак. Туя. Ложак. Карп. Алыча. Урал. Кальмар. Накаўт. Акт. Ракада. Карыца. Сакэ. Кэб. Адан. Пашана. Ананд. Кюі. Кап. Кара. Сліва. Акр. Нарада. Анод. Нона. Гран. Тэарэма. **Па вертыкалі:** Прыток. Рыза. Аіл. Яблык. Сан. Асада. Мёд. Канкан. Ягня. Арэнда. Жар. Парана. Гарал. Канон. Акын. Кардон. Уюн. Адат. Душ. Акант. Пік. Арка. База. Рука. Шык. Практыка. Аўт. Цэнтр. Кілт. Баба. Афрыка.

Дзве даты

31 ліпеня



1802 год — нарадзіўся (в. Мядзведка, сёння Карэліцкі раён) Ігнат Дамейка, вядомы геолаг і мінералаг. У 1822 годзе скончыў Віленскі ўніверсітэт. У 1838-м ён, даведаўшыся, што Чылійскай рэспубліцы патрэбны выкладчыкі хіміі і мінералогіі, аформіў кантракт на 6 гадоў і выехаў у далёкую краіну. Вучоны і не падазраваў, што яго знаходжанне ў гэтай краіне працягнецца... 46 гадоў, і што Чылі стане для яго другой радзімай. Тут ён адкрыў салетру, знайшоў залежы золата, серабра, медзі і каменнага вугалю. Выявіўшы ў гарах крыніцы чыстай вады, ён пабудаваў вадаправод і забяспечыў вадой Сант'яга. Стварыў у Чылі мінералагічны музей і бібліятэку прыродазнаўства. Ажыццявіў складаныя экспедыцыі ў Анды, зрабіў мноства адкрыццяў, часам рызыкуючы жыццём. Як вынік, у навуковых атласах з'явіліся невядомы раней мінерал дамейкіт, выкапнёвы слімак і фіялка. Ён карэнным чынам змяніў сістэму адукацыі ў Чылі, напісаў падручнікі па мінералогіі і фізіцы, увёў у краіне метрычную сістэму. У 1867—1883 гадах з'яўляўся рэктарам універсітэта ў Сант'яга. У 1884 годзе І. Дамейка наведаў радзіму. Памёр у 1889 годзе. У яго гонар чылійскі ўрад выпусціў памятны залаты медаль, а таксама яго імем назвалі горад і марскі порт. Пасля смерці Ігнат Дамейка быў абвешчаны нацыянальным героем, а ў сталіцы Чылі ўстаноўлены помнік «Вялікаму асветніку».

1937 год — у Савецкім Саюзе надзвычайныя «тройкі» НКУС атрымалі права бесперашкодна (пры адсутнасці адвакатаў) выносіць смяротныя прысуды «ворагам народа».

Цытата дня:

«Мала хто з нас можа вынесці цяжар багацця. Безумоўна, чужога».

Марк Твен.

Тэлесэнсі

Хто не паспеў, той... не спазніўся

У ЭФІРЫ ПЕРШАГА КАНАЛА — ТЭЛЕВЕРСІЯ «МЛЫНА МОДЫ-2010»

Аматарам беларускай моды пашанцавала. Для ўсіх, хто не патрапіў на XIX Міжнародны фестываль моды і фота «Млын моды-2010», які праходзіў у беларускай сталіцы ў маі гэтага года, Першы канал падрыхтаваў тэлеверсію праекта.

Як распавяла «Звяздзе» **аўтар тэлеверсіі Ларыса ГУЛЯКЕВІЧ**, над здымкамі працавала вялікая каманда тэхнікаў Першага канала:

— Толькі падчас паказаў было задзейнічана сем камер, яшчэ дзве здымалі жыццё за кулісамі. Кожны год, працуючы над фільмамі «пасля Млыну», наша каманда прыдумляе розныя «тэлефішкі», робячы відэафільмы сучаснымі і крэатыўнымі. Калекцыі беларускіх і замежных дызайнераў — усё гэта буйным планам з дэталямі фасонаў, рушамі і ўзорамі будзе паказана на экране. Дадаткова — інтэрв'ю і каментарыі саміх куцюр'е. Атмасферай моды прасякнуты ўсе пяць фільмаў тэлеверсіі.

Распачнецца тэлепаказ «Млына моды-2010» фільмам «Школа моды», прысвечаным калекцыям студэнтаў, якія сёлета бралі ўдзел у fashion-фестывалі. Гледачоў чакаюць таксама адмысловыя фільмы пад назвай «Майстры моды», «Замежныя калекцыі» (у дзвюх частках) і «Стылізаваны нацыянальны саслоўны касцюм» — гонар сёлетняга «Млына моды».

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Усе фільмы будуць выходзіць па нядзелях у ранішнім эфіры Першага канала. Першы з іх — «Школа моды» — гледачы ўбачаць ужо 1 жніўня.

Ілья ЛАПАТО.

ФІРМОВЫ ДЫЗАЙН СТАРАЖЫТНАЙ РУДАБЕЛКІ

Рудабельскі край (старажытная назва сённяшняй тэрыторыі Акцябрскага раёна) — запаведны, своеасаблівы куточак. Яго колішнія азарыны і велізарныя балоты, крапасныя валы і курганы — усё гэта саступіла у мінулае. Час не крануў толькі характар месцічаў: працавітых, беражлівых, якія не ўяўляюць свайго побыту без повязі з мілымі іх сэрцу далягляда мі.

— Не капіраваць зробленае іншымі, а распрацоўваць сваё, рудабельскае, — так вызначыў крэда калектыву мой суразмоўца Леанід Захараў, дырэктар камунальнага жыллёвага ўнітарнага прадпрыемства «Акцябрскі». Тым ён акрэсліў тэму нашай з ім мініэкскурсіі па вуліцах гарадскога пасёлка.

Гэты раённы цэнтр — адзін з самых маленькіх у Беларусі, таму сем тысяч жыхароў Акцябрскага ведаюць асаблівасці і гарадскога, і вясковага ладу жыцця. Разам з тым, спадчынны «рудабельскі характар» пакідае свой адбітак нават там, дзе ўсё, здаецца, можна вырашыць па агульных мерках сённяшняга дня.

— Вось, напрыклад, вакол гэтай старой сажалкі, — паказвае мой суразмоўца на лугавіну каля галоўнай вуліцы райцэнтра, — добраўпарадкаванне вядзецца незвычайна. Дзесьці, магчыма, яе засыпалі б ды заасфальтавалі (маўляў, меней будзе потым клопатаў), а мы вырашылі захаваць. Чуеце, на ўтравелым беразе вераб'і цвіркаюць, з вады ім падпрыгваюць жабкі — гэта ж сапраўдны музейны куточак Палесся. Лугавіна выкашана, як гарадскі газон, а сама сажалачка засталася некранутым прыродным экспанатам. Нашы майстры ўпрыгожылі яе драўлянымі busламі і расфарбаванай лаўкай з фігурай рыбака (усё выканалі выключна з адходаў вытворчасці).

Акцябрскі — прыгожы пасёлак. Летам ён выглядае яшчэ прыгажэй, бо на вуліцах радуюць вока карагоды кветак. Ружы, цюльпаны, лілеі — таксама штодзённы клопат жылкамунгаса. Частку саджанцаў вырасцілі самі, а нешта рэдкае набылі.

Пра больш важныя справы тут распавядаюць з той жа прыемнасцю, як і пра кветкі. Зразумела, бо калі працуюць сапраўдныя майстры, вынік радуе ўсіх. Напрыклад, вельмі дарэчы прыйшлася ў раёне прадукцыя адкрытага нядаўна цэха дрэваапрацоўкі. Узялі пазыку для стварэння новых працоўных месцаў, дадалі свае сродкі, набылі айчыннае абсталяванне — запрацавала вытворчасць, паменшала праблем з абслугоўваннем жыллёвага фонду райцэнтра і інжынерных сетак у вёсках (а іх вакол амаль шэсць дзясяткаў!). Важна ўзгадаць яшчэ і пра дарогі: для іх догляду і рамонту ў жылкамгаса ёсць неабходнае абсталяванне.

Наступны прыклад, быццам зусім не значны для эканомікі раёна. І ўсё ж, за ім бачна, што нават самае непрыкметнае (але патрэбнае людзям) не застаецца тут па-за ўвагай. Колькі такіх пасёлкаў і нават гарадоў запомніліся нам усім адсутнасцю там дарожных паказальнікаў. Блукай — шукай, вясковец, дзе ў тым райцэнтры патрэбная табе ўстанова! Майстры жылкамунгаса вырашылі пытанне проста: на бачным месцы паставілі слуп, прымацавалі стрэлкі з надпісамі, а над усім пасадзілі мудрую дарадчыцу саву.

Так што, будзеце ехаць міма — завітайце у Акцябрск, палюбуйцеся. Тым больш, што днямі да партрэта пасёлка дадалася яшчэ адна прыгожая рысачка. Жылкамунгасаўцы прыдумалі, вырабілі і ўсталявалі ў цэнтры арыгінальны памятны знак родным мясцінам: на дрэве гарэзліва скачуць вавёркі. Зусім такія, як на гербе старажытнай Рудабелкі.

Яўген ПЯСЕЦКІ. Фота аўтара.

На фотаздымках чытач убачыць усё, пра што вышэй ішла размова. Дадаць трэба толькі імёны працаўнікоў жылкамунгаса. Каля прыгожай сажалкі працавалі работніцы Святлана Лубкова, Таццяна Котава, Святлана Гошка. Каля паказальніка быў прадстаўнік самых зацікаўленых у ім людзей — вадзіцель Сяргей Івашын. Драўляных вавёрак на фірмовым рудабельскім знаку прымацоўвалі начальнік цэха дрэваапрацоўкі Святаслаў Аслюк і рабочы Герман Бусел.

1 ЖНІЎНЯ — МАКРЫДА

З той нагоды, што сялянам у жніўні шмат увагі неабходна было надаваць нарыхтоўкам на зіму, яны вельмі пільна сачылі за надвор'ем: «На Макрыды, калі дождж, сеў азімых будзе добры», «Калі ў гэты дзень дождж, арэхаў не будзе», «Ляціць пух з асіны — ідзі за падасінавікамі».

● У гэты час ужо знікалі авадні: «Авадзень на Макрыду джаліць апошні раз». Прыкмячалі: калі шмат аваднёў, будзе шмат агуркоў.

● На Беларусі ў народзе верылі, што на Макрыду нельга палоць грады, інакш гародніна вымакне і згніе.

● «Як не будзе на Макрэні дажджу, то не будзе бульба гнісці ў зямлі» — вялікую ўвагу ў гэты дзень надавалі бульбе.

● Бульба адносна нядаўна з'явілася на тэрыторыі жыхарства ўсходніх славянаў, прыкладна ў XVIII стагоддзі. Доўгі час яна лічылася «чужой», «д'ябальскай» раслінай. У стараверскіх тэкстах бульбу, чай і табак называлі «анціхрыставымі» раслінамі. І толькі ў XIX стагоддзі бульбу сталі ўжываць у ежу, спазнаўшы яе смакавыя і нават лекавыя якасці. З тых часоў бульба ва ўсходніх славянаў стала «другім» хлебам: «Бульба хлебу дапамога», «Людзі на бульбе і капусце жывуць».

● У нашых продкаў калісьці быў такі звычай: пасля заканчэння першага дня збірання бульбы на полі раскладвалі вогнішча і пяклі бульбу новага ўраджаю. Лічылася, калі пагрэць рукі аб гарачую бульбіну, яны не будуць мерзнуць узімку.

● У некаторых рэгіёнах пры заканчэнні збору бульбы пяклі бульбяныя бліны з морквай. На Палессі ў гэты дзень да святочнага стала абавязкова рэзалі пеўня.

● Паўсюдна было прынята крыху бульбы пакідаць на полі — каб задобрыць «бульбянага бога» — «анчутку-бульбяніка».

● У народзе існавала строгае правіла: пачынаць капаць і есці бульбу неабходна ў той дзень тыдня, на які прыпала ў гэтым годзе Дабравешчанне.

● Акрамя гэтага, дапушчальным днём для пачатку капання бульбы лічылася субота — дзень ушанавання продкаў.

● Засыпаць бульбу ў склеп на доўгачасовае захоўванне раілі ў той дзень, калі памерлі бацька ці маці: «каб яны спрыялі з таго свету».

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	5.21	21.10	15.49
Віцебск —	5.05	21.05	16.00
Магілёў —	5.11	21.00	15.49
Гомель —	5.15	20.50	15.35
Гродна —	5.38	21.24	15.46
Брэст —	5.45	21.18	15.33

Месяц

Апошняя квадра 3 жніўня. Месяц у сузор'і Авена.

Імяніны

Пр. *Емяльяна, Івана.*

К. *Алены, Ігната, Любаміра, Рамана.*

Фота Сяргея АЛЯКСАНДРАВА.

ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

КУЛІНАРНЫ НАТАТНІК

Галоўны герой — вішня

Сезон вішні доўжыцца зусім нядоўга — так што не прапусціце моманту, калі можна не проста нацешыцца падбадзёрлівым кіслым смакам свежай ягады, але і атрымаць максімум карысці: вішні паляпшаюць страваванне і аказваюць агульнаўмацавальнае дзеянне.

Яны ўтрымліваюць вялікую колькасць арганічных кіслот, карацін, вітамін С, фоліевую кіслату, а чырвоны пігмент вішні працуе як антыаксідант, узмацняе імунітэт і зніжае рызыку сардэчных захворванняў. Усяго 35 вішань палягчаюць боль эфектыўней за аспірын: усё дзякуючы антацыанам, якія знішчаюць ферменты, што выклікаюць запаленчыя працэсы. А яшчэ вішня ўтрымлівае перылавы спірт, які перашкаджае развіццю раку грудзей.

Калі кіслая мякаць свежых ягад вам не даспадобы, смела дадавайце вішню ў любімыя ёгурты, выкарыстайце яе ў якасці начынкі для кандытарскіх вырабаў і выпечкі, дадавайце ва ўзвары, кансервуйце, рыхтуйце джэмы і варэнне.

Вішнёвы сок дапамагае вачам заставацца зоркімі, а зубам — моцнымі. Захоўвае добрую памяць і светлую галаву. За кошт жалеза і магнію падтрымлівае нармальны ўзровень гемаглабіну, пазбаўляе ад мышачных боляў. Вішнёвы сок рэкамендуецца ўжываць пры інфекцыях мочавыдзяляльных шляхоў. Ён стымулюе апетыт і валодае адхарквальнымі ўласцівасцямі.

ШАРЛОТКА З ВІШНЯЙ

Інгрэдыенты: *Мука пшанічная — 1 шкл., цукар — 1 шкл., разрыхляльнік, яйкі курыныя — 3 шт., вішня (аддзяліць ад костачак) — 2 шкл., тварог (нятлусты) — 0,5 шкл., сухары паніровачныя — 1 ст. лыжка.*

Вішню прамыць, выдаліць костачкі, імкнучыся захаваць ягады цэлымі. Замясіць цеста: узбіць яйкі з цукрам, умяшаць тварог, паступова ўсыпаць муку з разрыхляльнікам, працягваючы вымешваць цеста, якое павінна атрымацца аднастайным і досыць вадкім.

Глыбокую форму для выпечкі змазаць алеем, пасыпаць дно сухарамі, пасля выкласці вішні, заліць цестам і паставіць у разагрэтую духоўку. Каб з ягад не выцякаў сок, можна перад выпечкай крыху абваляць іх у крухмале. Калі цеста паднімецца і зарумяніцца, праверыць гатоўнасць драўлянай зубачысткай. Дастаць з духоўкі, астудзіць і падаваць з шарыкам малінавага або вішнёвага марозіва.

САЛОН ПРЫГАЖОСЦІ

Даглядаем ногі

Летам на долю нашых ножак выпадае шмат выпрабаванняў, а так хочацца, каб яны выглядалі дагледжанымі і прыгожымі. І ў гэтым ім трэба дапамагчы. Зрабіць гэта можна ў хатніх умовах з выкарыстаннем народных сродкаў і рэцэптаў.

ЗМЯКЧАЕМ АГРУБЕЛУЮ СКУРУ

● Для падрыхтоўкі змякчальнай ванначкі вам спатрэбіцца 3-4 сталовыя лыжкі белай гліны, якая выдатна размякчае натоптышы і змякчае скуру ног. Высыпце гліну ў тазік з гарачай вадой. Трымайце ногі ў вадзе на працягу 15-20 хвілін, затым апаласніце цёплай вадой.

● Выдатна змякчаюць скуру ног цёплыя малочныя ванначкі. Праз 10-15 хвілін пасля пачатку працэдуры трэба выняць ногі і прамакнуць іх ручніком, затым працерці ступні лустачкай свежай лімоннай цэдры, і яны стануць гладкімі і далікатнымі, як у немаўляці.

● Зварыце 2 невялікія бульбачкі і яшчэ цёплыя разамніце відэльцам, дадайце малака. Атрыманую пасту нанясіце на ступні і абмацайце іх поліэтыленавай плёнкай, зверху надзеньце шкарпэткі. Праз 20-30 хвілін прамыйце ногі цёплай вадой. Таксама для змякчэння можна зрабіць пасту з аўсяных шматкоў з малаком.

ЛЕЧЫМ ТРЭШЧЫНЫ

● Нарэжце 1 невялікі яблык кубікамі, адварыце яго ў невялікай колькасці малака да ўтварэння кашкі. Накладзіце малочна-яблычную масу тоўстым пластом на вобласць расколін і абмацайце складзенай у некалькі столак марляй. Трымайце на працягу 30-40 хвілін, затым асцярожна змыйце цёплай вадой.

● Для падрыхтоўкі лекавай ванначкі для ног вам спатрэбіцца 5 сталовых лыжак сумесі сушаных зёлак — мяты, рамонку і бярозавага ліста. Заліць інгрэдыенты 2-3 літрамі кіпеню і настойваць на працягу гадзіны. Раствор працадзіць. Пры неабходнасці развесці вадой і рабіць нажную ванначку.

УМЕЛЫЯ РУЧКІ

Лак для пазногцяў спатрэбіцца ў гаспадарцы

Лак для пазногцяў выратуе не толькі ў тым выпадку, калі трэба злавіць «стрэлку» на выпадкова зачэпленых калготках...

● Не губляйце гузікі. Калі няма часу перашыць гузік, які вось-вось адарвецца, скарыстайцеся бясколерным лакам, капнуўшы яго ў цэнтр гузіка на ніткі.

● Абараніце ванну ад іржы. Каб балоны з лакам для валасоў або пенай для галення ад доўгага знаходжання ў вільготным памяшканні не пакідалі плямаў іржы на ванне або ракавіне — пакрыйце дно кожнага балона пластом бясколернага лаку.

● Бясколерным лакам пры неабходнасці можна карыстацца як канцылярскім клеем.

● Рознакаляровым лакам можна маркіраваць ключы. Для хуткага знаходжання патрэбнага ключа ў вялікім звязку пазначце ключ ад кватэры чырвоным, ключ ад дачы — руковым, ад офіса — карычневым лакам і г. д.

● Выдаліце драпіны на натуральнай скуры. З драпінай або невялікім «задзіркам» на абутку з тонкай скуры можна лёгка справіцца, нанёсшы на пашкоджанае месца і тыльны бок «задзірака» тонкі пласт лаку для пазногцяў і прыціснуўшы здзёрты кавалачак скуры да пашкоджанага месца.

НА ЗАМЕТКУ

Якім пахам дзе месца?

Вітальня. Водары ігліцы і лімона акунуць у хатнюю атмасферу.

Ванны пакой. Для прыняцця вячэрніх ваннаў падыдуць заспакаяльныя алеі — язмін, лаванда, сандал. Па раніцах — падбадзёрлівыя: базілік, бергамот, шалфей.

Кухня. Сумесь водараў іланг-ілангу, пачулі і размарыну падорыць выдатны апетыт.

Гасцёўня. Алей сандала, ігліцы, ванілі ўзнімае настрой, схіляе да стасункаў.

Дзіцячы пакой. Водар лаванды або мялісы супакоіць дзіця. Эўкаліпт і кіпарыс палегчаць цячэнне прастудных захворванняў.

Кабінет. Размарын, чабор, мята, карыца дапамогуць сканцэнтравацца на працы.

Спальня. Лаванда, аніс і мята — пахі, якія пазбаўляюць ад бяссонніцы.

-2674-

-2675-

Усміхнемся!

— Прывітанне, кім працуеш?

— Электрыкам.

— І колькі атрымліваеш?

— А, ну гэта гледзячы які грунт...

☺

Яшчэ ў пясочніцы ён махаў шуфлікам, адбіраў у іншых дзетак машынкі і выпрошваў цукеркі... А калі вырас — стаў даішнікам.

☺

— Таварыш міліцыянер, хачу зрабіць заяву — у мяне жонка знікла!

— Якая?

— Ну такая... З перламутравымі грузікамі...

☺

— Я па кефір хадзіў. Узяў чатыры бутэлькі.

— А кефіру колькі?

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03.

http://www.zviazda.by;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значкам, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.

Тыраж 33.310. Індэкс 63850. Зак. № 3705. Нумар падпісаны ў 19.30.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12